Хроніка парушэньняў правоў чалавека
ў Віцебскім рэгіёне

# ШЭРАЯ КНІГА

**Верасень 2018 - Жнівень 2019**



Віцебск, 2019

*У Віцебскай вобласьці, як і ва ўсёй Беларусі, парушаюцца грамадзянскія і палітычныя правы. Прычым гэтыя парушэньні тыповыя і маюць уласьцівасьць паўтарацца як у прасторы, гэтак і ў часе. Для пераадоленьня гэтых праблем у галіне правоў чалавека уладам, у тым ліку і рэгіянальным, неабходна прыслухацца да рэкамендацыяў Камітэту па правох чалавека ААН, якія пададзеныя ніжэй.*

**Свабода выказваньня меркаваньняў**

Камітэт выказвае занепакоенасьць з нагоды законаў і практыкі, якія, як выглядае, не адпавядаюць прынцыпам прававой дакладнасьці, неабходнасьці і сувымернасьці, як таго патрабуе Пакт, і якія істотна абмяжоўваюць свабоду меркаваньняў і іх выказваньня, у тым ліку з нагоды:

a) абмежаваньняў на выказваньне меркаваньняў у інтэрнэце, зьвязаных, прыкладам, з прынятымі ў чэрвені 2018 году папраўкамі да Закону «Аб сродках масавай інфармацыі», якія распаўсюджваюць дзяржаўны кантроль на электронныя сродкі масавай інфармацыі і ўводзяць, у прыватнасьці, патрабаваньне рэгістрацыі ў якасьці афіцыйнага электроннага сродку масавай інфармацыі і абавязак інфармацыйных парталаў ладзіць абавязковую ідэнтыфікацыю наведвальнікаў вэб-сайтаў;

b) наяўных у органаў выканаўчай улады паўнамоцтваў закрываць сродкі масавай інфармацыі і распаўсюджанай практыкі выносіць сродкам масавай інфармацыі папярэджаньня, якія аказваюць нэгатыўны ўплыў на свабоду выказваньня меркаваньняў;

c) шырокай фармулёўкі артыкулу 38 Закону «Аб сродках масавай інфармацыі», у якой вызначаецца забароненая для распаўсюду ў СМІ інфармацыя, у прыватнасьці інфармацыя, атрыманая ад незарэгістраваных арганізацыяў, і інфармацыя, «распаўсюд якой здатны прычыніць шкоду нацыянальным інтарэсам»;

d) законаў, якія забараняюць публікаваць інфармацыю, якая прычыняе шкоду гонару і годнасьці высокапастаўленых службовых асоб, у тым ліку з нагоды крымінальнай адказнасьці за паклёп у дачыненьні да прэзыдэнта Беларусі (артыкул 367 Крымінальнага кодэксу) і паклёп на Беларусь, або якія прадугледжваюць адказнасьць за наўмыснае прадстаўленьне замежнай дзяржаве, замежнай або міжнароднай арганізацыі фальшывай інфармацыі пра палітычнае, эканамічнае, сацыяльнае, ваеннае ці міжнароднае становішча Беларусі або прававое становішча грамадзян Беларусі, што прычыняе шкоду прэстыжу Беларусі ці яе уладаў;

e) паведамленьняў пра ціск і перасьлед журналістаў, якія працуюць на неакрэдытаваныя замежныя інфармацыйныя агенцтвы;

f) адвольных забаронаў на паездкі, якім праваабаронцы, адвакаты і журналісты, як паведамляецца, падвяргаюцца ў сувязі са сваёй дзейнасьцю (артыкулы 12, 17 і 19).

Дзяржаве-ўдзельніцы трэба зрабіць усе неабходныя захады, каб гарантаваць кожнаму поўную рэалізацыю права на свабоду выказваньня меркаваньняў, у тым ліку:

a) скасаваць ці перагледзець згаданыя вышэй законы, каб прывесьці іх у адпаведнасьць са сваімі забавязаньнямі што да Пакту, улічваючы пры гэтым заўвагу агульнага парадку Камітэтау № 34 (2011) аб свабодзе меркаваньняў і іх выказваньня;

b) разгледзець магчымасьць адмены крымінальнай адказнасьці за паклёп, і ў кожным разе ўжываць крымінальнае заканадаўства толькі ў найбольш сур'ёзных справах, памятаючы пра тое, што, як гаворыцца ў заўвазе агульнага парадку № 34 (2011) аб свабодзе меркаваньняў і іх выказваньні, пазбаўленьне волі ні ў якім разе не зьяўляецца належнай мерай пакараньня за паклёп;

c) скасаваць усе іншыя неапраўданыя абмежаваньні на ажыцьцяўленьне свабоды выказваньня меркаваньняў і забясьпечыць, каб патрэба ў накладаньні якіх-небудзь абмежаваньняў і суразьмернасьць мераў рэагаваньня вызначаліся ў адпаведнасьці са строгімі патрабаваньнямі пункту 3 артыкулу 19 Пакту.

**Свабода мірных сходаў**

Камітэт занепакоены тым, што дзяржава-ўдзельніца рэглямэнтуе мірныя сходы такім спосабам, што гэта перашкаджае рэалізацыі гэтага права. Камітэт асабліва занепакоены наступнымі неапраўданымі перашкодамі:

a) агульным патрабаваньнем атрыманьня дазволу на правядзеньне любых акцыяў пратэсту; жорсткімі ўмовамі выдачы дазволаў, у тым ліку абавязкамі прытрымлівацца грамадзкага парадку і нормаў бясьпекі, а таксама палажэньнем аб забесьпячэньні мэдычнай дапамогі і прыбіраньня ў месцах правядзеньня мерапрыемстваў; абмежаваньнямі на правядзеньне сходаў, у прыватнасьці патрабаваньнямі ладзіць іх выключна ў дазволеных месцах, абмежаваньнямі па колькасьці ўдзельнікаў (колькасьць удзельнікаў мерапрыемстваў, якія арганізуюцца фізычнымі асобамі, павінна быць менш за 1 000 чалавек) і забаронай стыхійных сходаў. Адзначаючы, што папраўкі, унесеныя у 2018 годзе ў Закон «Аб масавых мерапрыемствах», вызначаюць паведамляльны парадак правядзеньня сходаў, Камітэт па-ранейшаму занепакоены тым, што паведамляльны парадак тычыцца толькі сходаў, што ладзяцца ў адмыслова адведзеных уладамі пастаянных месцах, якія знаходзяцца, як сьцьвярджаецца, удалечыні ад цэнтру гораду;

b) стварэньнем перашкод для свабоднага правядзеньня штогадовых масавых мітынгаў з нагоды Дня Волі ў сакавіку і Дня памяці аб чарнобыльскай катастрофе ў красавіку;

c) вынясеньнем несувымерных крымінальных і адміністрацыйных пакараньняў арганізатарам, агітатарам і ўдзельнікам масавых мерапрыемстваў, у тым ліку: i) затрыманьнем і прызначэньнем крымінальнага пакараньня Зьмітру Паліенку ў 2016 годзе за ўдзел у мірным пратэсьце супраць абмежаваньня правоў раварыстаў 29 красавіка 2016 году, які, як сьцьвярджаецца, падвяргаўся жорсткаму абыходжаньню і адзіночнаму зьняволеньню; ii) празьмерным ужываньнем сілы міліцыяй, масавымі арыштамі, затрыманьнямі і пакараньнямі за адміністрацыйныя правапарушэньні, ахвярамі якіх сталі ўдзельнікі мерапрыемстваў з нагоды Дня Волі 25 сакавіка 2017 года, калі супрацоўнікі міліцыі, як сьцьвярджаецца, затрымалі ня менш за 700 чалавек, у тым ліку каля 100 журналістаў і 60 актывістаў-праваабаронцаў, прычым, згодна з паведамленьнямі, сама меней 177 дэманстрантаў былі прызнаныя вінаватымі паводле артыкулаў Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях ў выніку працэсаў, якія праходзілі з парушэньнем гарантыяў справядлівага судовага разбору.

Камітэт выказвае шкадаваньне з нагоды таго, што абмежаваньні, уведзеныя ў дачыненьні да сходаў і мітынгаў, выкарыстоўваюцца для таго, каб пазбавіць палітычную апазыцыю магчымасьці канструктыўна ўдзельнічаць у грамадзкім жыцьці і ўплываць на грамадзкую думку (артыкулы 7, 9, 10, 14, 19, 21 і 25).

Дзяржаве-ўдзельніцы трэба перагледзець свае законы, падзаконныя акты і практыку, у тым ліку Закон «Аб масавых мерапрыемствах», каб гарантаваць магчымасьць карыстаньня ў поўнай меры правам на свабоду сходаў як у заканадаўстве, так і на практыцы, і забясьпечыць, каб любыя абмежаваньні на свабоду сходаў, у тым ліку праз ужываньне адміністрацыйных і крымінальных пакараньняў да асоб, якія рэалізуюць гэтае права, адпавядалі строгім патрабаваньням артыкулу 21 Пакту. Дзяржаве-ўдзельніцы трэба неадкладным і дзейсным чынам расьсьледаваць ўсе выпадкі празьмернага ўжываньня сілы супрацоўнікамі праваахоўных органаў, адвольных арыштаў і затрыманьняў удзельнікаў мірных пратэстаў і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых.

**Свабода асацыяцыі**

Занепакоенасьць Камітэту працягваюць выклікаць неапраўданыя абмежаваньні права на свабоду асацыяцыі. Адзначаючы пляны па ўнясеньні паправак у законы «Аб грамадзкіх аб’яднаньнях» і «Аб палітычных партыях» у мэтах спрашчэньня працэдуры рэгістрацыі няўрадавых арганізацый (НДА), Камітэт занепакоены абмежавальным характарам і несувымернасьцю правілаў рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў і палітычных партыяў, у прыватнасьці патрабаваньнямі мець параўнальна вялікую колькасьць чальцоў і шырокае геаграфічнае прадстаўніцтва, высокімі зборамі за рэгістрацыю некамэрцыйных арганізацыяў і абмежаваньнямі на выкарыстаньне ў якасьці афіцыйных адрасоў жылых памяшканьняў, што не дазваляе шмат якім асацыяцыям, у тым ліку большасьці праваабарончых НДА, выканаць рэгістрацыйныя патрабаваньні. Камітэт занепакоены таксама магчымасьцю прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці на падставе артыкулу 193-1 Крымінальнага кодэксу за арганізацыю дзейнасьці або ўдзел у дзейнасьці незарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў, і, адзначаючы пляны скасаваць гэты артыкул і прадугледзець замест яго адміністрацыйную адказнасьць на рашэньне несудовай інстанцыі, Камітэт, тым не менш, выказвае сумневы ў неабходнасьці і сувымернасьці такой меры.

Камітэт таксама занепакоены:

a) адмовай у рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў, такіх як Гендэрная партнэрства і гендэрны цэнтар «Ружа» (з прычыны таго, што іх статутнай мэтай ёсьць барацьба з гендэрнай дыскрымінацыяй), а таксама праваабарончых цэнтраў «Вясна» і «Лямбда»;

b) неаднаразовымі выпадкамі адмовы ў рэгістрацыі новых палітычных партыяў, ніводная зь якіх не была зарэгістраваная з 2000 году;

c) жорсткім рэгуляваньнем замежнага фінансаваньня (прэзыдэнцкі дэкрэт № 5 ад 31 жніўня 2015 году), якое абмяжоўвае мэты, у якіх можа быць выкарыстанае такое фінансаваньне, і забараняе яго выкарыстаньне, у прыватнасьці для «арганізацыі або правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў, дэманстрацыяў,

пікетаваньня або страйкаў»; і вызначае крымінальную адказнасьць за атрыманьне замежнага фінансаваньня ў парушэньне закону (артыкул 369-2 Крымінальнага кодэксу);

d) перашкодамі для рэгістрацыі прафсаюзаў; ужываньнем Закону «Аб масавых мерапрыемствах» у дачыненьні да прафсаюзаў; абмежаваньнем права на страйк; умяшаньнем у дзейнасьць прафсаюзаў, у тым ліку дыскрымінацыйным выкарыстаньнем тэрміновых кантрактаў у выпадках, калі вядзецца пра прафсаюзных актывістаў; канкрэтнымі праблемамі, якія паўстаюць у сувязі з калектыўнымі перамовамі (артыкулы 19, 22 і 25).

Дзяржаве-ўдзельніцы трэба перагледзець адпаведныя законы, падзаконныя акты і практыку, каб прывесьці іх у поўную адпаведнасьць з палажэньнямі артыкулаў 22 і 25 Пакту, у тым ліку праз:

a) спрашчэньне правілаў рэгістрацыі, каб грамадзкія аб'яднаньні і палітычныя партыі маглі рэальна карыстацца сваім правам на асацыяцыю;

b) скасаваньне артыкулу 193-1 Крымінальнага кодэксу з магчымым адмовай ад яго замены адміністрацыйнай адказнасьцю;

c) забесьпячэньне таго, каб правілы, якія рэгулююць фінансаваньне грамадзкіх аб'яднаньняў з-за мяжы, не прыводзілі на практыцы да неапраўданага кантролю або абмежаваньня іх магчымасьцяў уплываць на грамадзкую думку і ажыцьцяўляць рэальную дзейнасьць, у тым ліку шляхам перагляду пераліку відаў дзейнасьці, для якой можа выкарыстоўвацца замежнае фінансаваньне;

d) ліквідацыю перашкодаў для рэгістрацыі і дзейнасьці прафэсійных саюзаў, адмену неапраўданых абмежаваньняў права на страйк, расьсьледаваньне ўсіх паведамленьняў аб умяшаньні ў дзейнасьць прафсаюзаў і рэпрэсіях супраць прафсаюзных актывістаў, а таксама перагляд працэдураў, якія рэгулююць калектыўныя перамовы з мэтай забесьпячэньня выкананьня палажэньняў Пакту.

## Факты парушэньняў грамадзянскіх і палітычных правоў

**27.09.2018** Вядомага ў Віцебску **доктара-праўдаруба Ігара Пастнова** і ягонага паплечніка **Рафаэля Кірылава-Шмільхольдхарда** гвалтам адправілі на псыхіятрычную экспэртызу ў Навінкі – пад канвоем і ў кайданках. Як распавялі сьведкі, іх забралі ранкам з будынку УСК па Віцебскай вобласьці, куды напярэдадні выклікалі позвай.

У жніўні 2018 году УСК па Віцебскай вобласьці распачаў у дачыненьні Ігара Пастнова і Рафаэля Кірылава-Шмільхольдхарда крымінальную справу паводле ч. 2 арт. 188 КК РБ (паклёп). Віцяблян падазраюць у паклёпе на пракурора Віцебску Юрыя Раманоўскага.

26 верасьня яны атрымалі позву з патрабаваньнем зьявіцца а 7-й раніцы ў сьледчы камітэт “для правядзеньня сьледчых ды іншых працэсуальных дзеяньняў”. Разам з падазраванымі на сустрэчу ў СК пайшла іх агульная сяброўка Сьвятлана Кахаоўская. Яна і стала сьведкам затрыманьня.

Паводле яе слоў, да 9-й раніцы нічога наогул не адбывалася, ніякія сьледчыя дзеяньні не праводзіліся. Пастноў і Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард напісалі скаргу, пазванілі ў Галоўнае ўпраўленьне СК у Менску і службу ўласнай бясьпекі.

“Недзе а 9-й гадзіне прыехаў канвой. На Кірылава і Пастнова надзелі кайданкі, зьбілі іх з ног і волакам пацягнулі ў канвойную машыну. Пастнову зрабілася кепска, ён пачырванеў, стаў задыхацца і цалкам магчыма, што страціў прытомнасьць. Зацягнулі ў машыну, зачынілі дзьверы і паехалі ў Менск”, – расказала Сьвятлана.

Кажа, што на патрабаваньне выклікаць урача, пачула такі адказ: “Ніякага вам урача ня будзе, зараз яго ў псыхушку пакладуць, там яго і вылечаць”.

Тэлефонная сувязь з віцяблянамі адразу ж была перапыненая.

Пасьля абеду Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард патэлефанаваў зь Менску сваёй паплечніцы **Надзеі Куканос** і паведаміў, што іх адпусьцілі.

“Ён расказаў, што экспэртызу ў Навінках праводзіць адмовіліся. Дактары патлумачылі сьледчай Руткоўскай, што прымусовая дастаўка выключае правядзеньне якой-кольвечы экспэртызы. Сьледчая пачала крычаць на дактароў, і яе выгналі з габінэту. Тая села ў машыну і зьехала, кінуўшы ў Менску без грошай Пастнова і Кірылава-Шмільхольдхарда”, – расказала Куканос.

Паводле яе слоў, сьледчая Руткоўская разам з канвоем вярнулася толькі пасьля таго, як віцябляне патэлефанавалі ў службу ўласнай бясьпекі СК РБ. Але ў машыну забралі толькі Рафаэля Кірылава-Шмільхольдхарда. Паабяцалі, што за Пастновым прыедзе іншая. Ігар Пастноў сапраўды вярнуўся на іншым аўтамабілі і прыблізна а 18-й гадзіне быў у Віцебску. У верасьні 2017 году Ігара Пастнова ўжо дастаўлялі прымусова ў псыхіятрычную лякарню ў Навінках.



Ігар Пастноў

**01.10.2018** Жыхары Віцебску **Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард** і **Ігар Пастноў** накіравалі скаргі ў абласную пракуратуру на незаконныя дзеяньні сьледчай УСК па Віцебскай вобласьці Людмілы Руткоўскай, якая на падставе правядзеньня працэсуальных дзеяньняў 27 верасьня пад прымусам даставіла віцяблян у Рэспубліканскі цэнтар псыхіятрыі.

Віцябляне былі адпраўленыя ў Менск для праходжаньня псыхіятрычнай экспэртызы пад канвоем і ў кайданках. Аднак галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтру псыхіятрыі ў Навінках адмовіўся праводзіць экспэртызу. Сьледчая Руткоўская разам з канвоем зьехала, пакінуўшы мужчын у Менску бяз грошай і тэлефонаў.

У сваёй скарзе на імя пракурора Віцебскай вобласьці Вадзіма Сушчынскага Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард патрабуе правесьці службовую праверку законнасьці і абгрунтаванасьці дзеяньняў сьледчай СУ УСК па Віцебскай вобласьці Людмілы Руткоўскай, абавязаць сьледчую вярнуць мабільны тэлефон, а таксама правесьці праверку на прадмет наўмыснага адключэньня камэр відэаназіраньня ў будынку абласнога УСК.

Як піша, у дачыненьні да яго і Пастнова сьледчая незаконна прымяніла меры працэсуальнага прымусу (канвой) з выкарыстаньнем фізычнай сілы з боку міліцыі.

“У прысутнасьці сьведак супрацоўнікі міліцыі павалілі Пастнова на падлогу і пачалі штурхаць нагамі. Ад болю і сардэчнага прыступу Пастноў страціў прытомнасьць. Мае патрабаваньні выклікаць хуткую дапамогу былі праігнараваныя. Абмяклае цела Пастнова цягнулі калідорамі ў машыну”, – сьцьвярджае заяўнік.

Кажа, што ўсе гэтыя дзеяньні ён здымаў на тэлефон. Менавіта таму пазьней сьледчая яго і забрала (“Руткоўская адкрыта скрала нашыя тэлефоны”). Запэўнівае, што відэаназіраньне ў будынку УСК было сапраўды адключанае.

Кірылаў-Шмільхольдхард піша ў скарзе, што перад тым як Руткоўская сілай высадзіла яго з машыны на плошчы чыгуначнага вакзалу ў Менску, яна званіла начальству, а потым сказала: “Як паведаміў мой непасрэдны начальнік, патрабаваньні Цэнтральнага апарату СК для мяне не зьяўляюцца законнымі. Пайшоў вон!..” Скаржнік сьцьвярджае, што пры гэтым супрацоўнікі міліцыі абражалі яго ў грубай і непрыстойнай форме. Нагрудныя відэарэгістратары ў міліцыянтаў з канвою таксама былі адключаныя.

Расказвае, што, апынуўшыся бяз грошай і тэлефону ў чужым горадзе, накіраваўся ў будынак Цэнтральнага апарату СК РБ, дзе зрабіў запіс у кнізе заўваг і прапаноў і перадаў дзяжурнаму сьледчаму заяву на імя старшыні з просьбай аказаць

садзейнічаньне ў вяртаньні ў Віцебск, але дапамогі не атрымаў.

Паводле словаў Кірылава-Шмільхольдхарда, пасьля гэтага ён некаторы час стаяў на ганку Адміністрацыі прэзыдэнта з аркушам паперы ў руках, на якім было напісана: "Падайце на зваротны шлях у Віцебск да сьледчай Руткоўскай". Кажа, што сабраў 15 рублёў, якіх хапіла, каб купіць квіток на маршрутку да Віцебску.

Ён таксама паведаміў, што на наступны дзень па прыбыцьці ў Віцебск напісаў заяву ў суд з просьбай прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці (бязьдзеяньне службовай асобы) начальніка Упраўленьня сьледчага камітэту Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласьці Уладзімера Шалухіна.

У сваю чаргу, віцебскі доктар-праўдаруб Ігар Пастноў выказвае меркаваньне, што гэта была чарговая спроба ягонага фізычнага зьнішчэньня. "Так адкрыта рэпрэсіўныя органы не працавалі нават у 1937-м", – кажа.

Пастноў таксама накіраваў скаргі ў адпаведныя органы.

У дачыненьні да Пастнова і Кірылава-Шмільхольдхарда раней была распачатая крымінальная справа паводле ч.2 арт. 188 КК РБ (Паклёп). Віцяблян падазраюць у паклёпе на пракурора Віцебска Юрыя Раманоўскага. Яны знаходзяцца ў статусе падазраваных.

**02.10.2018** Аддзел прымусовага выкананьня Першамайскага раёну Віцебску 18 верасьня распачаў выканаўчае справаводзтва ў дачыненьні віцябляніна **Міколы Качурца**, каб спагнаць зь яго адміністрацыйны штраф у памеры 24,50 рублёў на карысьць УУС Менскага аблвыканкаму. Копію пастановы аб распачынаньні выканаўчага справаводзтва Мікола Качурэц атрымаў толькі 2 кастрычніка.

Мікола кажа, што да гэтага дня ня ведаў ні пра штраф, ні пра тое, што супраць яго яшчэ два тыдні таму распачалі выканаўчае справаводзтва. Мяркуе, што 24,50 рублёў штрафу яму прысудзілі за ўдзел у Курапацкай вахце 6 ліпеня, калі на яго склалі пратакол супрацоўнікі ДАІ.

"Хутчэй за ўсё, гэта штраф за нібыта парушэньне дарожнага руху. Але выплачваць я яго не зьбіраюся і ня буду, бо нічога не парушаў", – гаворыць Мікола Качурэц.

У той жа дзень (2 кастрычніка) Качурэц атрымаў ліст з Бараўлянскага сельвыканкаму. Актывісту паведамілі, што ў дачыненьні да яго "паступіў матэрыял аб адміністрацыйным правапарушэньні, прадугледжаным арт. 15.24 КаАП РБ" (Парушэньне правіл выкарыстаньня зямель ляснога фонду). І ў сувязі з гэтым патрабавалі "ў абавязковым парадку" 1 кастрычніка зьявіцца ў сельвыканкам для дачы тлумачэньняў.

"Матэрыялы аб адміністрацыйным правапарушэньні" паводле гэтага артыкулу зьявіліся падчас той жа Курапацкай вахты 6 ліпеня, калі Качурэц разам са Зьмітром Дашкевічам ды іншымі актывістамі ўсталёўвалі ў Курапатах вялікія крыжы. Мікола ўзгадвае, што міліцыянты перапісвалі тады ягоныя асабістыя дадзеныя.

Натуральна, што ніякіх тлумачэньняў 1 кастрычніка ў Бараўлянах ён не даваў.




**02.10.2018** Савет вэтэранаў вайны і працы ААТ «Полацак-Шкловалакно» абвінавацiў **актывіста Свабоднага прафсаюзу** прадпрыемства **Віктара Стукава** ў перашкодзе дзейнасьці вэтэранскай арганізацыі. У выніку ўчастковы інспэктар склаў на яго два адміністрацыйныя пратаколы за дробнае хуліганства (артыкул 17.1 КаАП). Суд прызначаны на 16 кастрычніка.

Паводле вэтэранаў, якія зьвярнуліся з заявай ў міліцыю, Віктар Стукаў вінаваты ў зрыве працы іх суполкі. Актывіст жа сьцьвярджае, што ўся «перашкода» іх дзейнасьці зь яго боку палягала ў тым, што ён папрасіў у старшыні вэтэранскай арганізацыі Кнігу заўвагаў і прапановаў.

Адміністрацыйныя пратаколы на грамадзкага актывіста складзеныя за падзеі двух дзён, 26 і 27 верасьня.

Распавядае Віктар Стукаў: «Увечары 26 верасьня я завітаў у габінэт Савету вэтэранаў даведацца пра абавязкі арганізацыі ў дачыненьні да блізкага мне чалавека. Папрасіў Кнігу заўвагаў і прапановаў. Мне адмовілі. Я папярэдзіў адказную асобу вэтэранаў, што гэта парушэньне, але настойваць на атрыманьні кнігі ня стаў. Днём 27 верасьня мяне не пусьцілі ў габінэт Савету вэтэранаў, выштурхнуўшы за дзьверы са словамі: «Выйдзіце прэч, вы тут ніхто», і я папрасіў кнігу паўторна. Кнігу мне не далі, і я выклікаў міліцыю. Інспэктар РАУС Сяргей Мацкевіч правёў апытаньне прысутных і накіраваў матэрыялы ў дзяжурную частку РАУС для адпраўкі ў адміністрацыйную камісію райвыканкаму».

У адказ Савет вэтэранаў 29 верасьня даслаў у міліцыю заяву пра тое, што спадар Стукаў «...учыняў канфліктную і нэрвовую абстаноўку, чым перашкаджаў і замінаў працы Савету вэтэранаў...» Гэтая заява і стала падставай для пратаколаў, якія ўчастковы інспэктар Полацкага РАУС Міхаіл Перапечкін склаў 2 кастрычніка.

Згодна з пратаколамі, актывіст «наўмысна, з хуліганскіх памкненьняў, праявіўшы відавочную непавагу да грамадзтва, умяшаўся ў працу Першаснай арганізацыі вэтэранаў вайны і працы ААТ «Полацак-Шкловалакно»... гучна крычаў, перашкаджаў выконваць службовыя абавязкі, сарваў працу». Савет вэтэранаў заявіў, што яны не маглі дзьве гадзіны працаваць, хоць Віктар, паводле яго словаў, знаходзіўся ў габінэце вэтэранаў усяго хвілін пяць. Пры гэтым ані ў пратаколе, ані ў заяве вэтэранаў не пазначана, што Савет вэтэранаў ня даў Кнігу заўвагаў і прапаноў на патрабаваньне грамадзяніна.

Кажа прафсаюзны актывіст: «Калі я папрасіў Кнігу заўвагаў і прапановаў 26 верасьня, адна жанчына ў габінэце вэтэранаў мне сказала: «Вы нас так не палохайце». Мабыць, вэтэраны ўспрымаюць такую просьбу як скаргу, але ж у гэтую кнігу

можна запісаць і падзяку за добрую працу арганізацыі».

Дарэчы, Віктар Стукаў і сам мог бы прэтэндаваць на сяброўства ў суполцы вэтэранаў: грамадзкі актывіст прапрацаваў у ААТ «Полацак-Шкловалакно» 29 гадоў у шкодных умовах працы. Калісьці яго ледзь не прынялі ў вэтэранскую арганізацыю і нават ўзялі ў яго сяброўскія ўнёскі.

**05.10.2018** Полацкі райвыканкам апавясьціў Свабодны прафсаюз працоўных заводу «Шкловалакно» пра забарону масавага мерапрыемства. Праз пікет сябры прафсаюзу мелі намер інфармаваць грамадзян пра Сусьветны дзень дзеяньняў за годную працу 7 кастрычніка і заявіць патрабаваньне рабочых.

Заяўка Свабоднага прафсаюзу на пікет падавалася ў Полацкі райвыканкам. У заяўцы пазначалася, што ўдзельнікі імпрэзы выступяць з патрабаваньнем:

– адмяніць сыстэму кароткатэрміновых працоўных кантрактаў;

– ня ўносіць у Працоўны кодэкс нормы аб часовых працоўных кантрактах;

– спыніць дыскрымінацыю рабочых ААТ «Полацак-Шкловалакно» за ўдзел у Свабодным прафсаюзе Беларускім.

Ліст Полацкага райвыканкаму з адмовай работнікам праводзіць масавае мерапрыемства падпісаны намесьнікам старшыні па сацыяльных пытаньнях Пяткевіч Пятром Мяфодзьевічам. Тэкст ліста рыхтавала начальніца аддзелу ідэалягічнай работы і па справах моладзі Ганебная Натальля Ўладзімераўна.

Фармальнай прычынай адмовы названае тое, што заяўнікамі «ня выкананыя патрабаваньні пункту 3 Рашэньня Полацкага райвыканкаму ад 15.03.2013 году...» Гэтым пунктам мясцовыя ўлады абавязваюць арганізатараў масавага мерапрыемства, «калі арганізацыя масавага мерапрыемства адбываецца без удзелу органаў дзяржаўнай улады і кіраваньня», далучаць да заяўкі дамовы зь міліцыяй, мэдыкамі і камунальнікамі па абслугоўваньні імпрэзы.

У заяўцы на пікет Свабодны прафсаюз паведамляў пра свае забавязаньні па падтрыманьні парадку на пікеце, прыбіраньні тэрыторыі і аказаньні першай мэдычнай дапамогі ў выпадку неабходнасьці. «У паслугах ЖКГ, міліцыі і мэдыцыны ня маем патрэбы», – пазначана ў заяўцы.

Начальніца ідэалягічнага аддзелу прапануе рабочым заводу пацярпець да Новага году: маўляў, закон аб масавых мерапрыемствах зьменіцца, і можна будзе праводзіць пікет паводле заяўнага прынцыпу без узгадненьня зь мясцовымі ўладамі.

**09.10.2018** У межах Тыдня супраць сьмяротнага пакараньня, мерапрыемствы якога праходзяць ва ўсёй краіне, віцебскія актывісты праваабарончай супольнасьці меркавалі зладзіць імпрэзу. Аднак пікет, падчас якога праваабаронцы хацелі распавесьці месьцічам, чаму яны выступаюць за скасаваньне практыкі забойства грамадзян дзяржавай на падставе выракаў судоў, мясцовыя ўлады забаранілі.

«У сувязі з тым, што дамовы, прадугледжаныя пунктам 3 рашэньня Віцебскага гарадзкога выканаўчага камітэту ад 10 ліпеня 2009 году №881 "Аб масавых мерапрыемствах у горадзе Віцебску" Вамі не прадстаўленыя, забараняю правядзеньне масавага мерапрыемства – пікетаваньня 12 ліпеня 2018 году... у парку культуры і

адпачынку чыгуначнікаў у г. Віцебску», – патлумачыла намесьніца кіраўніка раённай адміністрацыі Алена Шарай, якая, апроч іншага, курыруе пытаньні ідэалёгіі.

Рашэньне гарвыканкаму, на якое спаслалася чыноўніца, дае магчымасьць віцебскім уладам цягам амаль ужо дзесяцігодзьдзя забараняць будзь-якія мірныя акцыі праваабаронцаў, грамадзкіх і палітычных актывістаў, што не супрацоўнічаюць з уладамі. Бо заключыць дамовы з мэдыкамі, камунальнікамі і мэдыкамі на абслугоўваньне мерапрыемстваў, якія яно вымагае, – задача практычна невыканальная. Нават у тых адзінкавых выпадках, калі дзяржаўныя службы, пералічаныя ў рашэньні, пагаджаюцца на заключэньне дамоваў, арганізатары самі адмаўляюцца ад правядзеньня імпрэзаў праз высокія кошты паслугаў, прапанаваных ім паводле гэтых дамоваў.

Дарэчы, пікет праваабаронцаў супраць сьмяротнага пакараньня мусіў адбыцца на пляцоўцы, адмыслова адведзенай рашэньнем №881 пад масавыя мерапрыемствы. Але ні гэты факт, ні тое, што ўжо нават Камітэт па правох чалавека ААН запатрабаваў ад беларускіх уладаў зьмяніць згаданае рашэньне Віцебскага гарвыканкаму, не пахіснуў чыноўнікаў адміністрацыі Чыгуначнага раёну.

«Пікет зноўку забаронены з фармальных прычынаў, – кажа **заяўнік забароненай акцыі Леанід Сьвецік**. – Такім чынам, улады выразна прадэманстравалі сваю пазыцыю што да ўжываньня сьмяротнай кары як выключнай меры пакараньня. Але ня толькі гэта. Яны ня хочуць, каб грамадзяне мелі магчымасьць публічна выказваць сваё стаўленьне да таго, што дзяржава расстрэльвае сваіх грамадзянаў».

**09.11.2018** На дзьверы офіса Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ) працадаўца ААТ «Полацак-Шкловалакно» павесіў свой замок. Доступ рабочых заводу да дакумэнтаў і абсталяваньня прафсаюзу цяпер перакрыты. Усе прапановы прафсаюзу аб працягваньні дамовы арэнды офіса адміністрацыя заводу адхіляе.

Яшчэ 24 жніўня галоўны інжынэр ААТ «Полацк-Шкловалакно», першы намесьнік дырэктара Раман Блізьнёў апавясьціў Свабодны прафсаюз Беларускі пра намер прадпрыемства не падаўжаць дамову і запатрабаваў вярнуць маёмасьць заводу ў дзень заканчэньня тэрміну дамовы, 31 кастрычніка.

Спадар Блізьнёў прыгразіў прафсаюзу судом: «Зьвяртаем Вашу ўвагу, што ў выпадку невяртаньня арандаванай маёмасьці ў вызначаны тэрмін ААТ «ПШВ» пакідае за сабой права на судовую абарону сваіх правоў», – сказана ў падпісаным ім лісьце.

У верасьні Свабодны прафсаюз працоўных заводу «Шкловалакно» зьвярнуўся да дырэктара Андрэя Бунакова з прапановай аб працягненьні дамовы наконт арэнды памяшканьня пад прафсаюзны офіс і правядзеньні перамоваў. Але завод ня стаў ані працягваць арэнду, ані весьці перамовы з рабочымі.

У кастрычніку СПБ яшчэ раз прапанаваў адміністрацыі прадпрыемства заключыць дамову арэнды іншага, пустога памяшканьня. І зноў атрымаў адмову. Раман Блізьнёў паведаміў, што ААТ «ПШВ» «лічыць немэтазгодным здачу ў арэнду названага памяшканьня СПБ у сувязі зь неаднаразовымі парушэньнямі умоваў раней заключаных дамоваў, а таксама ў сувязі з прынятым ААТ «ПШВ» рашэньнем аб адчужэньні будынка».




**Старшыня СПБ Мікола Шарах**: «Прафсаюз ня мае запазычанасьці па аплаце арэнды памяшканьня, і адмова дырэктара Бунакова ў арэндзе памяшканьня для прафсаюзу – гэта відавочная перашкода дзейнасьці арганізацыі працоўных. Рабочым заводу перакрылі доступ да патрэбных дакумэнтаў і абсталяваньня прафсаюзу. Мяркуем, такім спосабам істотна парушаюцца правы працоўных на аб'яднаньне ў прафсаюз і дзейнасьць арганізацыі. На жаль, дзяржаўныя органы, пакліканыя народам абараняць правы працоўных, ніяк не рэагуюць на скаргі прафсаюзу. Думаю, толькі масавы выхад рабочых на пратэставыя акцыі можа спыніць бязьмежжа, што зьдзяйсьняецца чыноўнікамі ўсіх дзяржаўных узроўняў».

**10.11.2018** У кватэры віцебскага **псыхіятра Ігара Пастнова** адбыўсяператрус. Пра гэта Пастноў паведаміў у сацсетках. Як піша, міліцыянты шукалі наркотыкі, парнаграфію, фальшывыя грошы і перапіску з амбасадамі і праваабарончымі арганізацыямі. А ў выніку – забралі лямпавы тэлевізар…

Як расказаў Ігар Пастноў, вобшук праводзілі супрацоўнікі Кастрычніцкага РАУС Віцебску ў межах расьсьледаваньня крымінальнай справы, якая была распачатая супраць яго 13 жніўня 2018 году за паклёп (ч.2 арт. 188 КК РБ) на пракурора гораду Віцебску Юрыя Раманоўскага. Справу вядзе сьледчая УСК па Віцебскай вобласьці Людміла Руткоўская.

Паводле словаў Ігара Пастнова,ператрус цягнуўся дзьве з паловай гадзіны – ад 17:30 до 20:00.

“Па завяршэньніператрусу міліцыянты нічога не змаглі зрабіць, як арыштаваць мой старэнькі лямпавы тэлевізар, які пазьней плянуюць прадаць, а атрыманыя з гэтага грошы перадаць маральна пакрыўджанаму пракурору Раманоўскаму”, – піша Пастноў.

Ігар Пастноў паведамляе, што гэта ўжо пятыператрус у ягонай кватэры цягам апошніх гадоў, і ён быў падрыхтаваны да яго.

За тыдзень даператрусу Ігар Пастноў паведамляў таксама, што ў дачыненьні яго хочуць распачаць яшчэ адну крымінальную справу. Гэтым разам – за абразу судзьдзі суду Чыгуначнага раёну Віцебску Цыганковай.

**10.12.2018** У Лепелі за сьпевы і распаўсюд хрысьціянскай літаратуры каля мясцовага рынку былі затрыманыя **баптысцкія вернікі** – сужэнцы **Андрэй** і **Тацяна Фокіны**. «Нас затрымалі як злачынцаў і даставілі ў пастарунак», – распавёў Forum 18 Андрэй Фокін.

Інцыдэнт адбыўся 27 кастрычніка. А 30 кастрычніка суд аштрафаваў за парушэньне закону аб масавых мерапрыемствах паводле часткі 3 артыкулу 23.34 КаАП Андрэя Фокіна на 661,5 рублёў, яго жонку – на 539 рублёў. Гэткі прыкладны памер сярэднямесячнага заробку ў Лепелі.

Паводле Андрэя Фокіна, міліцыю на іх выклікаў чыноўнік мясцовага райвыканкаму. Ён таксама адзначыў, што міліцыянты проста скапіявалі пратаколы, складзеныя ў дачыненьні да яго і ягонай сям'і за аналягічныя ўчынкі ў 2017 годзе. Вернік заяўляе, што іх судзілі як прадстаўнікоў рэлігійнай арганізацыі, хаця яны ёсьць проста сужэнцамі. На думку асуджанага, суд вынес загадзя падрыхтаваную пастанову.

Фокіны абскардзілі гэтае рашэньне ў Віцебскім абласным судзе, але 21 лістапада судзьдзя Сьвятлана Іванова прызнала рашэньне Лепельскага суду законным.

Андрэй Фокін таксама распавёў, што яны не плацілі 1035 рублёў штрафу, выпісаныя ім у 2017 годзе. Ня маюць яны і грошай на новыя штрафы. Пры гэтым з заробку Тацяны Фокінай былі прымусова ўтрыманыя сумы для аплаты леташняга штрафу. Улады таксама пагражаюць забраць у Андрэя Фокіна правы кіроўцы, пакуль ня будзе выплачаны штраф, і накласьці забарону на маёмасьць для пакрыцьця штрафаў.

Фокін сказаў, што падаў апэляцыю на дзеяньні судовага прystава ў Віцебскі абласны суд 10 сьнежня.

Пры гэтым ён распавёў, што ня мае намеру спыняць бібліятэчнае служэньне. «Калі нас выганяць з аднаго месца, мы знойдзем іншае і зьвернемся да ўсіх магчымых установаў, але мы ніколі не здадзімся», – заявіў вернік.

Фокін мяркуе, што новая хваля ціску можа быць зьвязаная са зьменай кіраўніка Лепельскага выканкаму. Міхаіл Кісялевіч быў прызначаны на гэтую пасаду ў верасьні 2018 году. «Гэты чалавек добра нас знае, таму ён вырашыў выкарыстаць сваё становішча для дэманстрацыі сваёй улады», – заявіў Фокін. Ён сказаў, што чыноўнік зь Лепельскага выканкаму выклікаў міліцыю і назіраў за затрыманьнямі.

Сам жа Міхаіл Кісялевіч заявіў, што ня ведае Андрэя Фокіна і не нясе адказнасьці за штрафы. Кіраўніца ідэалягічнага аддзелу Алена Барадзейка таксама адмаўляе, што міліцыю выклікаў мясцовы чыноўнік. Пры гэтым яна настойвала, што ніякая іншая рэлігійная суполка не сьпявае і не выступае ў грамадзкіх месцах. Каб спыніць перасьлед, яна заявіла, што грамада, да якой належаць Фокіны, павінна зарэгістравацца. Тады, паводле яе словаў, «яны могуць сьпяваць безь якіх-небудзь абмежаваньняў».

Сям’я Фокіных належыць да Міжнароднага саюзу цэркваў эвангельскіх хрысьціян-баптыстаў, які адкідае неабходнасьць дзяржаўнай рэгістрацыі. МСЦ ЭХБ таксама адмаўляецца плаціць штрафы, накладзеныя за выкананьне правоў на свабоду сумленьня. У Лепелі чальцы царквы арганізуюць вулічную бібліятэку з 1990-х гадоў.

**14.01.2019** Віцяблянін **Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард**, які зараз знаходзіцца на лячэньні ў аддзяленьні кардыялёгіі Віцебскай абласной клінічнай лякарні,




сьцьвярджае, што сьледчыя УСК РБ па Віцебскай вобласьці прымушаюць яго там даваць паказаньні без адваката. Інвалід 2-й групы накіраваў скаргу ў Генпракуратуру і Цэнтральны апарат СК РБ.

Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард, які зараз знаходзіцца ў статусе падазраванага ў паклёпе (ч.2 арт. 188 КК) на пракурора Віцебску Юрыя Раманоўскага, паведаміў у сваёй заяве ў Генпракуратуру, што старшы сьледчы УСК РБ па Віцебскай вобласьці Андрэй Гушча, ужываючы псыхалягічны ціск, прымушае яго даваць паказаньні супраць сябе і спрабуе сарваць лячэньне.

“У тым ліку прымушае мяне, інваліда 2-й групы, без удзелу адваката рабіць іншыя дзеяньні, падпісваць дакумэнты, усьведамляючы пры гэтым, што я знаходжуся ў цяжкім стане на лячэньні ў больніцы”, – піша Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард.

Паведамляе, што 9 студзеня 2019 году “Гушча прыехаў у лякарню і спрабаваў сарваць маё лячэньне”. “У прысутнасьці галоўнага ўрача лякарні Казлоўскага я скарыстаўся арт. 27 Канстытуцыі РБ”, – патлумачыў падазраваны.

“10 студзеня з пракуратуры Віцебскай вобласьці ў ВДКБ прыйшоў запыт аб спыненьні майго лячэньня для правядзеньня допытаў, нягледзячы на тое, што я паведаміў аб маім нежаданьні даваць якія-небудзь паказаньні”, – піша ў скарзе мужчына.

Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард просіць прыцягнуць сьледчага Гушчу, а таксама намесьніка пракурора Віцебскай вобласьці да прадугледжанай законам адказнасьці, бо сваімі дзеяньнямі, на думку заяўніка, яны парушаюць заканадаўства (арт. 41 КПК, арт. 27 Канстытуцыі).

Ад моманту ўзбуджэньня крымінальнай справы паводле арт. ч.2 арт. 188 КК у дачыненьні да Кірылава-Шмільхольдхарда і доктара-праўдаруба Ігара Пастнова прайшло ўжо каля паўгода, але абвінавачаньні падазраваным так і не прад’явілі.

**18.01.2019** Віцебскі **актывіст Андрусь Кешанюк** здолеў часткова аспрэчыць судовае пакараньне, накладзенае на яго за сьвяткаваньне 100-годзьдзя БНР: Вярхоўны суд пастанавіў вярнуць яму бел-чырвона-белы сьцяг, забраны міліцыянтамі. Але ў Першамайскім райаддзеле ўнутраных спраў Віцебску ягоную маёмасьць зьнішчылі і нават не прапануюць яе кампэнсаваць.

Канфіскаваць бел-чырвона-белы сьцяг пастанавіла судзьдзя Першамайскага райсуду Натальля Карабліна.

Андрусь Кешанюк спрабаваў абскардзіць яе рашэньне ў абласным судзе, а потым вышэй, і толькі старшыня Вярхоўнага суду Валянцін Сукала заўважыў судовую




памылку. Ён пастанавіў выключыць з пастановаў згадку пра канфіскацыю рэчавых доказаў, бо гэта не прадугледжана артыкуламі пра незаконнае пікетаваньне (ч. 2 арт. 23.34 КаАП) і непадпарадкаваньне міліцыянтам (23.4 КаАП), паводле якіх актывіста пакаралі.

Аднак на сваё патрабаваньне вярнуць незаконна забраную маёмасьць Андрусь Кешанюк атрымаў адмову за подпісам начальніка Першамайскага райаддзелу МУС Аляксандра Чарняўскага. Маўляў, вярнуць ня можам, бо выканалі пастанову суду ў частцы канфіскацыі маёмасьці «у даход дзяржавы» — зьнішчылі сьцяг разам з бамбукавым тронкам.

**20.01.2019** За адзін дзень пад зваротам да Ўпаўнаважанага ў справах рэлігіі і нацыянальнасьцяў Леаніда Гулякі падпісалася каля 300 чалавек. Віцебскія каталікі выказваюць незадавальненьне і патрабуюць, каб ім вярнулі іх духоўнага айца і **пробашча парафіі** Езуса Міласэрнага ў Віцебску **Паўла Кнурэка**. Пазьней тэкст звароту быў апублікаваны на пляцоўцы Petitions.by.

Пробашч каталіцкай парафіі Езуса Міласэрнага ў Віцебску ксёндз Павал Кнурэк, грамадзянін Польшчы, праслужыў у віцебскай катэдры крыху больш за год. У лістападзе 2018 году ён быў вымушаны пакінуць краіну, бо не атрымаў дазвол на далейшае служэньне ў Беларусі. Да прыезду ў Віцебск сьвятар больш за 16 гадоў узначальваў парафію Сьв. Апостала Андрэя ў Лынтупах (Пастаўскі раён).

Як расказваюць парафіяне, перад ад’ездам у Польшчу пробашч суцяшаў вернікаў. Казаў, што растаньне часовае і што цягам некалькіх месяцаў пытаньне можа вырашыцца і ён вернецца да паствы.

Але 13 студзеня пасьля ўрачыстай імшы Біскуп Віцебскі Алег Буткевіч паведаміў парафіі, што ад Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў прыйшла чарговая адмова на працягненьне служэньня ў Беларусі. “Без тлумачэньняў прычын. І цяпер ужо канчаткова”, – удакладніў біскуп Алег Буткевіч.

Біскуп прызнаўся, што вельмі расчараваны адмовай і заклікаў вернікаў маліцца ў інтэнцыі ўладаў, каб яны былі больш адкрытымі да каталіцкага Касьцёлу і ягоных патрэбаў.

Парафіяне абвясьцілі збор подпісаў пад зваротам да Ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў Леаніда Гулякі з просьбай перагледзець рашэньне аб непрацягненьні дазволу на служэньне ў Беларусі кс. Паўлу Кнурэку і дазволіць яму вярнуцца ў сваю парафію. Просяць таксама патлумачыць, зь якой прычыны было прынятае рашэньне аб забароне на яго служэньне ў нашай краіне.

“Рашэньне не працягнуць дазвол на служэньне а. Паўла выклікае тым большае

зьдзіўленьне, што апошнімі гадамі нашая дзяржава яскрава дэманструе адкрытасьць сьвету. У 2018 годзе ўказам прэзыдэнта быў павялічаны тэрмін бязьвізавага знаходжаньня замежных грамадзян на тэрыторыі нашай краіны да 1 месяца. І зусім незразумела, як пры гэтым чалавек, які больш за 15 гадоў адпрацаваў у Беларусі на ніве духоўнага адраджэньня нашай Айчыны, пазбаўляецца права знаходзіцца і служыць на яе тэрыторыі. Упэўненыя, што такія забароны шкодзяць іміджу ўсёй краіны", – гаворыцца ў звароце да Гулякі.

"І вельмі прыкра, што гэта адбываецца ў юбілейны для парафіі год, бо сёлета мы адзначаем 20-годдзе кансэкрацыі касьцёла Езуса Міласэрнага", – пішуць віцебскія каталікі.

Запэўніваюць, што зусім не ўспрымалі а. Паўла Кнурэка як чужаземца, бо "адпраўляў набажэнствы, прамаўляў казаньні і размаўляў зь людзьмі на добрай беларускай мове", выдатна ведаў нашую культура і ўсімі сродкамі спрыяў яе разьвіцьцю.

Падчас перадкаляднай прэс-канфэрэнцыі біскуп Віцебскі Алег Буткевіч зьвяртаў увагу на "пэўныя складанасьці з запрашэньнем сьвятароў з замежжа, ня толькі з Польшчы". Казаў, што вакансіі сьвятароў у Віцебскай дыяцэзіі пакуль немагчыма кампэнсаваць ксяндзамі-беларусамі. Паводле Біскупа, на падрыхтоўчых курсах у духоўнай сэмінарыі навучаюцца зараз усяго два чалавекі з дыяцэзіі.

За апошнія тры гады (2016–2018) улады ня далі аніводнага дазволу на служэньне ў Віцебскай дыяцэзіі замежнікам – каталіцкім сьвятарам альбо манашкам.

**04.02.2019 Сябра АГП Натальля Стрэльчанка** з Дуброўна паведамляла ў структуры Сьледчага камітэту пра тое, што яна была неабгрунтавана затрыманая, абшуканая і арыштаваная. Утрыманьне пад вартай бязь ежы цягам звыш трох гадзін Натальля расцаніла як абыходжаньне, якое зьневажае людзкую годнасьць. Паколькі СК не адрэагаваў належным чынам на яе зварот, грамадзянская актывістка зьвярнулася ў суд са скаргай на сьледчых.

Усё распачалося ў Дзень Волі – 2018. 25 сакавіка а 6:20 раніцы актывістка была затрыманая супрацоўнікамі РАУС на вуліцы гораду: яна ішла да прыпынку грамадзкага транспарту, каб накіравацца на сьвяткаваньне 100-годзьдзя БНР у Менск. Як пазьней высьветлілася, нейкі грамадзянін К. напярэдадні ўвечары падаў заяву ў РАУС пра тое, што, магчыма, Натальля Стрэльчанка распаўсюджвае ў адносінах да яго "паклёпніцкія чуткі".

Зранку за Натальляй было арганізаванае сачэньне, і начальству РАУС, як толькі яна выйшла з дому, "паступіла інфармацыя", што яна ідзе па вуліцы. Гэтая навіна так міліцыянтаў усьцешыла, што яны вырашылі апэратыўна на сьвітанку распачаць "адміністрацыйны працэс".

Цікава, што пра нагоду для затрыманьня ўжо праз 10 хвілін забыліся. Як толькі безабаронная дзяўчына пераступіла парог РАУС, то стварыла новую нагоду: паспрабавала зрабіць фотаздымак абстаноўкі дастаўленьня ў міліцыю. Выявілася, што актывістка патрапіла ня проста у РАУС, а ў рэжымную ўстанову, у якой таемнай інструкцыяй МУС грамадзянам забаронена здымаць мабільнымі тэлефонамі. Афармілі ўсё пратаколам: маўляў, ня выканала законныя патрабаваньні супрацоўнікаў міліцыі – не спыніла фотаздымкі, хаця ніводнай выявы сваёй установы ў

тэлефоне затрыманай праваахоўнікі не знайшлі.

Далей актывістку сталі “рыхтаваць” да суду паводле пратаколу. Як сьцьвярджае Натальля Стрэльчанка, зрабілі яе асабісты вобшук з поўным распрананьнем і відэазапісам гэтага працэсу. А пасьля яшчэ і не кармілі да суду, які праходзіў з 11-й да 15-й гадзіны.

Тут дадалася яшчэ цікавая акалічнасьць. Паводле закону, утрымліваць у пастарунку да суду можна грамадзян, якім за правапарушэньне пагражае пакараньне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту. Але такое пакараньне нельга ўжываць да грамадзян, якія маюць непаўналетніх дзяцей. А ў затрыманай такія дзеці ёсьць. Таму, відавочна, яе ўтрыманьне да суда ў пастарунку трэба лічыць незаконным.

Неабгрунтаванае затрыманьне на вуліцы, асабісты вобшук, утрыманьне пад вартай звыш трох гадзін, ды яшчэ бязь ежы – усё гэта стала для грамадзянскай актывісткі нагодай зьвярнуцца ў сьледчы камітэт. Аднак прыцягнуць вінаватых ў меркаваным злачынстве не ўдалося: сьледчыя палічылі, што ўсе дзеяньні праваахоўнікаў у дачыненьні да Натальлі Стрэльчанкі адбываліся ў межах разгледжанага судом адміністрацыйнага працэсу, у якім яна прызнаная вінаватай, а яе скаргі вышэйстаячымі судовымі органамі прызнаныя неабгрунтаванымі.

Рашэньне структур Сьледчага камітэту Натальля лічыць звычайнымі адпіскамі, падмацаванымі міліцэйскай салідарнасьцю. Таму 28 студзеня 2019 году яна абскардзіла дзеяньні Дубровенскага падразьдзяленьня Сьледчага камітэта ў раённы суд. У скарзе яна выклала аргумэнты павярхоўнага разгляду яе скаргі сьледчымі і запатрабавала абавязаць іх правесьці грунтоўную праверку.

**04.02.2019** На Дзень Волі – 2018 **Мікола Качурэц** узьняў ля помніку Альгерду ў Віцебску бел-чырвона-белы сьцяг, быў затрыманы і аштрафаваны судом Кастрычніцкага раёну на 30 б.в. (23.4 КаАП і 23.34 КаАП). А 4 лютага 2019 году віцяблянін атрымаў копію пастановы аб скасаваньні справы і касавы чэк – для вяртаньня грошаў, сплочаных за штраф.

Копію пастановы аб скасаваньні адміністрацыйнай справы, даведку і касавы чэк аб выплачаным штрафе Міколу Качурцу даслаў начальнік АУС Кастрычніцкага раёну Віцебску Сяргей Стэльмах. Каб вярнуць грошы за штраф, раіць зьвярнуцца з дасланымі дакумэнтамі ў падатковы орган па месцы жыхарства, а для вяртаньня дзяржпошліны – у суд.

Паведамляе таксама, што канфіскаваны ў Качурца 25 сакавіка 2018 году бел-чырвона-белы сьцяг “на захоўваньні ў АУС адміністрацыі Кастрычніцкага раёну адсутнічае”.

Узновім ланцужок падзей і рашэньняў, якія прывялі да скасаваньня адміністрацыйнай справы ў дачыненьні да Міколы Качурца.

25 сакавіка 2018 году віцяблянін адзначыў 100-годзьдзе БНР, узьняўшы ля помніку Альгерду ў Віцебску бел-чырвона-белы сьцяг. Недзе праз паўгадзіны быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі і правёў ноч у ізалятары часовага ўтрыманьня.

26 сакавіка судзьдзя Кастрычніцкага суду Віцебску Уладзімер Царыкаў прызнаў Міколу Качурца вінаватым у парушэньні заканадаўства аб правядзеньні масавых мера-




прыемстваў (ч.2 арт. 23.34 КаАП) і ў непадпарадкаваньні службовай асобе (23.4 КаАП), пакараўшы віцебчука штрафам на суму 30 базавых велічынь (735 рублёў).

25 красавіка судзьдзя Віцебскага абласнога суду Ірына Смалякова не задаволіла скаргу на пастанову суду Кастрычніцкага раёну, пакінуўшы яе бязь зьменаў.

27 жніўня 2018 году старшыня абласнога суду Мікалай Хамічонак ў парадку нагляду разгледзеў скаргу Міколы Качурца на рашэньне судзьдзі Ўладзімера Царыкава і пастанавіў адмяніць гэтае рашэньне: "вынова суду аб даказанасьці вінаватасьці Качурца паводле ч. 2 арт. 23.34 КаАП зьяўляецца заўчаснай". Асноўныя прэтэнзіі старшыні аблсуду былі выказаныя да зьместу пратаколу. Справа была накіраваная на новы разгляд.

27 кастрычніка 2018 году скончыўся тэрмін адміністрацыйнага пакараньня, прадугледжаны ч.2 арт. 7.6 КоАП РБ, што, у адпаведнасьці з заканадаўствам (п.3 ч.1 арт. 9.6 ПВКоАП), выключае адміністрацыйны працэс. Паводле пастановы аб скасаваньні справы аб адміністрацыйным правапарушэньні (ад 28.10.2018), "падчас падрыхтоўкі справы… забясьпечыць удзел Качурца М. у адміністрацыйным працэсе не выявілася магчымым".

Раней у Віцебску яшчэ ніколі не скасоўвалі адміністрацыйныя справы за парушэньне заканадаўства аб правядзеньні масавых мерапрыемстваў. Справа Качурца ў гэтым сэнсе – беспрэцэдэнтная.

**06.02.2019** Вернікі парафіі Езуса Міласэрнага ў Віцебску атрымалі адказ на калектыўны зварот да Ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў Леаніда Гулякі, у якім прасілі перагледзець рашэньне аб забароне служэньня ў Беларусі **пробашча Паўла Кнурэка**. Адказ адмоўны.

"Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей пісьмом ад 18.10.2018 не ўзгоднена запрашэнне грамадзяніна Рэспублікі Польша Кнурэка Паўла для ажыццяўлення рэлігійнай дзейнасці ў абшчыне "Рымска-каталіцкая парафія Езуса Міласэрнага ў г. Віцебску. Падстаў для перагляду раней прынятага рашэння не маецца", – гаворыцца ў атрыманым лісьце (правапіс захаваны).

Дадаткова тлумачыцца, што на падставе дзейнага заканадаўства Ўпаўнаважаны мае права не ўказваць прычыну адмовы ўзгадніць запрашэньне сьвятара.

**Старшыня парафіяльнай рады Пётар Глод** гаворыць, што незадаволены такім адказам Гулякі.

"Мы ведаем, што існуе інструкцыя, якая дазваляе Гуляку не адказваць на нашыя пытаньні. Але ж мы зьвярнуліся да яго чыста па-чалавечы і меркавалі, што

можам атрымаць на зварот таксама людзкія тлумачэньні. А тут адпіска!" – абураецца Пётар Глод.

**14.03.2019** Ля "сіняга дому" ў Віцебску быў затрыманы **Барыс Хамайда**. У Чыгуначным РАУС на яго склалі адміністрацыйны пратакол за "загрувашчваньне вуліцы" (арт. 21.14 КаАП). У міліцыі віцебскі апазыцыянэр прабыў больш за гадзіну.

Пазьней Барыс Хамайда расказаў, што ў гэты дзень, як заўсёды, стаяў каля дому па вуліцы Леніна, 28 у Віцебску, дзе распаўсюджваў незалежныя выданьні. Міліцыянты падышлі прыкладна праз 15 хвілін пасьля таго, як ён паразмаўляў зь віцебскім журналістам – гаворка была пра 25-годдзьдзе Канстытуцыі РБ.

"Яны падышлі і запатрабавалі, каб я сышоў з гэтага месца. А калі адмовіўся, паведамілі, што парушаю заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і што яны мяне затрымліваюць", – распавёў Барыс Хамайда.

Але ў аддзяленьні міліцыі Хамайда даведаўся, што яго абвінавачваюць у парушэньні правілаў добраўпарадкаваньня і ўтрыманьня населеных пунктаў – паводле арт. 21.14 КаАП. Нібыта затрыманы "загрувашчваў сваёй маёмасьцю вуліцу". Артыкул прадугледжвае пакараньне штрафам да 5 базавых велічынь. Барыс Хамайда пратакол не падпісаў.

Расказаў, што на пытаньне, чаму ж яго ўсё-такі затрымалі, супрацоўнік міліцыі, які складаў пратакол, адказаў з усьмешкай: "Ну дык заўтра ж Дзень Канстытуцыі…"

Хамайда зазначыў, што да гэтага амаль цягам году міліцыянты ня мелі да яго ніякіх прэтэнзіяў.

Апошні раз Барыса Хамайду затрымлівалі ў чэрвені 2018 году, перад адкрыцьцём "Славянскага Базару ў Віцебску".

**25.03.2019** Вядомага віцебскага **дысыдэнта Барыса Хамайду** затрымалі на рагу "сіняга дому" ў Віцебску. Ён трымаў у руках сьцяг гораду і самаробны плякат з цытатай расейскага пісьменьніка Івана Буніна: "Город (Витебск) древний и нерусский". Гэткім чынам Барыс Хамайда павіншаваў віцяблян з Днём Волі.

Затрымлівалі Хамайду людзі ў цывільным, якія назваліся яму міліцыянтамі. Апазыцыянэр прастаяў з плякатам каля 10 хвілін, пакуль супрацоўнікі ў цывільным чакалі міліцэйскай машыны. Барыса Хамайду адвезьлі ў Чыгуначны РАУС Віцебску.

Як высьветлілася пазьней, міліцыянты ня мелі прэтэнзіяў да плякату, які трымаў у руках Хамайда, а склалі на яго адміністрацыйны пратакол за "загрувашчваньне вуліцы" (арт. 21.14 КаАП). Падпісваць пратакол ён адмовіўся. Недзе праз гадзіну Барыса Хамайду выпусьцілі з аддзяленьня міліцыі.

**02.04.2019** Праз тыдзень пасьля сьвяткаваньня Дня Волі ў Віцебску на братоў **Уладзімера** і **Яраслава Кійко** міліцыянты склалі пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні паводле ч.1 арт. 23.34 КаАП – "за пікет з выкарыстаньнем палотнішча бел-чырвона-белага колеру".

Як расказаў старэйшы брат Яраслаў да яго дамоў прыйшоў міліцыянт, які назваўся ўчастковым, і прад'явіў пратакол.

“Знаходзячыся каля помніку “Князю Альгерду”… у парушэньні закону “Аб масавых мерапрыемствах” ажыццявіў пікетаваньне з выкарыстаньнем палотнішча бел-чырвона-белага колеру”, – гаворыцца ў пратаколе, складзеным міліцыянтам Кастрычніцкага РАУС Віцебску Канстанцінам Ярашэўскім.

“Гэты ж самы міліцыянт, што прыходзіў да мяне, заходзіў і да майго брата, але дома не застаў. Там таксама казаў, што ён ягоны ўчастковы, хоць мы з братам жывем на розных вуліцах і ўчастковыя ў нас розныя. А празь дзень гэты “участковы” чакаў майго брата на выхадзе з тэатру. За паўгадзіны да гэтага я размаўляў з братам па тэлефоне, і той сказаў, што знаходзіцца ў тэатры. Таму я раблю выснову, што нашыя тэлефонныя размовы з братам праслухоўваюцца”, – расказаў Яраслаў Кійко.

“Улада лёгка падмінае пад сябе і мараль, і закон, калі на кану стаіць пытаньне кантролю за людзьмі, якія хочуць адчуваць сябе ў сваёй жа дзяржаве паўнавартаснымі грамадзянамі. Нават калі ты вырашыў у нядзельны сьвяточны дзень сфатаграфавацца з традыцыйным і нікім не забароненым сьцягам гэтай краіны, ты ўжо трапляеш у разрад “нязгодных”, на жаль…" – дадае Яраслаў.

Актывісты з пратаколамі не пагадзіліся і даваць тлумачэньні адмовіліся.

**02.04.2019** Віцяблянін **Мікола Качурэц** атрымаў позву з Кастрычніцкага РАУС Віцебску. Яму паведамілі, што ў яго дачыненьні вядзецца адміністрацыйны працэс паводле арт. 23.34 КаАП РБ.

Як расказаў Мікола Качурэц, раней міліцыянты спрабавалі запрасіць яго ў РАУС па тэлефоне. Казалі, што – з нагоды сьвяткаваньня Дня Волі ў Віцебску. Але актывіст параіў даслаць афіцыйную позву.

У позьве патрабуюць явіцца 3 красавіка а 14-й гадзіне ў АУС адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Віцебску да супрацоўніка міліцыі Канстанціна Ярашэўскага.

Менавіта гэты міліцыянт склаў адміністрацыйныя пратаколы ў дачыненьні да яшчэ двух віцяблянаў – братоў Яраслава і Ўладзімера Кійко. Іх вінавацяць у “пікетаваньні з выкарыстаньнем палотнішча бел-чырвона-белага колеру”.

Як стала вядома, такая самая фармулёўка (“зьдзейсьніў пікетаваньне з выкарыстаньнем палотнішча бел-чырвона-белага колеру без атрыманьня дазволу”) фігуруе і ў пратаколе, складзеным на Міколу Качурца. Пратакол ён не падпісаў.

**16.04.2019** Жыхары Віцебску **Ігар Пастноў** і **Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард** атрымалі пастановы аб прызначэньні судовага разбору па крымінальнай справе, распачатай супраць іх за паклёп на пракурора гораду Віцебску Юрыя Раманоўскага (ч.2 арт. 188 КК РБ). Судовы працэс пачнецца 22 красавіка ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску і пройдзе ў закрытым рэжыме.

Справу будзе разглядаць старшыня Бешанковіцкага раённага суду Натальля Рошчына.

“У мэтах неразгалошваньня зьвестак, якія закранаюць гонар і годнасьць пацярпелага, разбор крымінальнай справы варта прызначыць у закрытым судовым паседжаньні”, – гаворыцца ў пастанове.




Меру стрыманьня ў дачыненьні да Пастнова і Кірылава-Шміль-хольдхард не зьмянілі – яны знаходзяцца пад падпіскай аб нявыезьдзе.

**18.04.2019** Жыхара Віцебску **Сяргея Сясіцкага** апыталі наконт зьместу ягонай старонкі ў сацыяльнай сетцы “Фэйсбук” і забралі мабільны тэлефон. Прадстаўнік крымінальнага вышуку паведаміў, што следчыя праводзяць праверку на наяўнасьць прапаганды экстрэмізму або распальваньня міжнацыянальнай варожасьці.

Якім чынам ён трапіў пад увагу сьледчых, Сяргею Сясіцкаму не паведамілі. Ён перакананы, што нічога недазволенага на сваёй старонцы не разьмяшчаў, а заяву ў міліцыю маглі падаць ягоныя апанэнты ў спрэчках пра “руский мир”, бо такія пагрозы ўжо былі.

“Там выказваньне маёй грамадзянскай пазыцыі па пытаньнях палітычнага жыцьця нашай краіны, маё стаўленьне да агрэсіўнай палітыкі Расейскай Фэдэрацыі – усё тое, пра што я пішу даўно і на розных пляцоўках. Ад маіх апанэнтаў пагрозаў жыцьцю ці здароўю пакуль не было, але заявамі ў міліцыю пагражалі неаднаразова. Маўляў, як я сьмею такое пісаць. Але я ведаю законы нашай краіны – што нельга заклікаць да гвалтоўных дзеяньняў, нельга прыніжаць, абражаць іншых людзей. І, вядома, гэтага я прытрымліваюся”, – кажа Сяргей Сясіцкі.

Праверка мабільнага тэлефона, як паведамілі Сяргею, будзе праводзіцца цягам месяца.

Што да пагрозаў з боку палітычных апанэнтаў, то на шэрагу віцебскіх паблікаў, якія прапагандуюць ідэі “адзінай Русі”, такія выказваньні насамрэч трапляюцца. У тым ліку за заклікі Сясіцкага не дапусьціць у Віцебску канцэртаў выканаўцы турэмнага шансону Віктара Каліны, вядомага сваімі шавіністкімі выказваньнямі пра беларусаў і беларускую мову, а таксама фатаграфаваньнем са зброяй на занятых сэпаратыстамі тэрыторыях Данецкай і Луганскай абласьцей Украіны.

**18.04.2019** Судовы выканаўца Полацкага аддзелу прымусовага выкананьня Антон Лашкевіч 18 красавіка забараніў Свабоднаму прафсаюзу Беларускаму (СПБ) карыстацца офісам у Полацку – згодна з рашэньнем абласнога эканамічнага суду. Аднак маёмасьць першаснай арганізацыі СПБ працаўнікоў ААТ “Полацак-Шкловалакно” засталася ў офісе, бо ў рашэньні суду яна ніяк ня згадваецца.

Як расказалі прафсаюзныя актывісты, пяршоўка СПБ працаўнікоў “Полацак-Шкловалакно” мае статус самастойнай юрыдычнай асобы, гэтак яе зарэгістравалі мясцовыя ўлады. Умова аб арэндзе складалася на падставе пагадненьня ад 2009 году, якое падпісалі дырэктар і старшыня пяршоўкі СПБ. Адміністрацыя заводу




вырашыла заключыць умову арэнды памяшканьня не зь пяршоўкай СПБ, а з цэнтральным рэспубліканскім СПБ у Менску. У дагаворы пазначана, што памяшканьне арандуецца для статутнай дзейнасьці першаснай арганізацыі СПБ працаўнікоў прадпрыемства "Полацак-Шкловалакно". Умова складалася на тры гады і ўжо двойчы працягвалася адміністрацыяй (2012 і 2015 гг.).

У кастрычніку 2018 гаду новы дырэктар вырашыў не працягваць дагавор арэнды з СПБ і падаў пазоў у эканамічны суд з патрабаваньнем выселіць прафсаюз як гаспадарчы суб'ект. Між тым, полацкі СПБ патрабаваў працягу ўмовы арэнды і заявуляў аб тым, што эканамічны суд ня мае кампэтэнцыі вырашаць спрэчкі паміж працадаўцам і прафсаюзамі. Паводле заканадаўства такія спрэчкі вырашаюцца ў Працоўным арбітражы.

Тым ня менш суд ня ўзяў пад увагу довады прафсаюзу і прыняў рашэньне забараніць СПБ карыстацца памяшканьнем. Аб маёмасьці пяршоўкі суд у сваім рашэньні наогул ня згадвае.

На думку **старшыні СПБ Міколы Шараха**, прычына высяленьня СПБ не зьвязаная са сканчэньнем умовы аб арэндзе памяшканьня. У прафсаюзаў існуе практыка арэнды памяшканьняў у працадаўцаў на бязвыплатнай аснове. Дзяржаўны працадаўца ставіць задачу зьнішчыць прафсаюз як арганізацыйную структуру. Спачатку пазбавіць офісу, потым – юрыдычнага адрасу, а пасьля паспрабуе пазбавіць пяршоўку СПБ дзяржрэгістрацыі, такое ўжо было ў практыцы полацкага прафсаюзу.

**26.04.2019** Традыцыя пускаць жалобны вянок па Дзьвіне ў Дзень чарнобыльскай трагедыі існавала ў Віцебску больш за 15 гадоў. Сёлета віцебскія вэтэраны Чарнобылю хацелі перадаць гэтую традыцыю маладым і зьвярнуліся па дапамогу ў Віцебскі гарвыканкам. Улады спачатку абнадзеілі, а потым паведамілі, што апускаць вянок нельга – не ўхваляе царква…

У Віцебску ад 2016 году праводзяцца афіцыйныя імпрэзы, прысьвечаныя чарнобыльскай трагедыі – жалобныя малебны ва Ўсьпенскім саборы, удзел у якіх бяруць і прадстаўнікі гарадзкіх уладаў. Летась, пасьля афіцыйнага малебну, вэтэраны-чарнобыльцы спусьціліся да Дзьвіны і апусьцілі ў раку жалобны вянок з надпісам "Заўчасна памерлым чарнобыльцам – ад нас, жывых. Вечная памяць!" Такая сымбалічная акцыя ладзілася ў Дзень чарнобыльскай трагедыі цягам многіх гадоў. Аднак сёлета пасьля малебну вэтэраны адразу пачалі разыходзіцца па дамах.

"Вянку ня будзе. Улады сказалі, што вянок нельга апускаць…" – з горыччу паведаміў 78-гадовы **вэтэран Чарнобылю Анатоль Гнеўка**.




Больш падрабязна аб тым, чаму гарадзкія ўлады адмовілі ў правядзеньні жалобнай акцыі, расказаў яшчэ адзін віцебскі **ліквідатар-чарнобылец Аляксандар Мікулін**.

“Два тыдні таму мы хадзілі ў аблвыканкам, а потым у гарвыканкам і прасілі, каб у плян мерапрыемстваў уключылі нашую сымбалічную дзею. Але папрасілі, каб сёлета вянок апусьцілі маладыя людзі, курсанты МНС. Такім чынам хацелі перадаць традыцыю маладым. І спачатку нам адказалі, што няма праблемаў. Але пазьней з аддзелу ідэалёгіі гарвыканкаму патэлефанавалі Сяргею Іконьнікаву і сказалі, што вянок апускаць нельга: не ўхваляе царква, маўляў, у Страсную пятніцу нельга”, – распавёў Аляксандар Мікулін.

Раней былыя ліквідатары аварыі на ЧАЭС ладзілі сваю сымбалічную акцыю ў Віцебску, ня просячы ні дапамогі, ні дазволу ўладаў.

**30.04.2019** Затрыманая 11 красавіка **актывістка Надзея Куканос** утрымлівалася ў віцебскім СІЗА №2. 29 красавіка яе пад канвоем адвезьлі ў рэспубліканскі цэнтар псыхічнага здароўя ў Навінках для правядзеньня судова-псыхіятрычнай экспэртызы. Пра гэта паведамілі яе паплечнікі па незарэгістраваным аб’яднаньні “За сумленную ўладу”.

Сябры Надзеі Куканос расказалі, што 30 красавіка яны хацелі перадаць Куканос перадачу ў СІЗА, але прымаць перадачу там адмовіліся і паведамілі, што жанчыну 29 красавіка адвезьлі ў Навінкі.

У лісьце, які атрымаў ад актывісткі віцяблянін **Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард**, Куканос паведамляла, што два яе папярэднія лісты да яго зь СІЗА “ня выпусьцілі”, і з гэтай нагоды яна падала скаргу ў суд.

Ужо ад адваката паплечнікі Куканос даведаліся, што яна некаторы час правяла ў карцэры, куды была зьмешчаная за тое, што дапамагала сукамэрнікам складаць скаргі. Між тым, сама накіравала некалькі скаргаў ва ЎДВП Віцебскай вобласьці на незаконныя дзеяньні супрацоўнікаў СІЗА і жахлівыя ўмовы ўтрыманьня пад вартай, але, зь ейных словаў, паперы за сьцены ізалятару таксама ня выйшлі.

Падала таксама скаргу ў суд Кастрычніцкага раёну Віцебску на проціпраўныя дзеяньні супрацоўнікаў СІЗА і неадпаведныя ўмовы ўтрыманьня ў ізалятары. У скарзе пісала ня толькі пра затрыманыя лісты, але і пра тое, што ёй не аказваюць мэдычную дапамогу (Куканос пакутуе на лімфастаз), утрымліваюць у адной камэры з падсьледнымі, якія паляць, што супрацоўнікі СІЗА зьневажаюць яе і чыняць гвалт. Судовы разгляд меўся адбыцца 30 красавіка, але суду не было, бо ў гэты дзень Куканос ужо знаходзілася ў Навінках.




На 2 траўня ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску прызначаны разгляд яшчэ адной скаргі Куканос – аб яе незаконным зьмяшчэньні ў СІЗА. Але сябры Куканос упэўненыя, што і гэты суд не адбудзецца.

Раней у дачыненьні да Надзеі Куканос былі распачатыя тры крымінальныя справы, якія былі пазьней аб'яднаныя ў адну вытворчасьць. Усе – паводле артыкулу 400 КК ("Заведама ілжывы данос"). Дзьве зь іх былі распачатыя пасьля заяваў жанчыны аб тым, што службовыя асобы чынілі над ёй гвалт. Апошняя крымінальная справа зьявілася пасьля таго, як у жніўні 2018-га Куканос напісала скаргу аб яе прымусовым зьмяшчэньні ў псыхіятрычную клініку. Пацярпелымі ў гэтых справах выступаюць сьледчыя і міліцыянты.

Зь Віцебскай абласной псыхіятрычнай бальніцы, куды ў 2018-м Куканос зьмясьцілі прымусова, жанчыну выпісалі на наступны дзень з заключэньнем "псыхічна здаровая".

Раней адзін з сутаварышаў Куканос **Пётар Іваноў** выказваў меркаваньне, што асноўнай прычынай затрыманьня Куканос 11 красавіка і яе зьмяшчэньня ў СІЗА была не неабходнасьць правядзеньня экспэртызы па распачатых крымінальных справах, а жаданьне "закрыць" жанчыну на час візыту ў Віцебск генэральнага пракурора, да якога Куканос запісалася на прыём. Генпракурор Аляксандар Канюк праводзіў прыём грамадзян у Віцебску (прынамсі на прадпрыемстве "Віцебскмясамалпрам") 30 красавіка.

**04.05.2019** Сябры левай партыі "Справядлівы сьвет" падавалі заяўку на правядзеньне ў Віцебску на Дзень Перамогі шэсьця-акцыі "Несьмяротны полк". Віцебскія ўлады адмовілі ў правядзеньні шэсьця з фармулёўкай "не ўяўляецца магчымым".

Пра гэта паведаміў **актывіст партыі "Справядлівы сьвет" Вадзім Кузьмін**, які 4 траўня атрымаў адказ з Віцебскага гарвыканкаму.

"Уключэньне ў плян мерапрыемстваў з нагоды сьвяткаваньня Дня Перамогі шэсьця жыхароў гораду "Несьмяротны полк" не ўяўляецца магчымым. Таму прапануем вам з партрэтамі вэтэранаў вайны далучыцца да акцыі "Беларусь помніць", якая пройдзе ў Віцебску 9 траўня а 10-й гадзіне", – гаворыцца ў адказе з гарвыканкаму.

На думку Вадзіма Кузьміна, розьніца паміж акцыямі "Беларусь помніць" і "Несьмяротны полк" невялікая – справа хіба што ў назьве. Дадаў, што абавязкова прыйдзе на плошчу Перамогі 9 траўня.

Шэсьце-акцыя "Несьмяротны полк" ("Бессмертный полк") асацыюецца ў Бела-

русі перадусім з “русским миром”, георгіеўскімі стужкамі і партрэтамі Сталіна. Арганізатарамі шэсьця выступаюць звычайна прарасейскія арганізацыі.

**17.05.2019** Адміністрацыя полацкага заводу “Шкловалакно” цягам месяца незаконна сьпісвала грошы з банкаўскага рахунку Свабоднага прафсаюзу – забралі амаль 130 рублёў. Прафсаюзныя актывісты лічаць гэта чарговым фактам перашкоды дзейнасьці Свабоднага прафсаюзу. Яны накіравалі скаргу ў пракуратуру Полацку.

Юрысты заводу вырабілі незаконнае выплатнае патрабаваньне, у якім падмянілі банкаўскі рахунак даўжніка. На падставе судовага загаду эканамічнага суду, дзе даўжніком названы Свабодны прафсаюз Беларускі (СПБ), завод указаў іншую юрыдычную асобу – першасную арганізацыю работнікаў ААТ Полацак-Шкловалакно СПБ. Такім чынам з рахунку пяршоўкі СПБ у “БПС-Ашчадбанку” цягам месяца сьпісваліся грашовыя сродкі, якія паступалі ў якасьці прафсаюзных складак. Аднак, паводле статуту прафсаюзу, першасныя арганізацыі СПБ не адказваюць па абавязках цэнтральнага офісу СПБ.

Як расказалі прафсаюзныя актывісты, пасьля рашэньня Віцебскага эканамічнага суду 29 студзеня 2019 году аб высяленьні з офісу Свабоднага прафсаюзу Беларускага і выплаты 490 рублёў судовай пошліны СПБ прыняў рашэньне абскардзіць судовую пастанову ў адміністрацыйным парадку ў Генпракуратуру. Свабодны прафсаюз не прызнае Эканамічны суд упаўнаважаным органам для разгляду спрэчкі паміж прафсаюзам працоўных і адміністрацыяй заводу. Аднак пракуратура належным чынам не адрэагавала.

Прафсаюз СПБ сабраў неабходную суму (490 рублёў) і 26 сакавіка выплаціў кампэнсацыю заводу “Шкловалакно” па рашэньні суду аб вяртаньні судовай пошліны. Тым ня менш, у пэрыяд ад 28 сакавіка да 30 красавіка з рахункаў заводзкай пяршоўкі СПБ было сьпісана 129,30 рублёў.

Прафсаюз заўважыў крадзеж грошай толькі 2 траўня, а ўжо 3 траўня была выстаўленая прэтэнзія да заводу. Грошы прафсаюзу вярнулі праз тыдзень, 11 траўня, пасьля накіраваньня скаргі ў пракуратуру аб перашкодзе дзейнасьці прафсаюзу з боку ААТ “Полацак-Шкловалакно”.

“Лічу, што гэты факт не выпадковы, што гэта чарговыя дзеяньні дзяржавы і яе агентаў, накіраваныя на зьнішчэньне свабоднага прафсаюзнага руху ў Рэспубліцы Беларусь”, – сказаў **старшыня рэспубліканскага Свабоднага прафсаюзу Беларускага Мікола Шарах**.

“Мы расцэньваем гэта як крадзеж грошай прафсаюзу махлярскім чынам. Калі гэта не сьвядомае махлярства, то тады прафэсійная некампэтэнтнасць адразу групы людзей: заводзкіх юрыстаў, якія вырабілі “ліпавае” аплатнае патрабаваньне; бухгальтараў заводу, якія не паведамілі аб звароце прафсаюзам судовай пошліны; банкаўскіх работнікаў, якія не праверылі, ці супадаюць даўжнікі ў плацежным патрабаваньні і ў судовым загадзе суду”, – выказаў сваё меркаваньне прафсаюзны актывіст Віктар.

У скарзе ў полацкую пракуратуру прафсаюз рабочых ААТ “Полацак-Шкловалакно” просіць прыцягнуць службовых асобаў прадпрыемства да адказнасьці за

махлярства з крадзяжом грашовых сродкаў з банкаўскага рахунку прафсаюзу пры дапамозе махінацыі з судовым загадам.

Заводзкая юрыстка паведаміла, што яны памыліліся з рахункам, таму што паставіліся да прафсаюзу як да эканамічнага суб'екту. Ня быў улічаны той факт, што ў прафсаюзе СПБ структурныя падразьдзяленьні не адказваюць па абавязках усяго прафсаюзу.

**30.05.2019** Мужчына пракамэнтаваў пост у сацсетцы "ВКонтакте" пра тое, што ў Віцебску плянуюць пабудаваць яшчэ адну лядовую пляцоўку і басэйн. У камэнтары вельмі жорстка прайшоўся па асобах віцебскага мэра і "губэрнатара". Супраць віцябляніна распачалі крымінальную справу за абразу прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК), інфармуе прэс-служба УУС Віцебскага аблвыканкаму.

Паведамляецца, што камэнтатар выступаў пад жаночым нікам "Оля Иванова". Праверка, якую правялі праваахоўнікі пасьля звароту прадстаўніка Віцебскага гарвыканкаму, паказала, што за "Олей Ивановой" хаваўся 35-гадовы працаўнік Віцебскага ЖРЭТу.

Цяпер мужчыне пагражае паводле арт. 369 КК да трох гады пазбаўленьня волі.

**04.06.2019** Ад пачатку 2019 году **апазыцыянэра Барыса Хамайду** затрымлівалі каля "сіняга дому" ў Віцебску тройчы – напярэдадні Дня Канстытуцыі, на Дзень Волі і 30 красавіка. Ва ўсіх трох выпадках на яго складалі пратаколы за загрувашчваньне вуліцы (арт. 21.14 КаАП). Як стала вядома, дзьве адміністрацыйныя справы супраць Хамайды ўжо спыненыя.

Як расказаў Барыс Хамайда, 2 чэрвеня ён атрымаў паведамленьне з Чыгуначнага РАУС Віцебску аб скасаваньні адміністрацыйнай справы ад 25 сакавіка. Зь якіх прычынаў справу спынілі – у паперы не тлумачылася.

"Мне стала цікава, і я схадзіў у РАУС, каб даведацца, чаму спынілі. Паглядзеў справу. Аказалася, міліцыянты некалькі разоў накіроўвалі яе ў адміністрацыйную камісію Чыгуначнага раёну і абодва разы ім яе вярнулі назад – з той прычыны, што недастаткова доказаў", – патлумачыў Хамайда.

Распавёў, што ў другі раз міліцыянты далучылі да пратаколу сем фотаздымкаў, зробленых у розных ракурсах, на якіх Барыс Хамайда стаіць ля "сіняга дому" і трымае сьцяг Віцебску і плякат з цытатай Буніна ("Город Витебск древний и нерусский").

Але камісіі, каб прыцягнуць Хамайду да адказнасьці, і гэтага аказалася мала. Міліцыянтам адказалі, што з тых фотаздымкаў зусім незразумела, у які час і ў якім месцы яны рабіліся, а таксама – хто канкрэтна парушаў заканадаўства. Больш доказаў міліцыянты не знайшлі і справу спынілі.

Барыс Хамайда паведаміў таксама, што супрацоўнікам Чыгуначнага РАУС не ўдалося давесьці да канца і справу, распачатую супраць яго 14 сакавіка (перад Днём Канстытуцыі). Адміністрацыйную справу скасавалі пасьля таго, як яе вярнулі ў РАУС на дапрацоўку з адміністрацыйнай камісіі, а дадатковых доказаў вінаватасьці Хамайды міліцыянты прад'явіць не змаглі.




**26.06.2019 Барыса Хамайду** аштрафавалі на 25,50 рублёў. Пастанову пра штраф вынесла адміністрацыйная камісія Чыгуначнага райвыканкаму паводле пратаколу, складзенага на распаўсюдніка незалежнай прэсы 30 красавіка.

У той дзень нічога незвычайнага не адбывалася: як заўжды, Барыс Хамайда выставіў каля "сіняга дому" свой столік пад бел-чырвона-белым парасонам, расклаў часопісы ды газэты. Але загадчыца бліжэйшай крамы выклікала міліцыю. Пастанову пра штраф даслалі па пошце.

"Камісія мяне двойчы выклікала, але я туды не хадзіў, бо лічу, што гэтая ўлада нелегітымная. У суботу мне прыйшоў пакет, а ў ім пастанова, што далі адну базавую велічыню штрафу. Плаціць ня буду добраахвотна, няхай вылічваюць з пэнсіі тую адну базавую", – расказаў Барыс Хамайда.

Штраф далі мінімальны: санкцыя артыкула 21.14 КаАП (парушэньне парадку ўтрыманьня населеных пунктаў) прадугледжвае да 5-ці базавых велічынь штрафу.

**04.07.2019** Віцебскі гарадзі аддзел Сьледчага камітэту РБ распачаў супраць **Ігара Пастнова** крымінальную справу па прыкметах складу злачынства, прадугледжанага ч.1 арт. 407 КК РБ (разгалашэньне дадзеных закрытага судовага паседжаньня).

Раней, 20 траўня 2019 году, "доктар-праўдаруб" Ігар Пастноў быў прызнаны вінаватым у паклёпе на пракурора гораду Віцебску Юрыя Раманоўскага (ч.2 арт. 188 КК) і пакараны судом Бешанковіцкага раёну на тры гады абмежаваньня волі з накіраваньнем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Суд праходзіў у закрытым рэжыме. У судовым паседжаньні, на якім судзьдзя Натальля Рошчына – ужо публічна – абвясьціла вырак, сам Пастноў адсутнічаў. Празь некаторы час ён апублікаваў поўны тэкст прысуду ў інтэрнэце. Менавіта гэты факт, на ягоную думку, і стаўся падставай для ўзбуджэньня новай крымінальнай справы паводле арт. 407 КК РБ.

"Супраць мяне распачатая чарговая крымінальная справа за тое, што я раскрыў дадзеныя закрытага судовага паседжаньня. Дадзеныя судовага паседжаньня, на якім я не прысутнічаў, з матэрыяламі якога мне адмовілі нават азнаёміцца. Вось у чым дзікасьць гэтай сыстэмы! Я адно толькі апублікаваў прысуд, які агучваўся ў адкрытым рэжыме…" – кажа Ігар Пастноў.

Між тым, віцебскі **праваабаронца Леанід Сьвецік** мяркуе, што гэткімі дзеяньнямі Пастноў мог-такі парушыць абавязкі аб неразгалашэньні дадзеных закрытага судовага сьледзтва.




“Наколькі мне вядома, абвінавачаны Ігар Пастноў быў папярэджаны аб неразгалашэньні дадзеных закрытага судовага паседжаньня і аб адказнасьці за парушэньне гэтых абавязкаў. Да разгляду апэляцыі ў Віцебскім абласным судзе, то бок да набыцьця прысудам законнай сілы, Ігар Аляксеевіч мог раскрыць, у тым ліку ў сетцы Інтэрнэт, толькі выніковую частку прысуду. Усе астатнія дадзеныя і факты судовага працэсу мог абвяшчаць публічна толькі з дазволу судзьдзі. Напэўна, такога дазволу Пастноў ня меў, чым парушыў абавязкі аб неразгалашэньні”, – патлумачыў праваабаронца Леанід Сьвецік.

**08.07.2019** Віцебскія грэка-каталікі адклікалі заяўку на правядзеньне юбілейнай пешай пілігрымкі ў Полацак, бо ўлады выставілі непасільны рахунак за “абслугоўваньне масавага мерапрыемству”. Тым ня менш сьвяткаваньне 25-й пілігрымкі адбудзецца, запэўнівае адзін з арганізатараў хроснага ходу **сьвятар Зьміцер Грышан**.

Пешая пілігрымка зь Віцебску ў Полацак, прысьвечаная памяці сьв. Язафата Кунцэвіча і полацкіх пакутнікаў, павінна была пачацца 9 чэрвеня. Улады дазволілі яе правядзеньне, але ў адказе на заяўку ўніятаў спасламіся на пастанову Савету Міністраў №49 і неабходнасьць заключэньня дамовы на ахову грамадзкага парадку. Міліцыя запрасіла ў вернікаў за аплату сваіх паслугаў каля 3 тысячаў рублёў. Празь немагчымасьць знайсьці такія грошы арганізатары пілігрымкі адклікалі заяўку зь Віцебскага аблвыканкаму.

“Але ў Полацку, нягледзячы ні на што, мы будзем сьвяткаваць 25-ю пілігрымку. Яна памяняла свой фармат, яна перастала быць пешай, але людзі туды дабяруцца”, – кажа пробашч грэка-каталіцкай парафіі Ўваскрэсеньня Хрыстовага ў Віцебску Зьміцер Грышан.

Сьвятар кажа, што было вельмі цяжка патлумачыць абураным вернікам, чаму пілігрымку даводзіцца адмяняць.

“Шчыра кажу, вялікіх намаганьняў каштавала стрымаць гэтае абурэньне і нейкім чынам патлумачыць людзям, на чым стаіць справа. Што гаворка не вядзецца пра змаганьне з рэлігіяй ці з грэка-каталікамі, а гаворка – пра нейкія, на мой погляд, дзіўныя і цяжка зразумелыя юрыдычныя казусы.

Ну калі мы ня можам заплаціць, то чаму ня можам ісьці без аховы? Можа, дзяржава прывыкла, што грамадзян трэба за руку вадзіць, каб зь імі штосьці ня сталася ці каб яны самі штосьці не нарабілі? Можа, лічыць, што ў нас грамадзяне неадказныя, як дзеці?” – задаецца пытаньнямі сьвятар.

“Будзем шукаць, адкуль падыйсьці да гэтай справы. Бо хадзіць у пілігрымкі – гэта вельмі важная справа. Гэта ня ёсьць нашай прыхамацьцю, у гэтым сутнасьць нашай веры”, – дадае Зьміцер Грышан.

**19.07.2019** Начальнік аховы прадпрыемства ААТ “Полацак-Шкловалакно” забараніў прадстаўнікам Свабоднага прафсаюзу Беларускага вывешваць інфармацыйны ліст на стэнд для грамадзкіх арганізацыяў, піша сайт “Свабодны прафсаюз – Полацак”.

У той дзень, калі адбыўся інцыдэнт, **старшыня Свабоднага прафсаюзу Беларускага** (СПБ) **Мікола Шарах** меў сустрэчу з дырэктарам прадпрыемства Алегам Курылiным. Але на прахадной заводу прафсаюзных лідэраў сустрэў начальнік аховы і вырваў інфармацыйны лісток з рук актывіста Віктара Стукава, калі той хацеў разьмясьціць яго на стэндзе. Ахоўнік не назваўся і патлумачыў, што актывісты ня маюць права разьмяшчаць свае аб’явы на стэндзе.

Актывісты кажуць, што такога парушэньня правоў працоўных колішнія начальнікі не дапускалі. Раней дзейнічала вусная дамоўленасьць паміж прафсаюзам і адміністрацыяй аб тым, што адна ячэйка на стэндзе для грамадзкіх арганізацыяў будзе выкарыстоўвацца СПБ.

Праблемы з разьмяшчэньнем інфармацыі былі і тады, але колішняя адміністрацыя даставала прафсаюзныя ўлёткі ўпотай, калі на прахадной нікога не было, і ня дзейнічала так нахабна. У 2017 годзе адміністрацыя заводу скардзілася міністру інфармацыі, што інфармацыйная дзейнасьць СПБ нібыта “дэстабілізуе працоўныя адносіны” на прадпрыемстве.

“Такім чынам сьведчым, што нахабнасьць адміністрацыі заводу ўсё ўзрастае. Мяркуем, што гэтая неадэкватнасьць будзе павялічвацца, пакуль не атрымае адпаведны адпор ад працаўнікоў заводу”, – кажуць актывісты СПБ.

Падчас сустрэчы са старшынём СПБ гендырэктар “Полацак-Шкловалакно” Алег Курылін паабяцаў разабрацца з сытуацыяй цягам тыдня. Кіраўнік прадпрыемства заявіў таксама, што на заводзе ніякім чынам не парушаецца канвэнцыя Міжнароднай арганізацыі працы.

“Прафсаюз СПБ чакае безумоўнага і неадкладнага аднаўленьня правоў прафсаюзу на свабодны распаўсюд інфармацыі аб сваёй дзейнасьці”, – гаворыцца ў паведамленьні на афіцыйным сайце Свабоднага прафсаюзу.

**26.07.2019** Свабодны прафсаюз Беларускі зноў атрымаў прадпісаньне Полацкага міжраённага аддзелу прымусовага выкананьня вызваліць памяшканьне, што належыць прадпрыемству “Полацак-Шкловалакно”. Прафсаюзныя лідэры зьдзіўленыя, бо СПБ яшчэ 18 ліпеня вызваліў гэтае памяшканьне, аб чым быў складзены акт судовым выканаўцам Антонам Лашкевічам. Цяпер ён жа даслаў паўторны наказ вызваліць памяшканьне цягам сямі дзён.

Судовы выканаўца пагражае прафсаюзу адміністрацыйным штрафам, калі ён не вызваліць памяшканьне.

Прадстаўнікі СПБ удакладняюць, што 18 красавіка яны перадалі памяшканьне арэндадаўцу (ААТ “Полацак-Шкловалакно”) і той павесіў на дзьверы свой замок, але ў памяшканьні засталася маёмасьць пяршоўкі СПБ.

У аддзеле прымусовага выкананьня прадстаўніку першаснай арганізацыі СПБ па-

ведамілі, што мінулы акт аб выкананьні судовага рашэньня быў адменены начальніцай Полацкага аддзелу прымусовага выкананьня Людмілай Лісавай. Падставай для адмены было тое, што, паводле загаду абласнога эканамічнага суду, даўжнік мусіць зрабіць захады па вызваленьні памяшканьня ад маёмасьці.

"Калі памяшканьне ня будзе вызваленае ад маёмасьці, незалежна ад таго, хто ягоны ўласьнік, справа можа быць зноў накіраваная ў суд. І ўжо суд вырашыць, што рабіць з маёмасьцю. Суд можа дазволіць арэндадаўцу самому распарадзіцца гэтай маёмасьцю", – патлумачыў судовы выканаўца Антон Лашкевіч.

У сваю чаргу **старшыня СПБ Мікола Шарах** кажа, што ўсе магчымыя захады па вызваленьні памяшканьня ад маёмасьці ўжо былі зробленыя.

"Мы, як юрыдычная асоба "Свабодны прафсаюз Беларускі", зрабілі ўсе магчымыя паводле Статуту СПБ захады. Зьвярнуліся ў першасную арганізацыю з просьбай забраць маёмасьць. Але загадаць пяршоўцы, як трэба распараджацца яе маёмасьцю, мы ня маем права", – сказаў Мікола Шарах.

СПБ прапануе вырашыць пытаньне аб маёмасьці беспасярэдне з Першаснай арганізацыяй працаўнікоў ААТ "Полацак-Шкловалакно". Але гендырэктар прадпрыемства Алег Курылін не жадае ўступаць у перамовы са Свабодным прафсаюзам, прынамсі да таго часу, пакуль "на ўласныя вочы не пабачыць канкрэтнага працаўніка "Полацак-Шкловалакно", які зьяўляецца сябрам СПБ".

**09.08.2019** Міліцыя Воршы двойчы штрафавала на вакзале чалавека, якога там не было. Мужчына даведаўся, што аштрафаваны за "расьпіцьцё алькаголю" на аршанскім вакзале толькі тады, калі ў дачыненьні да яго распачалі выканаўчае справаводзтва. Паведаміў у пракуратуру, што проста фізычна ня мог учыніць правапарушэньне, бо знаходзіўся на момант складаньня пратаколу за паўтысячы кілямэтраў ад Воршы.

Як паведамілі ў пракуратуры Віцебскай вобласьці, са скаргай у ведамства зьвярнуўся жыхар Берасьцейшчыны, якога суд Аршанскага раёну прыцягнуў да адміністрацыйнай адказнасьці за паўторнае цягам году знаходжаньне ў стане алькагольнага ап'яненьня ў грамадзкім месцы (ч.3 арт.17.3 КаАП РБ). Падставай для спагнаньня быў пратакол, складзены на чыгуначным вакзале Воршы супрацоўнікамі аршанскай транспартнай міліцыі.

У скарзе мужчына сьцьвярджаў, што ён ніяк ня мог учыніць гэтае правапарушэньне, бо ў час, які быў пазначаны ў пратаколе, знаходзіўся на працоўным месцы ў Берасьцейскай вобласьці.

Паведаміў, што справа разглядалася безь яго, а пра тое, што яго прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасьці, даведаўся толькі ад судовых выканаўцаў.

Пракурорская праверка выявіла, што грамадзянін сапраўды ня мог знаходзіцца ў час, пазначаны ў пастанове, на чыгуначным вакзале Воршы, бо ў той дзень не пакідаў межаў Берасьцейскай вобласьці. Гэта пацьвердзілі зьвесткі яго тэлефонных злучэньняў і дакумэнты, атрыманыя зь месца працы мужчыны.

Больш таго, мужчыну прыцягнулі незаконна да адміністрацыйнай адказнасьці за расьпіцьцё піва на вакзале і ў першы раз (ч.1 арт.17.3 КаАП) – яго ў той час (у той самы дзень) і на тым месцы не магло быць проста фізычна.

Пракуратура Віцебскай вобласьці апратэставала пастанову суду Аршанскага раё-

ну і г.Воршы, пратэст быў задаволены Віцебскім абласным судом. Таксама пракуратура адмяніла ў парадку нагляду пастанову Аршанскага аддзелу УС на транспарце, а начальніку аддзелу накіравала даручэньне аб правядзеньні службовай праверкі па выяўленых фактах.

**18.08.2019** У дачыненьні да віцяблянкі **Надзеі Куканос** 9 жніўня ўжылі амністыю. Пасьля 4-х месяцаў знаходжаньня ў СІЗА яна была вызваленая з-пад варты ў залі суду. Але раптам жанчына абскардзіла судовую пастанову, папрасіла адмяніць ужытую да яе амністыю ды накіраваць справу на новы разгляд…

Надзея Куканос была затрыманая ў Віцебску 11 красавіка 2019 году, правяла 4 месяцы ў СІЗА і 9 жніўня была вызваленая з-пад варты ў залі суду Першамайскага раёну – у дачыненьні да яе ўжылі "Закон аб амністыі". Судаводзтва па крымінальнай справе было спыненае.

Але 18 жніўня Надзея Куканос накіравала ў суд Першамайскага раёну Віцебску прыватную скаргу, у якой просіць пастанову суду ад 9 жніўня адмяніць, а крымінальную справу накіраваць у той жа суд іншаму судзьдзі.

У скарзе яна тлумачыць, што была вымушаная згадзіцца на прымяненьне ў дачыненьні да яе акту амністыі, бо "знаходзілася ў стане моцнага душэўнага хваляваньня, баючыся за сваё жыцьцё".

"Гэта была адзіная магчымасьць не вяртацца больш у СІЗА-2 і тым самым зьберагчы сабе жыцьцё і здароўе", – піша ў скарзе Куканос.

Перад гэтым Надзея хадайнічала на судзе аб зьмяненьні меры стрыманьня на падпіску аб нявыезьдзе, але суд у хадайніцтве адмовіў.

Віцяблянка сьцьвярджае, што ў парушэньне арт. 11 КПК яна ўтрымлівалася пад вартай ва ўмовах, якія былі небясьпечныя для яе жыцьця і здароўя. Зьведала ў сьледчым ізалятары гвалт, бязьлітаснасьць і абыходжаньне, якое зьняважала яе чалавечую годнасьць.

"Да наступнага судовага паседжаньня я магла папросту не дажыць – мяне б забілі ў СІЗА-2", – сьцьвярджае Надзея Куканос.

Паводле жанчыны, у СІЗА яна правяла 75 сутак у карцэры, двойчы абвяшчала галадоўку. "Віцебскай вясьне" яна расказала, што за 4 месяцы ў СІЗА ніводнага разу не пабачыла мяса, яе зьбівалі і цкавалі сабакамі.

"Насамрэч мае намеры былі іншымі: я была і застаюся зацікаўленая ў судовым разборы, таму што ніякага злачынства не ўчыняла, а крымінальную справу лічу сфабрыкаванай, што і спадзявалася даказаць у судзе", – піша ў скарзе.

Куканос просіць адмяніць пастанову суду Першамайскага раёну, згодна зь якой яна была вызваленая ад крымінальнай адказнасьці са зьняцьцем судзімасьці і скасаваньнем справы на падставе "Закона аб амністыі" і накіраваць справу на новы разгляд.

Супраць Надзеі Куканос былі заведзеныя аж тры крымінальныя справы за заведама ілжывыя даносы аб учыненьні злачынстваў (ч.2 арт.400 КК), якія пазьней былі аб'яднаныя ў адно справаводзтва. Пацярпелымі выступалі супрацоўнікі міліцыі і сьледчыя, якіх віцяблянка быццам бы абылгала. Жанчыне пагражала да 5 гадоў зьняволеньня.

## Маніторынг судовых працэсаў




**05.09.2018** Судзьдзя віцебскага раённага суду Міхаіл Зубеня прысудзіў 12 базавых велічыняў (294 рублі) штрафу віцебскай **актывістцы аргкамітэту партыі "Беларуская хрысьціянская дэмакратыя" Алене Янушкоўскай**.

Паралельна ў Першамайскім судзе Віцебску праходзілі працэсы над іншымі актывісткамі БХД. Усе яны бралі ўдзел 8 жніўня ў так званай варце каля рэстарана "Паедзем паядзім", што ў Курапатах.

Зь Менску па дарозе дадому Янушкоўская была затрыманая і дастаўленая ў Бараўлянскі пастарунак, дзе на яе склалі пратакол. Актывістцы паставілі ў віну тое, што яна, паводле словаў судзьдзі, "дэманстратыўна стаяла каля брамы рэстарана "Паедзем паядзім" зь бел-чырвона-белым сьцягам", чым, на думку аўтараў пратаколу, "публічна выказвала сваё стаўленьне да функцыянаваньня гэтага рэстарана" і, такім чынам, парушыла частку 1 артыкул3 23.34 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі або правядзеньня масавых мерапрыемстваў).

На судовае паседжаньне Алена не змагла прыйсьці, а таму адміністрацыйная справа разьбіралася вельмі хутка. Судзьдзі спатрэбілася ўсяго 15 хвілін, каб разабрацца ва ўсіх матэрыялах (пратакол затрыманьня, пратаколы апытаньня сьведкаўміліцыянтаў, рапарты), прагледзець відэазапіс, азнаёміцца з заявай актывісткі аб прычынах няяўкі.

Адметна, што Алена адсутнічала на працэсе, а судзьдзя асабіста зь ёй не знаёмы і ніколі не бачыў у вочы, таму ў прысутных у залі ўзьнікла пытаньне: як судзьдзя мог яе ідэнтыфікаваць на відэазапісы. Але Зубеня ніяк не пракамэнтаваў прагледжанае відэа.

На судзе павінны былі яшчэ выступіць сьведкі-міліцыянты Міхалевіч і Новік, але яны таксама не зьявіліся, спаслаўшыся на немагчымасьць прыехаць зь Менску.

**05.09.2018** Суд Першамайскага раёну Віцебску за пікетаваньне рэстарацыі "Паедзем паядзім" аштрафаваў 5 верасьня дзьвюх **віцебскіх актывістак аргкамітэту партыі БХД Ірыну Захараву** і **Тацяну Севярынец**.

Адміністрацыйны працэс у дачыненьні да Ірыны Захаравай вёў судзьдзя Міхаіл Юрчанка. На пачатку разгляду справы ён забараніў весьці відэафіксацыю, размаўляць ды заклікаў прысутных прытрымлівацца парадку вядзеньня судовага паседжаньня, хаця відавочных падставаў для таго не было.

Ірына Захарава ў суд не зьявілася, а ў залі прысутнічалі двое цікаўных ды парачка




людзей ў цывільным з выразнай службовай прыналежнасьцю. Не зважаючы на адсутнасьць Ірыны Захаравай, суд вырашыў разглядаць справу безь яе ўдзелу. Сьведкі (супрацоўнікі міліцыі Міхалевіч ды Новік), заяўленыя да ўдзелу ў працэсе, у суд таксама не зьявіліся ў сувязі са службовымі акалічнасьцямі.

Згодна з пратаколам, складзеным міліцыяй, актывістка, якая ўдзельнічала ў "Курапацкай варце", 8 жніўня на тэрыторыі Менскага раёну ля рэстарацыі "Паедзем паядзім" зьдзейсьніла правапарушэньне, прадугледжанае артыкулам 23.34 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі або правядзеньня масавых мерапрыемстваў). Маўляў, пікетаваньне, у якім Ірына Захарава нібыта брала актыўны ўдзел, было праведзенае без адпаведнага дазволу райвыканкаму Менскага раёну.

Падчас дасьледаваньня доказаў, якія зьмяшчаліся ў матэрыялах справы, судзьдзя Юрчанка некалькі разоў, павышаючы голас, як асноўны аргумэнт яе віны даводзіў прысутным, што актывістка трымала ў руках бел-чырвона-белы сьцяг. У часе дэманстрацыі відэафайлаў ён таксама падкрэсьліў гэта.

Дарэчы, прагляд відэа, якое на адкрытым працэсе мусіць бачыць кожны з прысутных, напачатку быў даступны толькі судзьдзі ды сакратарцы. **Праваабаронца Павал Левінаў** зьвярнуў на гэты момант увагу судзьдзі, але той адмовіў праваабаронцу ў задавальненьні яго прашэньня на той падставе, што ён не зьяўляецца ўдзельнікам працэсу. На знак пратэсту Левінаў пакінуў судовую залю.

Пасьля сыходу праваабаронцы судзьдзя Юрчанка на хвіліну павярнуў манітор у бок прысутных і зрабіў некалькі заўвагаў наконт Ірыны Захаравай. І ўрэшце прызнаў дастатковымі пададзеныя ў суд доказы яе віны ды прысудзіў актывістцы БХД 13 базавых велічыняў (318,5 рубля) штрафу.

Разгляд справы Тацяны Севярынец таксама адбыўся безь яе ўдзелу і амаль люстэркава нагадваў першы адміністрацыйны працэс. Тыя самыя заяўленыя сьведкі, тыя самыя абвінавачваньні, той самы штраф у 13 базавых. Адна толькі розьніца: вяла справу судзьдзя Першамайскага райсуду Натальля Карабліна.

**13.09.2019** Віцебскі абласны суд прызнаў жыхара Віцебску **Пятра Трублінскага** вінаватым у распальваньні нацыянальнай варожасьці. За разьмяшчэньне ў сацыяльнай сетцы "УКантакце" відэаролікаў нібыта экстрэмісцкага характару судзьдзя Людміла Ларына вынесла рашэньне пакараць яго двума гадамі зьняволеньня з адтэрміноўкай на адзін год.

Калі на працягу гэтага тэрміну асуджаны зьдзейсьніць якое-небудзь правапарушэньне, то яму давядзецца адбываць рэальны тэрмін.

Акрамя гэтага, Пётар Трублінскі павінен выплаціць крымінальна-прававую кампэнсацыю ў памеры 50 базавых велічынь (1125 рублёў) і 25,50 рублёў за паслугі адваката. Гэтыя грошы хлопец павінен, паводле рашэньня суду, унесьці цягам ня больш як 6-ці месяцаў пасьля набыцьця прысудам законнай моцы.

Рэчавыя доказы зь відэазапісамі па справе павінны быць зьнішчаныя.

Слуханьні па гэтай крымінальнай справе паводле артыкулу 130, частцы 1 Крымінальнага кодэксу супраць 28-гадовага супрацоўніка "Віцебскхлебпраму" распачаліся ў абласным судзе 3 верасьня. Нагодай сталі відэаролікі з Гітлерам, якія Пётар спампаваў ва "УКантакце", захаваў у тэчку на сваёй старонцы ды пакінуў у вольным доступе.

На просьбу боку абвінавачаньня, каб папярэдзіць распаўсюд экстрэмісцкага матэрыялу, працэс быў зроблены закрытым.

Пётар Трублінскі раней быў ужо пакараны за гэтыя ролікі, але ў межах адміністрацыйнай справы. 20 ліпеня Першамайскі райсуд Віцебску паводле артыкулу 17.11 КаАП (распаўсюд, выраб, захоўваньне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая зьмяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасьці ці прапагандуе такую дзейнасьць) прысудзіў яму штраф у памеры 15 базавых велічынь (367,5 рублёў).

**18.09.2019** Разгледзеўшы ў парадку нагляду скаргу віцебскага **актывіста Міколы Качурца** на рашэньне судзьдзі Ўладзімера Царыкава (суд Кастрычніцкага раёну Віцебску) ад 26 сакавіка 2018 году, старшыня абласнога суду Мікалай Хамічонак пастанавіў гэтае рашэньне скасаваць. Справа аб адміністрацыйным правапарушэньні ў дачыненьні да актывіста будзе накіраваная на новы разгляд.

Кіраўнік судовай улады вобласьці адмяніў пастанову ня толькі раённага суду, але і абласнога – туды актывіст накіроўваў скаргу на рашэньне суду першай інстанцыі, якую судзьдзя Ірына Смалякова не задаволіла.

25 сакавіка 2018 году, каб адзначыць чарговую гадавіну абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Мікола Качурэц выйшаў зь бел-чырвона-белым сьцягам да помніка князю Альгерду ў Віцебску. Яго затрымалі і зьмясьцілі ў ІЧУ да суду, які адбыўся ў наступны дзень. Згодна з адмененым цяпер судовым рашэньнем, актывіст быў прызнаны правапарушальнікам у адпаведнасьці з артыкулам 23.34 (парушэньне парадку арганізацыі або правядзеньня масавага мерапрыемства) і артыкулам 23.4 (непадпарадкаваньне законным патрабаваньням службовай асобы) КаАП ды пакараны штрафам у 30 базавых велічынь (735 рублёў). Апроч таго, было пастаноўлена канфіскаваць бел-чырвона-белы сьцяг.

Тлумачачы сваё рашэньне, Мікалай Хамічонак адзначыў, што "судовымі інстанцыямі не прыведзена ў судовых пастановах доказаў і ня дадзена належнай ацэнкі, у чым палягала арганізацыя Качурцом незаконнага масавага мерапрыемства", таму "выснова суду аб даказанасьці вінаватасьці Качурца паводле ч. 2 арт. 23.34 КаАП зьяўляецца заўчаснай", а значыць, "пастанова падлягае адмене цалкам".

Згодна з суправаджальным лістом, копія пастановы старшыні Віцебскага абласнога суду была накіраваная ня толькі актывісту, але і ў Кастрычніцкі РАУС.




У сваёй пастанове спадар Хамічонак асобна адзначыў: "Суду неабходна праверыць захаваньне органам, якое вядзе адміністрацыйны працэс, патрабаваньняў да зьместу пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэньнях у частцы кваліфікацыі учынку, які пацьвярджаецца сабранымі па справе доказамі".

**26.09.2018** Судзьдзя Віцебскага абласнога суду Сьвятлана Іванова разгледзела касацыйныя скаргі **актывістак аргкамітэту "Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі" Ірыны Захаравай** і **Тацяны Севярынец** на пастановы суду Першамайскага раёну Віцебску. За ўдзел у пікетаваньні рэстарацыі "Паедзем паядзім" 5 верасьня кожную з грамадзянак аштрафавалі на 13 базавых велічыняў (318,5 рубля).

Згодна з матэрыяламі справы, 8 жніўня Ірына Захарава ўзяла ўдзел у недазволеным пікетаваньні на тэрыторыі Менскага раёну. І Першамайскі райсуд у асобе судзьдзі Міхаіла Юрчанкі палічыў, што сваімі дзеяньнямі актывістка парушыла парадак арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў (артыкул 23.34 КаАП).

У сваёй скарзе ў абласны суд Ірына Захарава не прызнала сябе вінаватай і адзначыла, што было парушана ейнае права на абарону ў судзе.

Адстойваючы сваю пазыцыю, актывістка БХД дадала, што судовае рашэньне парушае 21-ы артыкул Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох і 35-ы артыкул Канстытуцыі, якія гарантуюць ёй свабоду сходаў, мітынгаў, дэманстрацыяў і пікетаваньняў. Зважыла яна і на тую акалічнасьць, што знаходзілася не на тэрыторыі рэстарацыі "Паедзем паядзім", а мірна і ціха стаяла на тэрыторыі мэмарыяльнага комплексу "Курапаты" зь бел-чырвона-белым сьцягам.

Рашэньне судзьдзі Сьвятланы Івановай было прадказальным: яна пакінула пастанову раённага суду бяз зьменаў, а скаргу спадарыні Ірыны без задавальненьня.

Наступнай разглядалася скарга Тацяны Севярынец. Актывістка напачатку выказала недавер як да судзьдзі Івановай, гэтак і да ўсёй судовай сыстэмы ў краіне. Сваю пазыцыю яна патлумачыла ў тым ліку і фармальным стаўленьнем судзьдзі да разгляду першай справы.

Затым спадарыня Тацяна паведаміла, што ў жніўні Камітэт па правох чалавека ААН даслаў ёй сваё рашэньне наконт скаргі па аналягічнай справе сямігадовай даўніны, згодна зь якім беларуская дзяржава парушыла ейнае права на свабоду слова і мірныя сходы. Скаржніца падкрэсьліла, што дзяржаўныя органы вымушаныя будуць ранейшыя прысуды адмяніць, а штрафы кампэнсаваць. Далучыць

да справы прадстаўленае Тацянай рашэньне Камітэту па правах чалавека ААН судзьдзя С. Іванова адмовілася.

Той факт, што пра судовы працэс скаржніцы даведаліся напярэдадні і ня мелі дастаткова часу, каб зьвярнуцца да адваката ці нават грунтоўна падрыхтавацца, Тацяна Севярынец расцаніла як дэградацыю цяперашняй судовай сыстэмы, якая мае выключна рэпрэсіўны характар.

Перад тым як вынесьці канчатковае рашэньне, судзьдзя Іванова зь цікавасьцю выслухала расказаную спадарыняй Тацянай гісторыю правапарушэньняў падчас будаўніцтва ў ахоўнай зоне Курапатаў сумнавядомай рэстарацыі. Але ні гэтая гісторыя, ні довады скаржніцы на канчатковае рашэньне не паўплывалі. Аргумэнтацыя простая: па дазвол на пікетаваньне не зьярталіся – значыць парушылі заканадаўства. Як той казаў, без паперы няма веры.

Скаргу Тацяны Севярынец судзьдзя не задаволіла, а рашэньне Першамайскага райсуду Віцебску пакінула ў сіле.

**10.10.2018** У Віцебскім абласным судзе разглядалася касацыйная скарга **сяброўкі аргкамітэту "Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі" Алены Янушкоўскай**. Актывістка аспрэчвала рашэньне суду Віцебскага раёну, які 5 верасьня аштрафаваў яе на 12 базавых велічыняў (294 рублі) за ўдзел у недазволеным уладамі пікеце.

Касацыйную скаргу разглядала Сьвятлана Іванова. Двума тыднямі раней гэтая судзьдзя абласнога суду пакінула ў сіле пастановы суду Першамайскага раёну Віцебску, якія спрабавалі аспрэчыць **актывісткі БХД Ірына Захарава** і **Тацяна Севярынец**. Яны таксама абвінавачваліся ў арганізацыі несанкцыянаванага пікету 5 верасьня ля злашчаснай рэстарацыі.

Не зважаючы на тое, што Алена Янушкоўская выказала недавер судзьдзі і ўсёй судовай сыстэме, прадстаўніца Фэміды ў аблсудзе працягнула разгляд скаргі.

У скарзе спадарыня Янушкоўская пазначыла, што было парушанае яе права на абарону, а яна сама не магла прысутнічаць на разглядзе справы судом першай інстанцыі, бо на той дзень у яе былі набытыя квіткі па шэнгенскай візе. Таму, паводле скаржніцы, пастанова раённага суду ў дачыненьні да яе мусіць быць адмененая.

Аргумэнтуючы сваю пазыцыю, Алена Янушкоўская даводзіла судзьдзі Івановай, што знаходзілася не на тэрыторыі рэстарацыі, а на тэрыторыі мэмарыяльнага комплексу, дзе пахаваныя ахвяры НКВД часоў сталінскіх рэпрэсіяў, а на наведваньне могілак ня трэба браць дазволу ва ўладаў:

Алена Янушкоўская прадставіла судзьдзі Івановай дакумэнтальныя сьведчаньні (візу і квіток), якія пацьвердзілі, што яна не магла прысутнічаць на судовым працэсе 5 верасьня. Актывістка прасіла суд Віцебскага раёну перанесьці разгляд справы, але яе просьба была праігнараваная, і суд адбыўся без яе ўдзелу.

Суд аргумэнтацыю скаржніцы выслухаў, дакумэнтальныя сьведчаньні ўзяў пад увагу, але на канчатковае рашэньне гэта не паўплывала. Судзьдзя Іванова пакінула пастанову раённага суду бязь зьменаў, а скаргу Алены Янушкоўскай без задавальненьня.

**17.10.2018** Савет вэтэранаў вайны і працы ААТ "Полацак-Шкловалакно" абвінавацію **актывіста СПБ Віктара Стукава**, што той перашкаджаў дзейнасьці арганізацыі. Актывіст даводзіў у судзе, што прыйшоў туды па сямейным пытаньні, а "перашкодзіў" тым, што папрасіў кнігу заўваг і прапаноў.

Справа дайшла да суду з ініцыятывы старшыні савету Веры Дзьмітрыевай. Хоць першым міліцыю выклікаў прафсаюзны актывіст.

"Я прыйшоў у Савет вэтэранаў, каб даведацца пра абавязкі арганізацыі і магчымасьці дапамогі: у мяне памерла цешча, яна была вэтэранам працы, – расказаў Стукаў.– Як высьветлілася, у савеце не адсочваюць лёс былых работнікаў. Таму я папрасіў кнігу заўваг і прапанаваў, каб запісаць сваю ідэю: стварыць службу маніторынгу па месцы жыхарства. Але мне адмовілі. А назаўтра проста не пусьцілі ў габінэт – выштурхнулі за дзьверы са словамі: "Выйдзіце прэч, вы тут ніхто". Тады я выклікаў міліцыю".

Заяву пра "хуліганскія паводзіны" актывіста незалежнага прафсаюзу падпісалі больш за 10 чалавек. Як высьветлілася на судзе, палова зь іх не прачытала, што падпісвае. Але яны сьведчылі ў адзін голас, што Стукаў "ствараў канфліктную і нэрвовую абстаноўку, чым перашкаджаў і замінаў працы Савету вэтэранаў. І старшыня савету нават сымулявала выклік міліцыі, каб яго "напалохаць".

Вера Дзьмітрыева пацьвердзіла ў судзе, што не давала Віктару Стукаву кнігу скаргаў, і рабіла гэта сьвядома. На яе думку, ад актывіста СПБ заўжды варта чакаць нейкага падвоху. Прыкладам, некалькі гадоў таму ён сам падаў заяву на ўступленьне ў арганізацыю вэтэранаў працы. Стукаў мае амаль 30 гадоў стажу на ААТ "Полацак-Шкловалакно", і яго амаль што прынялі, нават узялі ўнёскі. Але высьветлілі, што ён прафсаюзны лідэр, і таму "ня мае маральнага права быць вэтэранам працы".

Сьведкай верасьнёўскага здарэньня была і жонка Віктара Стукава: яны разам прыходзілі ў савет вэтэранскай арганізацыі. Аднак судзьдзя Віталь Лабко не паверыў, што канфліктных паводзінаў з боку яе мужа не было. І прысудзіў Віктару Стукаву штраф памерам 7 базавых велічынь (171,5 руб).

**09.11.2018** Дзьве маладыя сям'і з Воршы выйгралі суд у міліцыянтаў. Яны змаглі даказаць, што не абражалі супрацоўнікаў РАУС і не ўчынялі ім непадпарадкаваньня падчас затрыманьня. Зрэшты, кампэнсацыю за маральную шкоду яны не атрымалі, хоць патрабавалі.

Гісторыя адбылася 20 чэрвеня 2017 году. Дзьве пары, усім ужо за трыццаць – **Марыя** і **Іван Сухаваравы**, а таксама **Арцём Гатоўскі** і **Вольга Ваяводзкая** – разам сьвяткавалі заручыны. Праз тры дні Арцём і Вольга меліся расьпісацца. Для абаіх гэта другі шлюб, ад першага ў кожнага ёсьць па дзіцяці.

На стале, вядома, было сьпіртное, але ніхто не злоўжываў, бо на сьвяце прысутнічалі дзеці. Недзе а дзесятай гадзіне вечара кампанія сабралася па дамох. Выклікалі таксоўку. Вольга Ваяводзкая пайшла ў найбліжэйшы банкамат зьняць гатоўку. Астатнія засталіся чакаць машыну.

Ля банкамата да нявесты падышоў міліцыянт. У гэты самы час да банку пад'ехала

і таксоўка з астатнімі. Спачатку Іван Сухавараў, а пасьля і Арцём Гатоўскі пайшлі высьвятляць, што здарылася. Неўзабаве да банкамата падышлі яшчэ двое міліцыянтаў, а затым яшчэ адзін, які сядзеў побач у машыне.

У выніку Вольгу, Івана і Арцёма затрымалі і на службовых аўтамабілях даставілі ў РАУС. Марыя Сухаварава засталася ў таксоўцы зь дзецьмі. Пазьней яна сама паехала ў міліцыю.

"Было зьверскае затрыманьне. Нашых мужчын залілі газам і закавалі ў кайданкі. Адвезьлі ў пастарунак. Жаніх і нявеста, зьбітыя, ноч правялі на "мыйцы" [у выцьвярэзьніку], мужа і мяне адпусьцілі", – распавяла Марыя Сухаварава.

Наступнага дня адбыўся суд. На працэсе міліцыянты казалі, што нявеста была п'яная і мела неахайны выгляд, падчас хады яна хісталася з боку ў бок, таму яе хацелі даставіць у пастарунак для разбору, але яна адмовілася, "размахвала рукамі і нагамі", а таксама "драпалася пазногцямі".

Тыя, што заступіліся за нявесту, паводле міліцыянтаў, таксама былі п'яныя і парушалі грамадзкі парадак. У прыватнасьці, Іван Сухавараў "выказваў абразьлівыя словы, размахваў рукамі, хапаўся за форменнае абмундзіраваньне, учыніў бойку з супрацоўнікамі міліцыі". Арцём Гатоўскі "спрабаваў зьдзейсьніць кідок супрацоўнікаў міліцыі на зямлю, біў нагамі па службовым аўтамабілі".

Ужываньне спэцсродкаў і фізычнай сілы ў дачыненьні да маладых людзей міліцыянты патлумачылі іх непадпарадкаваньнем.

Затрыманыя на судзе сьцьвярджалі, што не абражалі міліцыянтаў і не парушалі грамадзкага парадку. Але суд заняў бок міліцыянтаў.

Арцёму Гатоўскаму і Івану Сухавараву далі штрафы па 529 рублёў за абразу і непадпарадкаваньне (арт. 23.4 і 23.5 КаАП), Вользе Ваяводскай – 69 рублёў за непадпарадкаваньне (арт. 23.4 КаАП). На Марыю Сухавараву пазьней склалі пратакол за парушэньне правілаў дарожнага руху. Паводле міліцыянтаў, яна хадзіла па дарозе, а не па ходніках.

Маладыя людзі абскардзілі гэтае рашэньне ў абласным судзе. Ён адмяніў штрафы і накіраваў справу на новы разгляд. Яна разглядалася паўторна 21 верасьня 2017 году.

На гэтым працэсе прагледзелі відэазапіс з камэр назіраньня банка. Ён не пацьвердзіў паказаньняў міліцыянтаў.

Прыкладам, на запісе бачна, што Вольга Ваяводзкая (якая на той момант ужо зьмяніла прозьвішча на Гатоўская) па дарозе да банкамата ідзе роўна, звычайнай хадой. Фактычна адзіны крок у бок яна патлумачыла "рамонтам тратуару і яго сьлізкім пакрыцьцём пасьля дажджу".

Дарэчы, у супрацоўнікаў міліцыі на форменным абмундзіраваньні былі відэарэгістратары, і адзін зь міліцыянтаў казаў затрыманым, што ўсе іх дзеяньні фіксуюцца на відэа. Аднак на судзе высьветлілася, што відэарэгістратары ў той вечар не былі ўключаныя.

Аднак для суду цалкам дастатковым аказаўся і запіс камэраў назіраньня банка.

Прагляд гэтага запісу не пацьвердзіў паказаньняў супрацоўнікаў міліцыі – Ваяводзкая ня хісталася, Гатоўскі не спрабаваў схапіць міліцыянта за форму, а Сухавараў ня ладзіў бойку.

У выніку судзьдзя адмяніла першае рашэньне суду і спыніла адміністрацыйную справу ў сувязі "зь недаказанасьцю вінаватасьці".

"Калі б ня гэтыя запісы, мы не змаглі б нічога аспрэчыць", – адзначыла Марыя Сухаварава.

Яе справа аб парушэньні правілаў дарожнага руху таксама было спыненая з прычыны таго, што "віна не пацьвярджаецца аб'ектыўнымі прыкметамі".

Аднавіўшы справядлівасьць, пацярпелыя ад міліцэйскага бязьмежжа вырашылі дамагацца матэрыяльнай кампэнсацыі маральнай шкоды і падалі пазоў у суд.

Іван Сухавараў ў сваёй заяве пазначыў, што "маральная шкода ад неправамерных дзеяньняў Аршанскага РУУС палягае ў перанесеных маральных і фізычных пакутах, у пачуцьці страху за жыцьцё і здароўе, пачуцьці прыніжэньня і бездапаможнасьці". Ён таксама заявіў, што зьведаў "глыбокае ўзрушэньні і шок", адчувае "страх немагчымасьці працягваць актыўнае грамадзкае жыцьцё" і папрасіў выплаціць яму 20 тысяч рублёў.

Аднак судзьдзя адмовіў у задавальненьні пазову.

"Ня хочуць прызнаваць, што мы пацярпелі, хоць штрафы нам зьнятыя, а ў дзеяньнях супрацоўнікаў відавочна бачныя парушэньні. У Воршы гэта не адзіны выпадак, бязьмежжа дзеецца сур'ёзнае", – распавяла Марыя Сухаварава.

**12.11.2018** Зьвярнуўшыся ў Вярхоўны суд, віцябчук **Андрусь Кешанюк** дамогся вяртаньня яму бел-чырвона-белага сьцяга, канфіскаванага згодна з пастановай па распачатай супраць яго адміністрацыйнай справе. Астатняя частка пастановы старшынём Вярхоўнага суду пакінутая бязь зьменаў.

Падзея, якая спрычынілася да судовага разбору ў дачыненьні да грамадзкага актывіста, адбылася наступнага дня пасьля стогадовага юбілею Беларускай Народнай Рэспублікі. Андрусь Кешанюк вырашыў павіншаваць супрацоўнікаў віцебскага Белтэлекаму з гэтай важнай для беларускай нацыі датай. З раніцы 26 сакавіка ён чакаў сваіх былых калегаў ля ўваходу ў будынак прадпрыемства. Як мае быць, у руках ён трымаў бел-чырвона-белы сьцяг. Павіншаваць як сьлед не атрымалася. Неўзабаве актывіста затрымалі.

На думку праваахоўнікаў, сваімі дзеяньнямі ён парушыў закон аб масавых мерапрыемствах, ды яшчэ не падпарадкаваўся законным патрабаваньням міліцыянтаў. Пастановай судзьдзі Першамайскага райсуду Віцебску Андрусь быў аштрафаваны на 4 базавыя велічыні (98 рублёў) паводле часткі 1 артыкулу 23.34 КаАП і на 6 базавых (147 рублёў) паводле артыкулу 23.4. Агульная сума штрафу склала 245 рублёў. Сьцяг і дрэўка былі канфіскаваныя.

18 красавіка абласны суд, у якім Андрусь Кешанюк аспрэчваў рашэньне раённага суду, пакінуў адміністрацыйнае спагнаньне бяз зьменаў.

У пошуках справядлівасьці віцебскі актывіст дайшоў да Вярхоўнага суду. Старшы-




ня Вярхоўнага суду Валянцін Сукала разгледзеў у парадку нагляду адміністрацыйную справу Андруся Кешанюка і пастанавіў выключыць з рашэньняў суду Першамайскага раёну Віцебску і Віцебскага абласнога суду згадку пра канфіскацыю рэчавых доказаў. Бо такое адміністрацыйнае спагнаньне не прадугледжанае ніводным з артыкулаў, паводле якіх актывіст быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці.

**19.11.2018** Суд Полацкага раёну вынес рашэньне абмежаваць свабоду **Зьмітра Русака** на 2 гады. Да хатняй хіміі жыхар гарадзкога пасёлку Ветрына прысуджаны за заведама фальшывае паведамленьне ў інтэрнэце пра бомбу, нібыта закладзеную ў гандлёвым цэнтры ў Полацку, і абразу прэзыдэнта.

Злачынствы, вызначаныя артыкуламі Крымінальнага кодэксу 340 (фальшывае паведамленьне аб падрыхтоўцы выбуху) і 368 (публічная абраза прэзыдэнта), былі зьдзейсьненыя 1 траўня 2018 году. Наступнага дня Зьмітра Русака затрымалі, і ён правёў тры дні ў ізалятары часовага ўтрыманьня Полацкага РАУС. Прычым абвінавачваньне пра абразу прэзыдэнта зьявілася толькі праз 4 месяцы пасьля падзеі.

У судовым паседжаньні, якое вёў выканальнік абавязкаў намесьніка старшыні суду па крымінальных справах судзьдзя Лапко Віталь Алесевіч, акалічнасьці злачынства вывучаліся цягам трох гадзін. У разборы справы бралі ўдзел старшы памочнік пракурора Полацкага раёну Ігар Галаўкоў і адвакатка Іна Шніткова.

Падзеі, якія спрычыніліся да распачынаньня крымінальнай справы здарыліся 1 траўня, у Сусьветны дзень салідарнасьці працоўных. Група грамадзян Расеі і Беларусі зладзілі пікнік з шашлыкамі на лецішчы расейскага грамадзяніна ў беларускім пасёлку Ветрына. Вяліся звычайныя размовы пра палітыку і грамадзянскія правы ў розных краінах. Беларус Зьміцер Русак вырашыў даказаць расейцам, што ў Беларусі сілавыя структуры не адсочваюць допісы ў сацыяльных сетках.

Каб пацьвердзіць уласныя словы, Зьміцер праз тэлефон разьмясьціў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы "УКантакце" паведамленьне пра нібыта падрыхтоўку выбуху ў гандлёвым цэнтры "Манэж" у Полацку: "Я рыхтаваў бомбу. Будзе тэракт у Полацку. У манэжы".

Апроч паведамленьня пра выбух, допіс Зьмітра нібыта ўтрымліваў яшчэ і абразу нейкай асобы: "Я ненавіджу ЛУКАШАНКУ. Ён – "абразьлівае слова"", – зачытаў судзьдзя Лапко з матэрыялаў справы.

Абражанай асобай суд палічыў прэзыдэнта Беларусі. Абразьлівае слова так і не

было агучанае. Судзьдзя Лапко задаў пытаньне падазраванаму: "Ці лічыце Вы слова "гомасэксуаліст" абразай?" Зьміцер Русак адказаў, што не, ня лічыць гэтае слова абразай. Таксама ён сказаў, што ня меў на ўвазе прэзыдэнта Беларусі ЛУКАШЭНКУ, што раскайваецца ў сваім непрадуманым ўчынку, але вінаватым сябе не прызнае. Дарэчы, лінгвістычная экспэртыза таксама прыйшла да высновы, што з паведамленьня не вынікае, што яно тычыцца прэзыдэнта Беларусі.

У вялікай залі №3 суду Полацкага раёну сабраліся сябры падсуднага. Прыйшлі ягоныя бацькі. Прысутнічалі яшчэ чацьвёра грамадзян, якія не былі ўдзельнікамі працэсу.

Падчас судовага разбору апыталі дваіх сьведак: грамадзянку Расеі з Санкт-Пецярбургу Марыю Назараву і міліцыянта Полацкага РАУС. Паказаньні астатніх трох сьведкаў, што праходзілі па справе, зачытваліся, бо яны не змаглі прысутнічаць з паважных прычынаў.

Адвакат юрыдычнай кансультацыі Полацку Іна Шніткова прасіла цалкам апраўдаць яе кліента. Аднак суд вынес рашэньне акурат такое, якога вымагаў пракурор: абмежаваньне волі на два гады без накіраваньня ў калёнію і канфіскацыя тэлефона як сродку злачынства. Пры гэтым суд улічыў зьмякчальныя акалічнасьці: здароўе абвінавачанага, станоўчыя характарыстыкі з працы, раскаяньне і яўку з павіннай, адсутнасьць судзімасьці.

Зьміцер быў прызнаны ў злачынстве па абодвух высунутых супраць яго артыкулах Крымінальнага кодэксу: 340 – заведама фальшывае паведамленьне аб небясьпецы і 368 – публічная абраза прэзыдэнта.

**21.11.2018** Віцебскі абласны суд прызнаў **прафсаюзнага актывіста** з Полацку **Віктара Стукава** вінаватым у перашкодзе дзейнасьці вэтэранскай арганізацыі ААТ "Полацак-Шкловалакно". Судзьдзя Ірына Смалякова, аднаасобна разглядзеўшы скаргу актывіста, вырашыла пакінуць ранейшую пастанову Полацкага суду ў сіле. Прафсаюзьнік павінен выплаціць штраф у 7 базавых на працягу месяца.

Віктар Стукаў ў сваёй скарзе адзначыў, што суд Полацкага раёну і гораду Полацку дасьледаваў матэрыялы адміністрацыйнай справы няпоўна, аднабакова і неаб'ектыўна. Старшыня савету вэтэранаў Вера Дзьмітрыева, якая абвінаваціла прафсаюзьніка, сама была прыцягнутая да адказнасьці за нявыдачу кнігі заўвагаў. Як мяркуе Віктар, сустрэчнае абвінавачаньне з боку вэтэранаў было высунутае на патрабаваньне адміністрацыі ААТ "Полацак-Шкловалакно".

Разгляд скаргі ў Віцебскім аблсудзе доўжыўся 19 хвілін. Выслухаўшы довады прафсаюзнага актывіста, судзьдзя манатонна зачытала ўжо гатовае рашэньне: "Пастанову Полацкага суду пакінуць бязь зьменаў, а скаргу – без задавальненьня".

**29.01.2019** Эканамічны суд Віцебскай вобласьці скончыў разгляд пазову ААТ "Полацак-Шкловалакно" да Свабоднага прафсаюзу Беларускага і прыняў прадказальнае рашэньне. У сувязі са сканчэньнем тэрміну арэнды суд абавязаў адказчыка (СПБ) вярнуць уласьніку арэндаванае ў яго памяшканьне (г. Полацак, вуліца Ўсьпенская, 3).

Як і ў папярэднім судовым паседжаньні, інтарэсы прадпрыемства адстойвалі выканальніца абавязкаў начальніка бюро па кіраваньні маёмасьцю Вольга Малахоўская ды юрысконсульт Аляксандра Фаміна. Адказчыкам гэтым разам акрамя **кіраўніка СПБ Міколы Шараха** ў судзе выступіў і **актывіст пяршоўкі "Шкловалакна" Віктар Стукаў**.

Прадстаўнікі прафсаюзу заявілі хадайніцтва аб спыненьні судовага разгляду ў сувязі са знаходжаньнем справы па-за кампэтэнцыяй эканамічнага суду. На той падставе, што бакі канфлікту знаходзяцца ў стане сацыяльнага партнэрства, а не эканамічных ці гаспадарчых дачыненьняў, прадстаўнік пяршоўкі Віктар Стукаў прапанаваў эканамічнаму суду адмовіцца ад разгляду справы. Таксама ён выказаў жаданьне, каб суд рэкамэндаваў заяўніку вырашыць працоўную спрэчку ў межах калектыўнай дамовы ці ў працоўным арбітражы. Судзьдзя Анатоль Гурэеў у задавальненьні хадайніцтва адмовіў, хаця і далучыў яго да справы.

Юрыстка "Шкловалакна" ў сваёй прамове даводзіла, што эканамічны суд мае права прыняць рашэньне па справе. Маўляў, у яго кампэтэнцыю ўваходзіць разгляд справаў, зьвязаных з гаспадарчымі, эканамічнымі спрэчкамі, і справаў, датычных да прадпрымальніцкай ды іншай гаспадарчай і эканамічнай дзейнасьці.

Аляксандра Фаміна палічыла дастатковым для абгрунтаваньня звароту ў эканамічны суд таго факту, што пазоўнік, перадаючы памяшканьне ў арэнду, вядзе гаспадарчую дзейнасьць, а прафсаюз пры тым зьяўляецца юрыдычнай асобай. Тую акалічнасьць, што другі суб'ект канфлікту (СПБ) ніякай гаспадарчай ці эканамічнай дзейнасьці не вядзе, узяць пад увагу не палічылі неабходным ані суд, ані юрыст прадпрыемства.

Не прамінула Аляксандра Фаміна нагадаць і тое, што, зь меркаваньня наймальніка, калектыўная працоўная спрэчка паміж пазоўнікам і адказчыкам на цяперашні момант адсутнічае. А калі няма спрэчкі, то і кіравацца пры вырашэньні канфлікту калектыўнай дамовай не выпадае.

У сваіх пярэчаньнях на довады пазоўніка старшыня СПБ Мікола Шарах нагадаў, што суполка СПБ дзейнічае на прадпрыемстве з 1999 году. У самым пачатку дачыненьняў паміж прафсаюзам і наймальнікам праблемы вырашаліся больш-менш прымальна. Апошнім жа часам наймальнік пачаў аспрэчваць наяўнасьць прафсаюзу на прадпрыемстве на той падставе, што працоўныя спынілі пералічэньне ўнёскаў праз бухгальтэрыю. Тое, што ўнёскі здаюцца гатоўкай, пацьвердзіла перададзеная суду плацёжная ведамасьць аб пералічэньні сродкаў на рахунак прафсаюзу. Для кіраўніцтва прадпрыемства гэты факт, аднак, не зьяўляецца пераканаўчым, і "Шкловалакно" не заключае калектыўнай дамовы з СПБ і не здае бясплатна памяшканьне пад офіс, як у выпадку з афіцыйным прафсаюзам. Гэткім чынам, паводле прафсаюзнага лідэра, наймальнік парушае 45-ы і 49-ы пункты Генэральнага пагадненьня.

Мікола Шарах таксама зьвярнуў увагу суду на тое, што наймальнік не выконвае нормы сацыяльнага партнэрства, адыходзіць ад выкананьня Генэральнай дамовы, парушае правы працаўнікоў аб’ядноўвацца ў прафэсійныя саюзы, перашкаджае законнай дзейнасьці прафсаюзу, ігнаруе любыя захады з боку СПБ для вырашэньня канфлікту ды выкарыстоўвае мэханізм эканамічнага суду для вырашэнь-




ня сваіх мэтаў.

У ходзе дыскусіі склалася ўражаньне, што ўдзельнікі судовага разбору існуюць у розных прававых рэаліях. Калі прадстаўнікі Свабоднага прафсаюзу Беларускага, абгрунтоўваючы сваю пазыцыю, спасылаліся на нормы міжнароднага права ў галіне прафсаюзнай дзейнасьці, то пазоўнік міжнароднае права зусім ня згадваў.

Прынятае па справе рашэньне было прадказальным. Кіруючыся артыкуламі 190, 192, 193, 189, 201, 211 Гаспадарчага працэсуальнага кодэксу, суд задаволіў пазоўнае патрабаваньне заяўніка і абавязаў СПБ у пяцідзённы тэрмін вызваліць памяшканьне і вярнуць яго ўласьніку. Разам з тым суд спагнаў з прафсаюзу на карысьць ААТ "Полацак-Шкловалакно" пакрыцьцё выдаткаў дзяржаўнага мыта (490 рублёў).

**11.04.2019** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску разглядаліся адміністрацыйныя справы ў дачыненьні **Міколы Качурца** і братоў **Уладзімера** і **Яраслава Кійко**. Тры розныя судзьдзі сынхронна пакаралі кожнага з актывістаў штрафам у памеры 4 базавых велічыняў – за фатаграфаваньне зь бел-чырвона-белымі сьцягамі.

Актывістаў вінавацілі ў парушэньні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 23.34 КаАП). Нібыта віцябляне, фатаграфуючыся з бел-чырвона-белым сьцягам на фоне помніку Альгерду на Дзень Волі ў Віцебску, без дазволу зьдзяйсьнялі пікетаваньне. У якасьці доказаў супрацоўнікі Кастрычніцкага РАУС прыклалі да справы матэрыялы відэаздымкаў.

Разгляд усіх трох справаў быў прызначаны на адзін і той жа час 11 красавіка, і разглядалі іх тры розныя судзьдзі: Ільля Белавус – справу Уладзімера Кійко, Уладзімер Царыкаў – справу Яраслава Кійко і Сьняжана Кіндзеева – Міколы Качурца.

Як патлумачыў у судзе Мікола Качурэц, 24 сакавіка ён адзначаў вялікае сьвята – 101-я ўгодкі БНР: "Любое сьвята такога кшталту мусіць адзначацца са сьцягам. Бел-чырвона-белы сьцяг – сьцяг БНР. Лукашэнка на свае сьвяты вывешвае савецкія сьцягі, а я ўзяў з сабой БЧБ сьцяг, каб сфатаграфавацца ля помніку Альгерду і ў іншых месцах. Так я раблю кожны год. І нічога супрацьпраўнага ў сваіх дзеяньнях ня бачу".

На ўсіх трох паседжаньнях у якасьці сьведкаў з боку міліцыі выступілі адны і тыя ж супрацоўнікі Кастрычніцкага РАУС – Ярашэўскі, Карпушка, Дзятлаў. Міліцыянты ня здолелі ўцямна патлумачыць у судзе, што такое пікетаваньне і зь якой прычыны трыманьне ў руках бел-чырвона-белага сьцяга для фатаграфаваньня яны палічылі за правапарушэньне.

Пры гэтым згадзіліся, што бел-чырвона-белы сьцяг у нашай дзяржаве не знахо-

дзіцца пад забаронай.

Тым ня менш усе тры судзьдзі амаль сынхронна (з разьбежкай у 5 хвілінаў) прызналі віцяблян вінаватымі ў парушэньні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і аштрафавалі кожнага зь іх на 102 рублі (4 базавыя велічыні).

**24.04.2019** Суд Першамайскага раёну Віцебску часткова задаволіў пазоўныя патрабаваньні **Міколы Качурца**, які прасіў спагнаць з Кастрычніцкага РАУС 42 рублі за зьнішчаны ў 2018 годзе бел-чырвона-белы сьцяг. Судзьдзя Алена Савіцкая ацаніла шкоду на 8 рублёў 30 капеек.

Паводле рашэньня суду, міліцыя мусіць таксама сплаціць актывісту частку судовых выдаткаў – 42 капейкі. Агулам атрымліваецца – 8,72 рублёў. Гэтая сума будзе выплачаная з рэспубліканскага бюджэту.

На судовым паседжаньні 24 красавіка Мікола Качурэц дакумэнтальна абгрунтаваў кошт прычыненай шкоды (42 рублі). Прадаставіў суду прайс з інтэрнэт-крамы Symbal.by, дзе бел-чырвона-белы сьцяг каштуе 20 рублёў, а таксама – дакумэнты аб коштах дрэўка (палімернай трубы) і квіткоў для паездкі да Менску і назад.

Міліцыянт Дзьмітры Жук, які прадстаўляў у судзе Кастрычніцкі РАУС, заявіў, што ня згодны з запатрабаванай сумай іску. Паводле адказчыка, зьнішчаны сьцяг быў ня новы, выглядаў кепска, і яго "можна было б ацаніць на вагу рызьзя". Тым ня менш Жук папрасіў суд далучыць да справы прайсы з крамы "Сялена", дзе можна набыць тканіну белага і чырвонага колераў па цане 2,50 руб. за 1 м., а таксама – даведку ад швачкі, якая ўзялася б вырабіць падобны сьцяг за 7 рублёў.

Але аказалася, што пры вызначэньні сумы кампэнсацыі судзьдзя Алена Савіцкая кіравалася выключна лічбамі, якія суд сам атрымаў праз запыты ў віцебскі ўнівэрмаг, на швейнае прадпрыемства "Труд-Віцебск" і ў "Дом сантэхнікі". Паводле атрыманай інфармацыі, тканіну для сьцяга (0,5 м. Х 1,5 м.) можна купіць за 1,39 рубля, пашыць сьцяг – за 2,50 рубля, набыць трубу для дрэўка – за 4,41 рубля. Агулам – 8 рублёў 30 капеек.

Такім чынам, паводле падлікаў судзьдзі, кошт прычыненай шкоды за зьнішчаны бел-чырвона-белы сьцяг аказаўся нават меншы за суму, якую прапаноўваў заплаціць адказчык.

"Зразумела, што за гэтыя 8,72 рублі я не змагу ані купіць, ані пашыць новы сьцяг. Суд занізіў ягоны кошт у разоў пяць. Тым ня менш, лічу гэтае рашэньне маленькай перамогай, першым крокам у нашым змаганьні за бел-чырвона-белы сьцяг. Магчыма, такі вынік прымусіць супрацоўнікаў міліцыі задумацца перад тым, як канфіскоўваць, а потым нішчыць сьвятыні", – сказаў пасьля суду Мікола Качурэц.

Дарэчы, у судзе актывіст казаў пра тое, што незаконным было ня толькі зьнішчэньне сьцяга, але і яго канфіскацыя, бо арт. 23.34 КаАП не прадугледжвае такога пакараньня. Спасылаўся пры гэтым на афіцыйны адказ зь Вярхоўнага суду.

**29.04.2019** У Эканамічным судзе Віцебскай вобласьці прайшло слуханьне справы па заяве полацкага **актывіста Міколы Шараха** аб прызнаньні незаконнымі дзеяньняў чыноўнікаў Полацкага райвыканкаму, якія адмовіліся зарэгістраваць прыватную ўстанову "Адвакацыя". Суд стаў на бок грамадзяніна.

20 ліпеня 2018 году жыхар Полацку Мікола Шарах зьвярнуўся ў Полацкі райвыканкам па рэгістрацыю прыватнай установы "Цэнтар інфармацыйна-прававой падтрымкі сацыяльна ўразьлівых групаў насельніцтва "Адвакацыя". Працэдура рэгістрацыі простая: атрыманьне дазволу адбываецца па заяве. На сайце Міністэрства юстыцыі ёсьць пералік усіх неабходных для гэтага дакумэнтаў. Ад заяўніка патрабуецца толькі распрацаваць уласны статут. Зазвычай пытаньне рэгістрацыі вырашаецца цягам аднаго-двух дзён.

"Статут распрацаваў, усе неабходныя дакумэнты сабраў, узгадніў назву і накіраваўся ў выканкам. У выканкаме параілі прыходзіць па дазвол у панядзелак, бо ў пятніцу яны не пасьпяваюць. Прыйшоў у панядзелак забіраць пасьведчаньне аб рэгістрацыі, а мне кажуць, што заява напісаная з парушэньнямі заканадаўства – і ў рэгістрацыі адмоўлена", – распавядае Мікола Шарах.

З такім рашэньнем заяўнік не пагадзіўся і зьвярнуўся да старшыні райвыканкаму па тлумачэньні. Канкрэтнага адказу не атрымаў, таму напісаў пісьмовы зварот. У атрыманым адказе паведамлялася, што ўсё законна. Са скаргай на рашэньне Полацкага райвыканкаму зьвярнуўся ў аблвыканкам. Аблвыканкам параіў шукаць праўду ў судзе.

Судовыя слуханьні прайшлі без удзелу прадстаўніка Полацкага райвыканкаму, хаця на папярэдніх слуханьнях ён прысутнічаў. Справу разглядала судзьдзя Ірына Кавалёва.

Зь пісьмовага тлумачэньня прадстаўніка райвыканкаму вынікала, што адмова ў рэгістрацыі адбылася ў выніку вуснага звароту прадстаўніка таварыства з абмежаванай адказнасьцю "ЮТЭК-Бел" аб адмове ў прадастаўленьні Міколу Шараху юрыдычнага адрасу для ўстановы, якая рэгіструецца.

Як патлумачыў суду Мікола Шарах, у адпаведнасьці з "Палажэньнем аб дзяржрэгістрацыі", не зарэгістраваць установу могуць толькі тады, калі заяўнік не падаў усе неабходныя зьвесткі ці аформіў заявы з парушэньнем патрабаваньняў заканадаўства. На 20 ліпеня ніякіх прэтэнзіяў да яго орган, які ажыцьцяўляе рэгістрацыю, не прад'яўляў, законных падставаў для нерэгістрацыі не было.

Пасьля адмовы ў рэгістрацыі, мяркуючы, што праблемы маглі быць зьвязаныя з юрыдычным адрасам, ён зьвярнуўся па тлумачэньне ў ТАА "ЮТЭК-Бел". У пісьмовым адказе прадстаўнік таварыства, які афармляў гарантыйны ліст, запэўніў, што ліст яны не адклікалі і да іх з такой просьбай ніхто не зьвяртаўся. Праўда, ужо 9 жніўня ў дасланым лісьце паведамлялася, што ў сувязі з вытворчай неабходнасьцю "ЮТЭК-Бел" адмаўляе Міколу Шараху ў прадастаўленьні юрыдычнага адрасу. Акурат у гэты дзень Шарах быў на прыёме ў райвыканкаме, і там яму канкрэтную прычыну адмовы патлумачыць ня здолелі.

Напрыканцы судовых слуханьняў Мікола Шарах нагадаў, што дзейнасьць мясцовых органаў улады мусіць быць скіраваная на паляпшэньне жыцьця і пашырэньне дадатковых відаў паслугаў для жыхароў таго рэгіёну, якім яны кіруюць. На яго погляд, на дадзены момант даступнасьць да камэрцыйных паслугаў абмежаваная нізкім матэрыяльным узроўнем жыцьця. Найперш гэта тычыцца неабароненых групаў насельніцтва: людзей з інваліднасьцю, пэнсіянэраў, шматдзетных сем'яў.




"Магчымасьць аказаньня бясплатных паслугаў абмежаваная (студэнцкія і валянтэрскія арганізацыі, Чырвоны Крыж), таму мясцовыя органы ўлады мусяць спрыяць ініцыятыве грамадзянаў у дадзеным кірунку. Я доўгі час займаўся прафсаюзнай дзейнасьцю, маю юрыдычную адукацыю, жаданьне і магчымасьць аказваць прававыя паслугі, бо разумею, як важна для чалавека атрымліваць хаця б мінімальныя магчымасьці для абароны сваіх правоў і інтарэсаў", – тлумачыў у судзе Мікола Шарах.

Пасьля вывучэньня ўсіх матэрыялаў справы суд прызнаў незаконным адмову Полацкага райвыканкаму ў рэгістрацыі "Цэнтру інфармацыйна-прававой падтрымкі "Адвакацыя". Полацкі райвыканкам парушыў правы грамадзяніна на стварэньне арганізацыі.

**02.05.2019** Віцябляне **Ўладзімер Кійко**, **Яраслаў Кійко** і **Мікола Качурэц** былі аштрафаваныя судом Кастрычніцкага раёну Віцебску на 102 рублі кожны за фатаграфаваньне на Дзень Волі зь бел-чырвона-белым сьцягам (ч.1. арт. 23.34 КаАП РБ). Ня згодныя з такімі рашэньнямі, актывісты абскардзілі іх у абласным судзе.

Скаргі Яраслава і Ўладзімера Кійко разглядала судзьдзя Ірына Смалякова, скаргу Міколы Качурца – судзьдзя Сьвятлана Іванова.

Віцябляне адзначалі, што ў іх дзеяньнях – фатаграфаваньні з нацыянальным сьцягам – адсутнічаў склад адміністрацыйнага правапарушэньня. Прыводзілі ў скаргах шмат аргумэнтаў на карысьць таго, што гэта не было незаконным пікетаваньнем, і што дзяржава, пакараўшы іх, парушыла адразу некалькі артыкулаў Канстытуцыі РБ і Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Яраслаў Кійко падчас паседжаньня зьвярнуў увагу суду, што бел-чырвона-белы сьцяг не забаронены ў Беларусі, казаў, што судзьдзя суду Кастрычніцкага раёну Ўладзімер Царыкаў карыстаўся вельмі размытымі азначэньнямі "пікетаваньня".

Нязгоду з рашэньнем Кастрычніцкага суду выказаў і Уладзімер Кійко. Ён нагадаў, што 11 красавіка ў судзе Кастрычніцкага раёну ў розных залях адначасова разглядаліся адразу тры справы па фатаграфаваньні са сьцягам – і па ўсіх трох былі вынесеныя цалкам аднолькавыя рашэньні. У сувязі з гэтым выказаў здагадку, што паміж судзьдзямі існавала папярэдняя дамоўленасьць. Апроч таго, зазначыў, што ў пастанове судзьдзі Ільлі Белавуса ёсьць памылка, бо там сьцьвярджаецца, што Ўладзімер неаднойчы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасьці, хаця для яго гэта было ўпершыню.




Віцябляне прасілі адмяніць пастановы суду Кастрычніцкага раёну Віцебску ад 11 красавіка 2019 году, а справы аб адміністрацыйных правапарушэньнях – спыніць. Але просьбы былі не пачутыя.

Судзьдзі Ірына Смалякова і Сьвятлана Іванова пастанавілі пакінуць скаргі заяўнікаў без задавальненьня, а пастановы суду Кастрычніцкага раёну ў дачыненьні Яраслава Кійко і Міколы Качурца – бязь зьменаў. Што тычыцца пастановы ў дачыненьні Ўладзімера Кійко, судзьдзя зьмяніла яе толькі ва ўводнай частцы, дзе гаворыцца, што Кійко раней прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасьці (зьменена на "не прыцягваўся").

Перагляд справы Міколы Качурца адбыўся без ягонага ўдзелу.

**20.05.2019** Тры гады абмежаваньня свабоды з накіраваньнем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу – такі вырак быў агучаны 20 траўня ў дачыненьні віцебскага **"доктара-праўдаруба" Ігара Пастнова**. Яго прызналі вінаватым у паклёпе на пракурора гораду Віцебску Юрыя Раманоўскага. Прысуд не набыў пакуль законнай сілы.

Суд Бешанковіцкага раёну пад старшынёўствам судзьдзі Натальлі Рошчынай прызнаў вінаватым Ігара Пастнова "ў распаўсюдзе заведама ілжывых выдумак, якія ганьбяць іншую асобу (паклёп), разьмешчаных у глябальнай сетцы Інтэрнэт", і на падставе ч.2 арт. 188 КК Рэспублікі Беларусь пакараў яго абмежаваньнем свабоды на 3 гады з накіраваньнем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Паводле выраку суду, выпраўленьне абвінавачанага "магчымае толькі шляхам ускладаньня абавязкаў, якія абмяжуюць ягоную свабоду ва ўмовах ажыцьцяўленьня за ім нагляду".

"Іншыя віды пакараньняў для абвінавачанага неэфэктыўныя", – гаворыцца ў прысудзе.

Паседжаньні выязнога суду Бешанковіцкага раёну адбываліся ў Віцебску і праходзілі ў закрытым рэжыме.

Ад самага пачатку абвінавачанымі па справе аб паклёпе на пракурора Раманоўскага праходзілі два віцябляніна – Ігар Пастноў і **Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард**, але пазьней іх вытворчасьці разьдзялілі.

**10.06.2019** Суд аштрафаваў віцебскага таксіста **Алега Стральца** на 612 рублёў за тое, што той абазваў па тэлефоне свайго ўчастковага інспэктара "петушарай" і "малалеткай". Каб прызнаць віцябляніна вінаватым у абразе службовай асобы (арт. 23.5 КаАП), судзьдзі не спатрэбілася ні лінгвістычная экспэртыза, ні доказы

ў выглядзе аўдыёзапісу званку – хапіла рапарту міліцыянта…

Справа разглядалася ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску судзьдзём Сяргеем Будрэвічам. Алег Стралец сваёй віны не прызнаў, а падчас паседжаньня распавёў, што ў апорным пункце, куды ён накіраваўся пасьля тэлефоннай размовы, яго адразу паставілі тварам да сьцяны, а потым – прыкавалі кайданкамі да батарэі…

У судзе віцяблянін патлумачыў, што справа тычылася ягонай машыны, якую ў кастрычніку 2018 году пашкодзілі невядомыя. Міліцыянты, што выяжджалі на месца здарэньня, перадалі дакумэнтацыю ўчастковаму на Маскоўскі пр-т, 84, якога Стралец ніяк ня мог застаць на месцы. А званок самога ўчастковага стаў для таксоўцы неспадзяванкай. "Адпачывай далей, справу вырашылі безь цябе, з тваім працадаўцам", – паведамілі.

Агаломшаны навіной Алег Стралец паспрабаваў дазнацца, дзе ж яму цяпер узяць паперы для выплаты страхоўкі, але ў адказ пачуў: "Паперы возьмеш у туалеце, а ў нас – дакумэнты". І – кароткія гудкі.

Стралец перазваніў, папрасіў суразмоўцу назвацца, папярэдзіў, што той ня мае права так зь ім размаўляць. А потым выказаў жаданьне прыехаць пагутарыць жыўцом. Але там, на Маскоўскім, 84, на яго адразу ж начапілі кайданкі і прыкавалі да батарэі ацяпленьня.

"Я запытаўся, на якой падставе гэта робіцца. "Калі дасі мне падставу, дык магу скарыстацца табэльнай зброяй", – адказаў супрацоўнік міліцыі і адшпіліў кабуру…" – так пераказваў дыялёг, які адбыўся тады ў пастарунку, Алег Стралец.

З Маскоўскага праспэкту праз некаторы час яго адвезьлі ў Кастрычніцкі РАУС, дзе быў складзены пратакол паводле артыкулу 23.5 КаАП РБ (Абраза службовай асобы пры выкананьні ёй службовых паўнамоцтваў).

Алег Стралец сьцьвярджаў у судзе, што нікога па тэлефоне не абражаў і што супрацоўнік міліцыі ўцямна так і не прадставіўся…

Паводле ж рапарту, які склаў абражаны ўчастковы інспэктар маёр міліцыі Сяргей Мечыслаўскі, Алег Стралец называў яго ў тэлефоннай размове "петушарай" і "малалеткай", пагражаў, што "прыедзе і разьбярэцца", "разаб'е яму я…ла", чым наўмысна прынізіў ягоныя годнасьць і гонар міліцыянта.

Як патлумачыў участковы, кайданкі былі надзетыя Алегу Стральцу "выключна ў мэтах уласнай бясьпекі". А прыкаваць мужчыну да батарэі прыйшлося таму, што ў памяшканьні не было… камэры часовага ўтрыманьня.

У выніку суд прызнаў віцебскага таксіста вінаватым у абразе міліцыянта і аштрафаваў яго на 24 базавыя велічыні (612 рублёў). Але праваабаронцы маюць да пастановы суду шмат пытаньняў.

**17.06.2019** Былы электраманцёр Віцебскага мясакамбінату спрабаваў 17 чэрвеня адмяніць рашэньне суду Першамайскага раёну, які абавязаў яго публічна выбачыцца перад супрацоўнікамі рэжымнага аддзелу прадпрыемства. Адмяніць рашэньне не атрымалася – аблсуд пакінуў прысуд у сіле.

Судом Першамайскага раёну гораду Віцебску 4 красавіка быў разгледжаны пазоў

да электраманцёра **Сяргея Сікоры** аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі. Прычынай стаў відэаролік "Рэжымнікі і акты", які быў выкладзены ў інтэрнэт 8 красавіка. Пазоўнікамі выступілі супрацоўнікі рэжымнага аддзела мясакамбінату Мікалай Барсукоў і Сяргей Бізуноў. Тады судзьдзя Алена Савіцкая прыняла рашэньне абавязаць відэаблогера публічна папрасіць прабачэньня ў пазоўнікаў, а таксама сплаціць судовыя выдаткі.

З такім рашэньнем суду Сяргей катэгарычна не пагадзіўся.

"Я ня згодны, таму што мае аргумэнты не былі ўлічаныя. Гэтак жа не былі прынятыя да разгляду відэаматэрыялы, якія былі зробленыя за некалькі дзён да паседжаньня. Судзьдзя вылучыла тыя моманты, якія былі на карысьць пазоўнікаў, і праігнаравала доказы, якія падаваліся мною і сьведкамі", – заявіў на пачатку судовага паседжаньня Сяргей Сікора.

У апэляцыйнай скарзе Сікора адзначыў, што "судом так і не было ўстаноўлена прычынна-выніковай сувязі паміж зьяўленьнем у інтэрнэце роліку "Рэжымнікі і акты" і прыніжэньнем дзелавой рэпутацыі пазоўнікаў". Канстатаваў таксама, што суд першай інстанцыі не правёў лінгвістычнай экспэртызы, і, не маючы на тое права, сам даў ацэнку словаў і фразаў, якія пазоўнікі палічылі зьневажальнымі.

Акрамя таго, спаслаўшыся на Канстытуцыю РБ і Міжнародны Пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, падкрэсьліў, што грамадзяне Беларусі маюць права на свабоду выказваньня меркаваньня, а таксама права на выказваньне крытыкі ў дачыненьні да любых службовых асобаў.

У абласным судзе, таксама як і ў Першамайскім, асноўныя спрэчкі разгарнуліся вакол заяваў, выкладзеных у відэаролiку. Сікора спрабаваў зноў давесьці, што пазоўнікі, супрацоўнікі рэжымнага аддзелу, ходзяць па камбінаце без адпаведнай формы і даглядаюць людзей па-за пакоем дагляду, не паказваючы дакумэнтаў.

"Гэта выклікае сумненьне ў датрыманьні законнасьці", – падкрэсьліў ён.

Пазоўнікі ж, у сваю чаргу, зноў усё абвяргалі і спрабавалі пераканаць суд у адваротным, але ніякіх канкрэтных доказаў не прыводзілі.

"Адказчык сказаў, што мы мусім у 10:00 быць ужо ў форме. Але тады, па ягонай лёгіцы, мы і зараз павінны сядзець у судзе ў гумовых ботах..." – гэта адзіная фраза, якую сказаў супрацоўнік рэжымнага аддзелу Сяргей Бізуноў.

Тым ня менш судзьдзя Ніна Сазонава прыняла рашэньне пакінуць скаргу відэаблогера без задавальненьня, а рашэньне суду – у сіле.

Пасьля судовага паседжаньня Сяргей Сікора заявіў, што чакаў такога рашэньня і што зьбіраецца аспрэчыць і яго. Таму з прабачэньнямі мясакамбінату таксама давядзецца пачакаць...

**17.06.2019** Віцяблянін Дзяніс (прозьвішча папрасіў не называць) правёў 6 траўня ў прыватным памяшканьні мастацкую выставу. А празь месяц суд Першамайскага раёну Віцебску аштрафаваў яго як арганізатара несанкцыянаванага масавага мерапрыемства (ч.2 арт. 23.34) на 30 базавых велічынь.

Імпрэза праходзіла на тэрыторыі былой віцебскай фабрыкі "КІМ", якая даўно

збанкрутавала, а яе памяшканьні выкупленыя прыватнікамі. У адным зь іх і была зладжаная выстава "Катарсыс". На ёй экспанавалася 25 працаў маладога мастака зь Берасьця Dima Wesko. Гучала музыка. Уваход на вечарыну ў стылі "постіндустрыяльнага аўдыё-візуальнага авангарду" быў вольны (па запісе ў інтэрнэце).

Але ў нейкі момант "аўдыёвізуальны авангард" раптам ператварыўся ў беларускі "сюр" – з супрацоўнікамі МУС на пярэднім пляне.

Дзяніс расказвае, што каля 23:00 у памяшканьне зайшлі міліцыянты і запыталіся, ці ёсьць дазвол на правядзеньне мерапрыемства.

"Мы ў адказ: на што дазвол? На тое, што мы тут проста адпачываем?.." – распавядае Дзяніс. Ён сьцьвярджае, што імпрэза сапраўды праходзіла на прыватнай тэрыторыі і што з гаспадаром памяшканьня было дамоўлена аб яе правядзеньні.

Даведаўшыся, што арганізатарам вечарынкі быў Дзяніс, міліцыя перапісала ягоныя пашпартныя дадзеныя і зьехала, забраўшы з сабой пяцярых непаўналетніх, каб праверыць іх на ўтрыманьне алькаголю ў крыві (усе аказаліся цьвярозымі).

Недзе праз месяц, 2 чэрвеня, маёр міліцыі Сяргей Козік выклікаў Дзяніса ў аддзяленьне і склаў на яго пратакол за правапарушэньне, прадугледжанае часткай 2 артыкулу 23.34 КаАП РБ.

Паводле пратаколу, Дзяніс парушыў закон "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь" тым, што "арганізаваў і правёў іншае масавае мерапрыемства – культурнае мерапрыемства, выставу карцін невядомага мастака ў складзкім памяшканьні".

Суд Першамайскага раёну прызнаў віцяблянiна вінаватым і пакараў штрафам у памеры 30 базавых велічынь.

**27.06.2019** Прысуд віцебскім падлеткам, абвінавачаным у збыце наркотыкаў у складзе групы (ч.3 арт.328 КК), абвясьцілі на выязным паседжаньні суду Чыгуначнага раёну Віцебску. Суд адбыўся ў актавай залі палітэхнічнага каледжу, у якім вучыліся да затрыманьня двое з абвінавачаных. Падлеткам далі ад 8-мі да 9,5 гадоў…

Судовы працэс над трыма навучэнцамі віцебскіх каледжаў – **Вольгай Шамшурай**, **Ягорам Пафёравым** і **Іванам Ануфрыевым**, працягваўся ўсяго два тыдні. Іх вінавацілі ў злачынствах, прадугледжаных часткамі 1 і 3 артыкулу 328 КК, Вользе Шамшуры інкрымінавалі таксама крадзеж наркатычных сродкаў (арт. 327 КК).

Падлеткі прызналі віну цалкам альбо часткова. Судзьдзя суду Чыгуначнага раёну Віцебску Дзяніс Аляксеенка палічыў віну маладых людзей даказанай.

У выніку Вольгу Шамшуру, якой на момант затрыманьня ў студзені 2019 году не было яшчэ 18-ці, асудзілі "па сукупнасьці злачынстваў" на 9,5 гадоў пазбаўленьня волі. 18-гадовы Ягор Пафёраў атрымаў 8,5 гадоў калёніі. Няпоўнагадовы Іван Ануфрыеў асуджаны на 8 гадоў пазбаўленьня волі з адбываньнем тэрміну ў выхаваўчай калёніі.

Аляксандар Пафёраў, бацька асуджанага Ягора, лічыць, што "артыкул 328 зусім

бязьлітасны ў дачыненьні да такіх дзяцей".

"Так, яны вінаватыя, і адмаўляць гэта ня мае сэнсу. Але ж навошта ім даваць такія тэрміны? Тым больш у першы раз! Дзяржава павінна даць ім права выправіцца іншым чынам, ну праз нейкае альтэрнатыўнае пакараньне ці як... А то і праўда атрымліваецца нейкі генацыд…" – сказаў тата асуджанага хлопца.

"Вельмі жорсткія прысуды. Судзьдзя, канечне, даў па мінімальным парозе, але велічыня пакараньня неадпаведная. Мой сын атрымаў 8 гадоў толькі за тое, што зрабіў пару фотаздымкаў падчас закладкі…" – кажа бацька асуджанага няпоўнагадовага Івана Яўген Лагуноў.

Ён лічыць цынізмам караць гэтак жорстка на фоне таго, што адбываецца зараз навокал.

"Так, на фоне таго, што зараз у Беларусі небясьпечныя псыхатропы знаходзяцца, можна сказаць, у вольным доступе, дык лічу гэта нейкім цынізмам. І хочацца папросту запытацца ў кіраўніка дзяржавы, а ці ведае ён аб тым, што ў краіне можна лёгка купіць наркотыкі праз "Тэлеграм". Хочацца, каб ён не перакідваў адказнасьць на МУС ды іншыя структуры, а асабіста выйшаў бы і пракамэнтаваў такі стан рэчаў", – сказаў Яўген.

Актавая заля Віцебскага палітэхнічнага каледжу была амаль цалкам запоўненая навучэнцамі ўстановы. Адміністрацыя каледжу пакінула вольныя месцы для бацькоў і сваякоў падсудных, але была вельмі зьдзіўленая, што на адкрыты суд прыйшлі простыя грамадзяне ("А вы хто? А адкуль вы даведаліся пра суд?").

Пасьля абвяшчэньня прысуду аднагрупніцы Вольгі Шамшуры прызналіся, што раней не заўважалі за Вольгай нічога дзіўнага, а пасьля яе затрыманьня да апошняга моманту ня верылі, што за такое могуць даць 10 год турмы. Дзяўчыны плакалі. Іх таксама вельмі ўразіла, што іх аднагрупнікі былі прыкаваныя ланцугамі да міліцыянтаў…

На самым першым судовым паседжаньні ўсе трое абвінавачаных заявілі, што ніхто і ніколі – ні ў школе, ні ў тэхнікумах – ім не тлумачыў, якая канкрэтна адказнасьць можа наступіць за дзеяньні, якія яны рабілі.

**16.07.2019** Эканамічны суд Віцебскай вобласьці спагнаў на карысьць вайсковых частак больш за 3000 рублёў зь Віцебскага гарвыканкаму і Талачынскага райвыканкаму. Гэта кампэнсацыя шкоды, якая была прычыненая дзяржаве "неабгрунтаваным прызывам на вайсковую службу" двух грамадзян, непрыдатных да яе праз стан здароўя.

Пазоўнікамі да выканкамаў выступалі ў судзе дзьве беларускія вайсковыя часткі. Грамадзяне Ш. і К. былі прызваныя ў войска і падчас праходжаньня тэрміновай службы падалі скаргі на стан свайго здароўя. Вайскоўцаў абсьледавала вайскова-ўрачэбная камісія галоўнага клінічнага мэдцэнтру Ўзброеных Сілаў РБ, якая ў выніку прызнала іх непрыдатнымі да нясеньня ваеннай службы ў мірны час. У сувязі з выяўленымі хваробамі хлопцаў звольнілі ў запас.

Згодна з заключэньнем камісіі, на тэрміновую службу іх прызвалі з прычыны невыкананьня ўстаноўленых мэтодык абсьледаваньня, якія, па сваё сутнасьці, былі

непаўнавартасныя.

У першым выпадку падчас вясеньняга прызыву 2016 году памыліўся доктар стаматоляг, у другім – хірург, які не заўважыў у прызыўніка праблемы з каленным суставам.

Паводле рахункаў пазоўнікаў, на ўтрыманьне вайскоўца Ш. падчас праходжаньня ім ваеннай службы ад 20 траўня да 8 верасьня 2016 году пайшло 1855 рублёў, на ўтрыманьне вайскоўца К., які служыў ад 19 траўня да 2 жніўня 2017 году, – 1199 рублёў. У гэтыя сумы былі ўключаныя выдаткі на грашовае, рэчавае і харчовае забесьпячэньне.

Адказчыкі не згаджаліся з патрабаваньнямі істцоў і аспрэчвалі віну спэцыялістаў гарадзкіх установаў аховы здароўя.

Аднак эканамічны суд Віцебскай вобласьці спагнаў з Талачынскага райвыканкаму запатрабаваныя пазоўнікам 1855 рублёў 35 капеек, зь Віцебскага гарвыканкаму – 1199 рублёў 07 капеек на сплату шкоды, прычыненай дзяржаве неабгрунтаваным прызывам грамадзян на ваенную службу. Выканкамы таксама мусяць выплаціць па 637 рублёў судовых выдаткаў.

У адпаведнасьці з артыкулам 10 Закону РБ "Аб воінскім абавязку і воінскай службе", мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, якія ствараюць прызыўныя камісіі, нясуць адказнасьць за шкоду, прычыненую дзяржаве і грамадзянам прызывам на ваенную службу грамадзян, не падлеглых прызыву на вайсковую службу праз стан здароўя ды зь іншых прычын.

**19.07.2019**

Судовая калегія па крымінальных справах Віцебскага абласнога суду разгледзела апэляцыйную скаргу віцебскага **"доктара-праўдаруба" Ігара Пастнова**, які быў асуджаны судом Бешанковіцкага раёну на тры гады "хіміі" за паклёп на пракурора (ч.2 арт.188 КК). Скарга пакінутая без задавальненьня, а прысуд – бяз зьменаў.

Апэляцыю разглядала калегія па крымінальных справах Віцебскага абласнога суду ў складзе старшыні Аляксандра Абашына, судзьдзяў Тацяны Дашкевіч і Андрэя Прэйса. У якасьці дзяржабвінаваўцы выступаў пракурор Віталь Сузанскі – той самы, які ўдзельнічаў у працэсе па справе Пастнова ў судзе першай інстанцыі. З гэтай прычыны на пачатку паседжаньня Ігар Пастноў заявіў адвод пракурору як зацікаўленай у выніках разгляду асобе, але адвод не задаволілі. Не задаволены быў і заяўлены адвод самой калегіі.

Разгляд апэляцыйнай скаргі прайшоў у закрытым судовым паседжаньні. Ігар Пастноў хадайнічаў, каб суд быў адкрыты, але судовая калегія адхіліла хадайніцтва.

У апэляцыйнай скарзе Пастноў настойваў у тым ліку на тым, што "трэба адмяніць прысуд і на той падставе, што прызначанае пакараньне судом першай інстанцыі не адпавядае цяжкасьці злачынства і асобе абвінавачанага". Пісаў пра адмову ў правядзеньні шэрагу экспэртызаў і пра тое, што быў пазбаўлены права выступаць у судовых спрэчках і права на апошняе слова.




Разгледзеўшы скаргу, судовая калегія пакінула яе без задавальненьня, а прысуд Пастнову – бязь зьменаў.

Віцебскі **праваабаронца Леанід Сьвецік**, камэнтуючы рашэньне аблсуду, кажа, што цяпер праваабарончая супольнасьць будзе вывучаць справу Пастнова на прадмет магчымага наданьня яму статусу палітвязьня.

**30.07.2019** Судовая калегія па крымінальных справах Віцебскага абласнога суду вынесла сьмяротны прысуд жыхару Віцебскага раёну **Віктару Паўлаву**. Суд палічыў, што ягоная віна ў забойстве дзьвюх жанчын-пэнсіянэрак у вёсцы Прысушына была цалкам даказаная.

Сьмяротны прысуд абвясьціў старшыня судовай калегіі Яўген Даўлюд. У склад калегіі ўваходзілі таксама народныя засядацелі Ягорава і Цімафеева.

50-гадовы жыхар Віцебшчыны Віктар Паўлаў быў прызнаны вінаватым у зьдзяйсьненьні жорсткіх забойстваў дзьвюх асобаў, якія знаходзіліся ў бездапаможным стане (інваліды 2-й групы), і паводле ч.2, арт.139 КК быў прысуджаны да найвышэйшай меры пакараньня – расстрэлу.

Мужчына быў таксама прызнаны вінаватым у крадзяжы (ч.2, арт. 205 КК).

30 сьнежня 2018 году жыхар вёскі Слабада Віцебскага раёну Віктар Паўлаў прыйшоў у дом да сясьцёр Вараненка і Кандраценкавай у вёсцы Прысушына, каб набыць віно. У выніку спантаннай спрэчкі мужчына нанёс Вараненкавай ня менш за 9 ўдараў драўлянай палкай па галаве, а затым Кандраценкавай – ня менш за 5 udараў, што і стала прычынай іх сьмерці.

Учыніўшы крадзеж 139 рублёў (паводле вэрсіі сьледзтва), дзьвюх бутэлек віна і пакету з рэчамі забітых, мужчына зачыніў дом на замок і сышоў зь месца злачынства. Целы забітых былі знойдзеныя 3 студзеня. Віктара Паўлава затрымалі, ён прызнаўся ва ўчыненым забойстве.

У 2005 годзе Віктар Паўлаў ужо быў асуджаны на 10 гадоў зьняволеньня за забойства мужчыны.

**09.08.2019** Паводле рашэньня суду Першамайскага раёну Віцебску проста ў залі суду была вызваленая **актывістка Надзея Куканос**. У адпаведнасьці з законам "Аб амністыі" крымінальная справа супраць яе скасаваная. Куканос адбыла за кратамі амаль чатыры месяцы.

Надзея Куканос была затрыманая 11 красавіка 2019 года на чыгуначным вакзале ў Віцебску і была зьмешчаная ў СІЗА-2, дзе ад таго часу і знаходзілася. Стала вядома таксама, што зь СІЗА яе прымусова дастаўлялі ў цэнтар псыхічнага здароўя




ў Навінках для правядзеньня судова-псыхіятрычнай экспэртызы.

Супраць Куканос былі распачатыя аж тры крымінальныя справы па ч.2 арт.400 (Загадзя ілжывы данос аб учыненьні злачынства), якія пазьней былі аб’яднаныя ў адно справаводзтва. Актывістцы пагражала да 5 гадоў зьняволеньня.

Пацярпелымі па справе выступалі супрацоўнікі міліцыі і сьледчыя, якіх актывістка нібыта абылгала. На судовае паседжаньне прыйшлі ня ўсе, у залі суду прысутнічала толькі трое пацярпелых міліцыянтаў – Радзэвіч, Шабалін і Башура. У судзе актывістку падтрымлівалі яе паплечнікі па незарэгістраваным аб’яднаньні "За сумленную ўладу", а таксама сябры і знаёмыя.

На самым пачатку паседжаньня старэйшы памочнік пракурора гораду Віцебску Аляксандар Дзядзюра заявіў хадайніцтва аб спыненьні крымінальнай справы і вызваленьні абвінавачанай ад крымінальнай адказнасьці ў адпаведнасьці з законам "Аб амністыі ў сувязі з 75-годзьдзем вызваленьня Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў".

Згодна з законам, асобы, якія дасягнулі пэнсійнага веку, вызваляюцца ад крымінальнай адказнасьці і супраць іх спыняецца "папярэдняе расьсьледаваньне па крымінальных справах, якія знаходзяцца ў вытворчасьці ў органах, і вытворчасьць па крымінальных справах, не разгледжаных судамі".

Але абвінавачаная заявіла, што хадайніцтва дзяржабвінаваўцы несвоечасовае, і агучыла сваё хадайніцтва – аб зьмяненьні ёй меры стрыманьня на падпіску аб ня выезьдзе. Запэўніла, што не зьбіраецца ўцякаць ад суду, бо лічыць сябе невінаватай і зацікаўленая прыходзіць на паседжаньні ды дамагацца справядлівасьці. Зазначыла, апроч таго, што не нясе ніякай небясьпекі для грамадзтва, таму трымаць яе пад вартай няма ніякага сэнсу.

Пацярпелыя былі ня супраць зьмены меры стрыманьня, але пракурор выказаўся супраць.

Пасьля гадзіннага перапынку судзьдзя Тацяна Родзіна падтрымала меркаваньне пракурора і адмовіла актывістцы ў хадайніцтве аб зьмене меры стрыманьня.

Пасьля гэтага Куканос сама заявіла хадайніцтва аб прымяненьні ў дачыненьні да яе закону аб амністыі. Суд падтрымаў яе хадайніцтва, прыняўшы пастанову аб яе вызваленьні. Крымінальная справа супраць Надзеі Куканос спыненая, яе вызвалілі з-за кратаў у залі суду.

Вызваленая па амністыі актывістка расказала пасьля суду, у якіх умовах утрым-




лівалася ў сьледчым ізалятары. Паводле яе словаў, супрацоўнікі СІЗА неаднойчы яе зьбівалі і катавалі, наўмысна зламалі яе акуляры. Віцяблянка сьцьвярджае, што была вымушаная абвясьціць у СІЗА дзьве галадоўкі, якія трымала 19 і 11 дзён. Кажа, што 75 сутак правяла ў карцэры.

**22.08.2019** У Віцебску суд Бешанковіцкага раёну на выязным паседжаньні прызнаў вінаватым віцябляніна **Рафаэля Кірылава-Шмільхольдхарда** ў паклёпе на пракурора Юрыя Раманоўскага (ч.2 арт. 188 КК РБ) і пакараў яго трыма гадамі абмежаваньня волі без накіраваньня ў месцы адбываньня пакараньня ("хатняя хімія").

Судовы працэс над Кірылавым-Шмільхольдхардам праходзіў у закрытым рэжыме. Справу віцябляніна разглядала судзьдзя суду Бешанковіцкага раёну Натальля Рэут. Як інвалід II групы, Рафаэль Кірылаў-Шмільхольдхард разьлічваў на тое, што ў дачыненьні да яго будзе ўжытая амністыя, але яе не прымянілі. Суд прысудзіў мужчыну да трох гадоў абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

На двух віцяблянаў – Ігара Пастнова і Рафаэля Кірылава-Шмільхольдхарда, была заведзеная спачатку адна крымінальная справа, але на закрытым судовым працэсе, які пачаўся ў красавіку 2019 году, справа Кірылава-Шмільхольдхарда была выведзеная ў асобнае справаводзтва.

Мужчын абвінавачвалі ў распаўсюдзе заведама ілжывых выдумак, якія зьняважылі пракурора гораду Віцебску Юрыя Раманоўскага.

**28.08.2019** Эканамічны суд Віцебскай вобласьці пастанавіў аштрафаваць Свабодны прафсаюз Беларускі (СПБ) на 10 базавых велічынь за невыкананьне рашэньня гэтага ж суду аб вызваленьні памяшканьня прафсаюзнага офісу на прадпрыемстве "Полацак-Шкловалакно".

Дамова аб арэндзе памяшканьня, якое належыць ААТ "Полацак-Шкловалакно", скончылася ў лістападзе 2018 году. Аднак у памяшканьні засталася маёмасьць, якая належыць першаснай арганізацыі СПБ працоўных заводу. І доступу да яго сябры пяршоўкі ня мелі.

Эканамічны суд Віцебскай вобласьці яшчэ ў лютым 2019 году прыняў рашэньне абавязаць СПБ вызваліць памяшканьне. У красавіку Полацкі аддзел прымусовага выкананьня (АПВ) зафіксаваў выкананьне рашэньня суду. Але прадпрыемства "Полацак-Шкловалакно" абскардзіла выкананьне судовага загаду, бо ў памяшканьні заставалася маёмасьць, якая не належыць СПБ, а зьяўляецца ўласнасьцю іншай юрыдычнай асобы – пяршоўкі Свабоднага прафсаюзу.

Полацкі аддзел прымусовага выкананьня адмяніў сваё колішняе рашэньне і зноўку абавязаў прафсаюз вызваліць памяшканьне. Быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні ("невыкананьне рашэньня суду"), за якое прадугледжваецца пакараньне ў выглядзе штрафу памерам да 500 базавых велічынь (для юрыдычных асобаў).

На паседжаньні эканамічнага суду 28 жніўня высьветлілася, што СПБ ня быў праінфармаваны аб працэдуры перагляду выкананага рашэньня суду, таму што дакумэнты адпраўляліся судовымі выканаўцамі на няправільны юрыдычны адрас СПБ. Аказалася, няправільны адрас СПБ зафіксаваны і ў рэестры Мін'юсту.

Тым ня менш эканамічны суд Віцебскай вобласьці (судзьдзя Анатоль Гурэеў) пастанавіў аштрафаваць Свабодны прафсаюз на 10 базавых велічынь.

"Эканамічны суд лічыць, што, таму як юрыдычнай асобай было ўчыненае адміністрацыйнае правапарушэньне, з улікам яго зьдзяйсьненьня ўпершыню і адсутнасьці абцяжваючых акалічнасьцяў, на юрыдычную асобу "Свабодны прафсаюз Беларускі" неабходна накласьці адміністрацыйны штраф у памеры 10 базавых велічынь, што складае 255 рублёў", – гаворыцца ў пастанове суду.

"У апошнія гады дзяржорганы чыняць розныя дзеяньні, накіраваныя на разбурэньне Свабоднага прафсаюзу: пазбавілі офісу пяршоўку СПБ у Полацку, заводзяць крымінальныя справы і штрафуюць прафсаюзных актывістаў, пішуць ад імя невядомых аўтараў паклёпніцкія пасты ў сацыяльных сетках і г.д. Аднак прафсаюз працягвае дзейнічаць – і дзяржорганы ўжо ня ведаюць, што б такое зрабіць яшчэ, каб закрыць СПБ", – кажа **старшыня Свабоднага прафсаюзу Беларускага Мікола Шарах**.

Прафсаюзныя актывісты першаснай арганізацыі СПБ на прадпрыемстве "Полацак-Шкловалакно" мяркуюць, што рашэньне эканамічнага суду неправамернае ад самага пачатку. Эканамічны суд ня мог разглядаць спрэчку паміж прафсаюзам і наймальнікам "Полацак-Шкловалакно" аб арэндзе памяшканьня пад офіс прафсаюзу, бо гэта ня мае дачыненьня да гаспадарча-эканамічнай дзейнасьці. Гэткія юрыдычныя адносіны надведамасныя працоўнаму арбітражу, але інстытут працоўнага арбітражу ў Беларусі практычна разбураны зьменамі, якія былі ўнесеныя ў Працоўны кодэкс.

## Ціск на журналістаў і блогераў




**10.10.2018 Незалежны журналіст Зьміцер Лупач** абскарджваў у Віцебскім абласным судзе рашэньне суду Браслаўскага раёну. Вынік разгляду: пастанова райсуду пра штраф у 36 базавых велічыняў (882 рублі) за парушэньне артыкулу 22.9 КаАП (незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ) пакінутая бязь зьменаў.

Рашэньне райсуду, якое абскарджваў глыбачанін, было вынесенае 4 верасьня судзьдзём Аляксандрам Вязіцкім. Зьмітра Лупача аштрафавалі за рэпартаж пра былога кіраўніка Браслаўскага раёну Уладзімера Дранеўскага, абвінавачанага ў карупцыі і хабары ў памеры 28 тысячаў эўра. Журналіст узяў інтэрвію ў жыхароў Браслава, папрасіўшы іх выказаць сваё стаўленьне да падзеі.

Справу разглядала судзьдзя Сьвятлана Іванова. Заслухаўшы аргумэнты журналіста, яна пакінула ягоную скаргу без задавальненьня.

**05.11.2018** Кампанія "Станем за журналістыку" праходзіць 5 лістапада ў розных краінах сьвету пачынаючы з 2007 году. Ініцыятарам кампаніі, якая мае на мэце прыцягнуць увагу да пагрозаў, зь якім сутыкаюцца працаўнікі пяра і камэры, ёсьць Міжнародная фэдэрацыя журналістаў.

Традыцыйна да кампаніі ў падтрымку вольнай журналістыкі далучаюцца і віцебскія грамадзкія актывісты ды сябры БАЖ. Сёлета яны сфатаграфаваліся з плякатамі са словамі "Я падтрымліваю незалежных журналістаў". Такім спосабам віцебчукі выказалі падтрымку журналістам недзяржаўных СМІ, якія перасьледуюцца ў межах гэтак званай справы БелТА.

Паводле сьледзтва, фігуранты гэтай справы нібыта ажыцьцяўлялі несанкцыянаваны доступ да матэрыялаў дзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва БелТА. Па крымінальнай справе ў якасьці падазраваных праходзяць сама меней дванаццаць супрацоўнікаў СМІ. Многія з журналістаў прайшлі празьператрусы і арышты, ім пагражаюць вялікія штрафы або зьняволеньне.

**05.11.2018** Глыбоцкія міліцыянты склалі чарговы пратакол паводле часткі другой артыкулу 22.9 КаАП на **фрылянсэра Зьмітра Лупача**. Позву журналісту даслаў на Viber капітан міліцыі, старшы інспэктар па дазвольнай рабоце аддзелу аховы правапарадку і прафіляктыкі Сяргей Цырбан.

Падставай для складаньня пратаколу стаў сюжэт на спадарожнікавым тэлеканале "Белсат" пра ўшанаваньне памяці ахвяр нацыстаў і камуністаў на Глыбоччыне.

Сёлета гэта ўжо дзясяты пратакол, складзены на Зьмітра Лупача за супрацу зь незалежным тэлеканалам "Белсат". Тыднем раней на Зьмітра Лупача і **Тацяну Смоткіну** пратаколы склала мёрская міліцыя за асьвятленьне імі сацыяльных праблем жыхароў аграгарадка Язна Мёрскага раёну.

Як кажа журналіст-фрылянсэр Зьміцер Лупач, апошнім часам улады наогул не прапускаюць па-за ўвагай ніводнага яго сюжэту, асабліва на сацыяльную тэматыку. «І як яны часам кажуць людзям, каб закрылі раты, як напрыклад гэта было ў Язна, такім чынам спрабуюць узьдзейнічаць і на нас. Думаю, што ім цяжка будзе гэта зрабіць, бо сытуацыя ў краіне пагаршаецца, расьце напружаньне, асабліва ў малых гарадох ды вёсках. Таму я ня ведаю, колькі яшчэ людзі змогуць маўчаць, бо цярпеньне народу ня вечнае».

Сёлета над Зьмітром Лупачам адбылося 5 судоў, агулам ён ужо заплаціў 4 189,5 рублёў штрафу за прафэсійную дзейнасьць.

**28.12.2018** Дзявяты па ліку суд адбыўся сёлета над глыбоцкім **журналістам-фрылянсэрам Зьмітром Лупачам** паводле часткі 2 артыкулу 22.9 КаАП – за незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ.

Гэтым разам судзьдзя Глыбоцкага раённага суду Людміла Вашчанка аштрафавала журналіста на 25 базавых велічыняў, што складае 612,5 беларускіх рублёў. Падставай стаў сюжэт на спадарожнікавым тэлеканале "Белсат" пра ўшанаваньне памяці ахвяр нацыстаў і камуністаў на Глыбоччыне.

Усяго працэс па адміністрацыйнай справе доўжыўся каля 20 хвілін, але калегі Зьмітра змаглі трапіць толькі на выніковую частку паседжаньня суду. Незалежныя журналісты прыйшлі падтрымаць калегу, міліцыянты праверылі ў іх дакумэнты і сказалі чакаць, а потым не пускалі ў пакой, дзе слухалася справа Лупача. Яны спасылаліся на тое, што працэс ужо пачаўся і там вядзецца допыт. Да таго ж праваахоўнікі дадалі, што журналісты самі вінаватыя ў тым, што ня трапілі на суд, бо трэба было ісьці.

Пасьля працэсу ля будынку суду зьявіўся аўтамабіль ДАІ. Паводле аднаго з прысутных журналістаў, да супрацоўніка аўтаінспэкцыі падыйшоў капітан Цырбан і нешта сказаў яму на вуха. Пасьля гэтага машыну з журналістамі спынілі для праверкі дакумэнтаў. Паколькі ўсе дакумэнты былі ў парадку, журналістам пажадалі шчасьлівай дарогі.

**25.01.2019** Віцебскі аблсуд не задаволіў касацыйную скаргу **журналіста-фрылянсэра Зьмітра Лупача**. Журналіст спрабаваў аспрэчыць пастанову Глыбоцкага раённага суду ад 22 сьнежня мінулага году. Тады судзьдзя Людміла Вашчанка аштрафавала яго на 25 базавых велічыняў, што складае 612,5 беларускіх рублёў.

Як кажа Зьміцер Лупач, асаблівых спадзяваньняў на тое, што абласны суд задаволіць яго скаргу, не было. З рашэньнем суду журналіст ня згодны і намераны зьвяртацца са скаргай у Камітэт ААН па правах чалавека. Там ужо зарэгістраваныя дзьве яго скаргі на парушэньне краінай Беларусь яго правоў.

Паводле Зьмітра Лупача, пакуль звароты ў Камітэт ААН па правах чалавека асаблівага выніку не даюць.

25.02.2019 Судзьдзя Глыбоцкага раённага суду Андрэй Тарасевіч аштрафаваў **журналіста-фрылянсэра Зьмітра Лупача** на 35 базавых велічыняў, што складае амаль 900 беларускіх рублёў, передае служба маніторынгу Беларускай асацыяцыі журналістаў. У суд журналіст прынёс павялічаны ў дзясяткі разоў квіток аб аплаце папярэдняга штрафу.

Гэтым разам падставай для адміністрацыйнага перасьледу стаў сюжэт на спадарожнікавым тэлеканале "Белсат" пад назвай "На Віцебшчыне паставілі помнік камсамолу".

Журналіста абвінавацілі ў парушэньні арт. 35 "Закона аб СМІ" (праца на замежны сродак інфармацыі без акрэдытацыі пры беларускім МЗС) і прыцягнулі да адказнасьці па ч. 2 арт. 22.9 КаАП – за незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ.

Ужо пасьля суду Зьміцер Лупач сказаў, што аніякага спадзеву на апраўдальнае рашэньне па выніках судовага слуханьня ў яго не было, бо тэма сюжэту значная для чыноўнікаў.

Рабіць фотаздымкі ў ходзе слуханьня судзьдзя Тарасевіч забараніў. На прапанову журналіста весьці судовы працэс у Міжнародны дзень роднай мовы па-беларуску судзьдзя адказаў, што Лупач можа гаварыць на беларускай мове, а сам, спаслаўшыся на дзяржаўнае дзьвюхмоўе, гаварыў па-расейску.

У якасьці сьведкі на судзе прысутнічала Сьвятлана Палідавец, якая працуе настаўніцай у адной са школаў гораду. Яна зазначыла: пасьля наведваньня міліцыі зразумела, што размаўляць з журналістамі нельга, і больш нікому ніякіх інтэрвію даваць ня будзе.

Перад судовым пасяджэньнем Зьміцер Лупач перадаў у Глыбоцкі суд арыгінал квітанцыі аб аплаце папярэдняга штрафу. Але дакумэнт гэтым разам павялічыў да памеру 1.8 х1.6 мэтра.

"Бо, – кажа журналіст, – часам у судзе ня могуць адсачыць, ці заплаціў я штраф, і перадаюць паперы судовым выканаўцам".

**15.03.2019** Два дні спатрэбілася судзьдзі Міхаілу Зубені, каб аштрафаваць віцебскага **журналіста-фрылянсэра Віталя Скрыля** на 25 базавых велічынь за парушэньне заканадаўства аб СМІ. Яго прызналі вінаватым у незаконным вырабе прадукцыі СМІ (ч.2 арт.22.9 КаАП).

Справа аб адміністрацыйным правапарушэньні, прадугледжаным ч.2 арт.22.9 КаАП РБ (Незаконны выраб і (або) распаўсюд прадукцыі СМІ), слухалася ў судзе Віцебскага раёну. Незалежнага журналіста вінавацілі ў тым, што 25 студзеня ён знаходзіўся ля прахадной вытворчага цэху "ВоршаСырЗавод" у Сянно і нібыта незаконна браў інтэрвію ў працаўнікоў прадпрыемства. Вынікам інтэрвію стаў відэаматэрыял "Згортваецца апошняе прадпрыемства, якое дае працу ў Сянно". Сюжэт зьявіўся на тэлеканале "Белсат".

На пачатку судовага паседжаньня Віталь Скрыль хадайнічаў аб запрашэньні перакладчыка, бо недастаткова добра валодае расейскай мовай. Хадайніцтва судзьдзя не задаволіў, назваўшы яго беспадстаўным. Выказаўся пра абавязак валодаць расейскай мовай.




Тады віцебскі журналіст скарыстаўся сваім законным правам на абарону. Заявіў, што не пасьпеў дамовіцца зь менскім беларускамоўным адвакатам. Судзьдзя Зубеня параіў заключыць дамову зь віцебскім абаронцам. Быў абвешчаны перапынак, але і пасьля яго ў залі суду адвакат не зьявіўся. Адшукаць беларускамоўнага адваката так і не атрымалася.

Найбольш часу (каля 2-х гадзінаў) заняло апытаньне 7 сьведкаў сеньненскага сырзаводу. Судзьдзя Зубеня высьвятляў у іх, ці быў 25 студзеня Віталь Скрыль сярод тых асобаў, якім ля прахадной заводу людзі давалі інтэрвію. З апытаных толькі двое апазналі Скрыля.

Пры гэтым абвінавачаны зьвярнуў увагу на тое, што судзьдзя сваімі аднастайнымі пытаньнямі і празьмернай зацятасьцю нібыта дамагаецца ад сьведкаў патрэбных яму адказаў.

Адзін са сьведкаў заявіў, што яму тэлефанаваў супрацоўнік КДБ, які курыруе Сеньненскі раён. Менавіта ад яго мужчына і даведаўся, што ў Сянно прыяжджалі журналісты "Белсату". Пра інтэрвію ён нічога ня ведаў, бо на той час знаходзіўся ў лякарні. Натуральна, у абвінавачанага ўзьнікла пытаньне пра дачыненьне да справы КДБ.

Апошнім апыталі старэйшага лейтэнанта Паўла Осіпава. Ён патлумачыў, што, праводзячы маніторынг СМІ ў сеціве па загадзе свайго кіраўніцтва, на сайце БАЖу адшукаў матэрыял, у якім згадваецца, што відэасюжэт "Згортваецца апошняе прадпрыемства, якое дае працу ў Сянно" Віталя Скрыля заняў другое месца ў журналісцкім конкурсе. Гэты факт нібыта і стаў падставай для працягу працэсуальных дзеяньняў па справе.

Адстойваючы сваю невінаватасьць, Віталь Скрыль зьвярнуў увагу на тое, што сеньненскія міліцыянты завялі супраць яго адміністрацыйную справу яшчэ да таго, як быў усталяваны сам факт правапарушэньня. Гэта адбылося толькі 28 лютага, калі міліцыянты атрымалі дакумэнт зь Міністэрства замежных справаў, які і пацьвердзіў, што ён не зьяўляецца журналістам ніводнага з акрэдытаваных у Беларусі замежных СМІ.

Вынікае, што заведзеная справа грунтавалася выключна на здагадках, бо праваахоўнікі ня мелі падставаў для фіксацыі факту правапарушэньня.

Сеньненскія міліцыянты вінавацілі Віталя Скрыля ў тым, што ён – журналіст замежнага тэлеканалу. Разам з тым, сам факт ягонай сувязі з тэлеканалам "Белсат" і працоўных адносінаў зь ім не даказаны. Наадварот, у матэрыялах справы ёсьць дакумэнт, які даводзіць, што журналіст не зьвязаны з тэлеканалам "Белсат" ані-

якімі працоўнымі адносінамі.

Журналіст пераконваў, што зьбіраць інфармацыю, у тым ліку здымаць на камэру са згоды людзей, не парушаючы заканадаўства, мае права любы грамадзянін Беларусі без усялякай акрэдытацыі. Акром таго, аўтар такога матэрыялу можа на законных правах прадаць выраблены ім матэрыял трэцяй асобе. Пасьля гэтага ўся адказнасьць за матэрыял пераходзіць на праваўладальніка.

"Чаму ў такім выпадку адказнасьць перакладаецца на таго, хто ўжо не валодае правамі на створаную ім прадукцыю? І чаму яго прызнаюць вінаватым у вырабе і распаўсюдзе СМІ? Я не разумею, у які момант той, хто прадаў матэрыял трэцяй асобе, становіцца вінаватым у вырабе і распаўсюдзе прадукцыі замежнага СМІ. Я лічу гэта поўным абсурдам, бо ня бачу ніякага правапарушэньня ў факце запісу чаго-небудзь у грамадзкім месьце са згоды прысутных", – падсумаваў Скрыль.

Гэтыя развагі, як і многія іншыя, выказаныя ў сваю абарону журналістам, засталіся па-за ўвагай судзьдзі Зубені.

Дасьледаваўшы ў сукупнасьці ўсе доказы па справе, суд палічыў вінаватасьць Віталя Скрыля ў незаконным вырабе прадукцыі СМІ даказанай і аштрафаваў яго на 25 базавых велічыняў (637 рублёў 50 капеек).

Суд палічыў дастатковым для доказу вінаватасьці сьведчаньні двух з шасьці працаўнікоў сырнага заводу, якія засьведчылі, што 25 студзеня спадар Скрыль апытваў працоўных ля прахадной прадпрыемства. Таксама ў якасьці доказу залічылі і матэрыял, апублікаваны на сайце БАЖ, дзе прозьвішча журналіста згадваецца ў сувязі з другім месцам у творчым конкурсе.

Тое, што Скрыль прад'яўляў як парушэньне заканадаўства, суд прызнаў малаістотнымі недахопамі. Праўда, факт датычнасьці Віталя Скрыля да распаўсюду прадукцыі СМІ суд выключыў з канчатковай пастановы.

**27.03.2019 Незалежныя журналісты** з Глыбокага **Зьміцер Лупач** і **Таццяна Смоткіна** атрымалі позвы з Шаркоўшчынскага райаддзелу міліцыі. Спачатку міліцыянты даслалі ім позвы праз мэсэнджары Viber і WhatsApp, а потым патэлефанавалі і яшчэ раз запрасілі на так званую "гутарку" на 29 сакавіка, паведамляе "Беларуская асацыяцыя журналістаў".

Як вынікае з дасланых журналістам паведамленьняў, ім трэба зьявіцца ў Шаркоўшчынскі РАУС у кабінэт № 8. Яшчэ ўказаныя адрас, час і артыкул, які прадугледжвае адказнасьць за няяўку. Больш ніякіх зьвестак у позьве не было. Позву падпісаў старшы інспэктар Шаркоўшчынскага аддзяленьня аховы правапарадку і прафіляктыкі РАУС Андрэй Курэц.

Журналістаў зьдзівілі такія непісьменныя позвы ад супрацоўніка міліцыі (што праўда, падобныя паперы ім ужо прыходзілі неаднойчы). Ніякіх дадатковых удакладненьняў па тэлефоне таксама не было.

З аднаго боку, Зьміцер Лупач і Таццяна Смоткіна па такіх позвах могуць і ня ехаць у Шаркоўшчынскі РАУС. А зь іншага – некаму ж трэба вучыць міліцыянтаў складаць дакумэнты правільна.

Незалежная журналістка Тацяна Смоткіна праз WhatsApp даслала ў адказ паведамленьне, што яна гатовая явіцца ў міліцыю толькі па позьве, напісанай належным чынам. Бо, як кажа Тацяна, такім дакумэнтам міліцыянты не паважаюць ні сябе, ні журналістаў.

Зьміцер Лупач прытрымліваецца такога ж меркаваньня. Ён мае намер даслаць шаркоўшчынскім міліцыянтам спасылку на артыкул працэсуальнага кодэксу, дзе напісана, як мае быць афармленая позва.

**05.04.2019** На глыбоцкага **журналіста-фрылянсэра Зьмітра Лупача** міліцыянты склалі адміністрацыйны пратакол за парушэньне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 23.34 КаАП РБ). "Незаконнае пікетаваньне шыюць", – паведаміў на сваёй старонцы ў Facebook журналіст.

25 сакавіка глыбоцкія актывісты адзначылі Дзень Волі ўскладаньнем кветак да бюсту прэм'ера БНР Вацлава Ластоўскага, да мэмарыяльнай дошкі стваральніку нацыянальнага сьцяга Клаўдыю Дуж-Душэўскаму, на магілу сябра Саюзу беларускіх патрыётаў Альберта Бацяноўскага. Пасьля гэтага запусьцілі бел-чырвона-белы сьцяг на паветраных балёніках у неба.

У сьвяткаваньні бралі ўдзел 12 глыбачан. Усе дзеяньні актывістаў здымалі на камэры супрацоўнікі міліцыі ды КДБ, нікога не затрымлівалі. Адміністрацыйны пратакол склалі толькі на Зьмітра Лупача.

**11.04.2019** Агулам па дзьвюх адміністрацыйных справах на 40 базавых велічыняў аштрафаваў Глыбоцкі раённы суд **незалежнага журналіста Зьмітра Лупача**.

Працэс вёў судзьдзя Станіслаў Трапук. Зьмітра судзілі па ч.2 арт. 22.9 КаАП (незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ) і па ч.1 арт. 23.34 (парушэньне парадку арганізацыі альбо правядзеньня масавых мерапрыемстваў).

У першым выпадку журналіста судзілі за сюжэт на тэлеканале "Белсат", у другім – за тое, што на Дзень Волі ўзьняў бел-чырвона-белы сьцяг.

Як напісалі міліцыянты ў пратаколе, такім чынам ён публічна выказаў свае палітычныя інтарэсы ў сувязі з гадавінай БНР. Судзьдзя Станіслаў Трапук напачатку агучыў, што па першай справе Зьмітра штрафуе на 36 базавых велічыняў, па другой – на 10, а ў сукупнасьці шляхам частковага складаньня – на 40 базавых велічыняў, што складае 1020 рублёў.

Напрыканцы судовага паседжаньня судзьдзя Станіслаў Трапук сказаў, што ў Глыбоцкі РАУС будзе накіраваны ліст наконт недахопаў, якія былі выяўленыя пры разглядзе справы. А распачалі справы на журналіста Зьмітра Лупача і перадалі іх у суд лейтэнант міліцыі Віктар Гірын і капітан міліцыі, старшы інспэктар па дазвольнай рабоце аддзелу аховы правапарадку і прафіляктыкі Глыбоцкага РАУС Сяргей Цырбан. Ён, дарэчы, выступаў таксама ў якасьці сьведкі разам з курсантам міліцыі Аляксеем Юргелем па справе, якую распачаў на журналіста лейтэнант глыбоцкай міліцыі Віктар Гірын.

Падчас сьвяткаваньня Дня Волі Сяргей Цырбан разам зь іншымі міліцыянтамі здымаў глыбоцкіх актывістаў на відэакамэру.




**15.04.2019** Віцяблянін **Сяргей Сікора** назваў у відэароліку супрацоўнікаў аховы Віцебскага мясакамбінату "рэжымнікамі" і расказаў, як яны "бегаюць па камбінаце і хапаюць людзей за сасіску". Прадстаўнікі прадпрыемства патрабавалі ў судзе выбачэньняў і выдаленьня відэа. Пазоўныя патрабаваньні былі задаволеныя, але часткова…

Электраманцёр (цяпер ужо – былы) Віцебскага мясакамбінату Сяргей Сікора вядзе на Youtube і ў "Аднаклясьніках" відэаблог. У сваіх відэазваротах ён расказвае, што адбываецца на прадпрыемстве, уздымае вострыя пытаньні, крытыкуе кіраўніцтва.

Гэтак, у адным з ролікаў ён зьвярнуўся да дырэктара мясакамбінату і да сьледчага камітэту з патрабаваньнем правесьці расьсьледаваньне на прадпрыемстве. Заявіў пра ціск з боку адміністрацыі цэху, абвінаваціў яе ў парушэньні заканадаўства. Гэтае відэа атрымала на Youtube больш за 35 тысячаў праглядаў.

Праблемы, якія ўзьняў Сікора, пачалі абмяркоўвацца на прадпрыемстве. Актыўнасьць электраманцёра не засталася незаўважанай і кіраўніцтвам мясакамбінату. Але адрэагавала яно на ўсё гэта своеасабліва: замест таго, каб правесьці праверку, на электраманцёра быў пададзены пазоў у суд.

Падставай для судовага разьбіральніцтва быў ужо іншы відэаролік – "Рэжымнікі і акты", выкладзены ў інтэрнэт 8 лютага.

Грамадзянскую справу аб абароне гонару і годнасьці прадпрыемства разглядала судзьдзя Першамайскага суду Віцебску Алена Савіцкая. У якасьці пазоўнікаў выступілі начальнік рэжымнага аддзелу прадпрыемству Мікалай Барсукоў і ягоны падначалены Сяргей Бізуноў. Яны палічылі, што агучаная ў відэароліку інфармацыя не адпавядае рэчаіснасьці і ганьбіць іх гонар, годнасьць і дзелавую рэпутацыю.

У пазоўнай заяве прасілі суд абавязаць адказчыка выдаліць відэаролік, публічна папрасіць прабачэньня ды аплаціць судовыя выдаткі.

У роліку Сяргей Сікора сьцьвярджае, што на камбінаце ёсьць "некаторыя тыпы, якія называюць сябе рэжымнікамі". Яны, "ня маючы на тое правоў, бясчынствуюць". Гэта, на думку блогера, праяўляецца ў тым, што супрацоўнікі рэжымнага аддзелу ходзяць па камбінаце без спэцадзеньня, заходзяць у кілбасныя і харчовыя цэхі, у капцілкі, "бегаюць па камбінаце, хапаюць людзей за сасіску". І пры гэтым не прад'яўляюць дакумэнтаў і не прадстаўляюцца. Якраз словазлучэньні "уявілі сябе рэжымнікімі", "бегаюць і хапаюць за сасіску", "бясчынствуюць" і выклікалі абурэньне супрацоўнікаў аховы.

На судовае паседжаньне Сяргей прыйшоў ужо ў якасьці беспрацоўнага. Паводле ягоных словаў, пасьля ўсяго гэтага працаваць яму там проста ня далі б. Таму ён звольніўся "па ўласным жаданьні". Таксама, каб не падстаўляць калегаў, у якасьці сьведкаў заявіў толькі былых супрацоўнікаў мясакамбінату.

Прадстаўнікі прадпрыемства сьцьвярджалі ў судзе, што яны заўсёды ходзяць у форме, прадстаўляюцца і ніяк не парушаюць вызначаных правілаў.

Між тым, сьведкі з боку блогера цалкам пацьвердзілі інфармацыю, якую ўтрымлівае ролік. Казалі, што супрацоўнікі рэжымнага аддзелу сапраўды ходзяць бяз формы, не прадстаўляюцца, ажыцьцяўляюць дагляд па-за межамі адмысловага пакою для дагляду, робяць гэта без міліцыянтаў і так, каб не трапляць у поле зроку камэр назіраньня.

"Увесь гэты ролік носіць характар звароту да кіраўніцтва мясакамбінату і зьмяшчае меркаваньне Сяргея пра тое, што існуюць дзьве паралельныя службы на камбінаце. Ён выказваецца, што абедзьве гэтыя службы павінны працаваць празрыста, у адпаведнасьці з вызначаным нарматыўна-прававым актам. І зьвяртаецца да дырэктара, бо не разумее, чаму яны не паказваюць дакумэнты, чаму не выконваюць працэдуры", – казала на працэсе адвакатка Таццяна Ткачонак.

Паводле адвакаткі, выказанае Сяргеем Сікорам ёсьць меркаваньнем, "якое носіць характар ацэнкі і крытыкі", бо дзеяньні службаў аховы закранае пачуцьцё ўласнай годнасьці працаўнікоў камбінату. Адзначыла, што словазлучэньне "ўявілі сябе рэжымнікамі" не павінна абражаць супрацоўнікаў рэжымнага аддзелу, бо не нясе нэгатыўнай ацэнкі.

"Мяркую, што ў сьвятле цяперашняй інфармацыйнай палітыкі ня трэба людзям закрываць раты", – зьвярталася да судзьдзі адвакатка.

Сяргей Сікора цалкам адхіліў пазоўныя патрабаваньні і заявіў, што ня лічыць сябе вінаватым.

"У любым выпадку я не хацеў ані абразіць, ані прынізіць іх гонар і годнасьць. Я хацеў пакрытыкаваць. Пазоўнікі заяўляюць, што выступаюць тут як простыя грамадзяне. Але, шмат разоў пераглядзеўшы відэа, я так і не зразумеў, у чым я зьняважыў іх гонар і годнасьць як простых грамадзянаў. Так, мелася крытыка нейкіх асобаў. Паводле іхных жа словаў, яны ня маюць дакумэнтаў. Дык я дагэтуль не магу зразумець, якім чынам магу вызначыць іх прыналежнасьць да супрацоўнікаў бясьпекі", – заявіў на судзе Сяргей Сікора.

Выслухаўшы довады бакоў, судзьдзя Алена Савіцкая прыняла рашэньне часткова задаволіць пазоў. Сяргей Сікора павінен будзе прынесьці публічнае прабачэньне і аплаціць судовыя выдаткі (76 рублёў 59 капеек).

**23.04.2019** Полацкі **актывіст** і **блогер Алесь Круткін** быў затрыманы 20 красавіка па дарозе на мітынг у Берасьце, куды дабіраўся аўтаспынам. Ён правёў двое сутак у полацкім ізалятары і быў аштрафаваны на 15 базавых велічынь за заклік памаліцца 15 красавіка за Курапаты ля рэзыдэнцыі прэзыдэнта (арт. 23.34 КаАП).

Пра гэта Алесь Круткін паведаміў на сваёй старонцы ў Facebook. Раней паведамлялася, што пасьля 15 красавіка ад аўтара відэаблогу “Самакруткін” некалькі дзён




не было аніякіх зьвестак і што яго шукала міліцыя. Пасьля затрыманьня Круткін прызнаўся, што шэсьць сутак "быў у падпольлі".

"У суботу, 20.04, спрабаваў выехаць аўтастопам на мітынг у Берасьце, але затрымалі на шашы пад Полацкам… Адабралі тэлефон (ён быў разабраны, каб не маглі запеленгаваць) і завезьлі ў Полацкі РАУС. Потым сядзеў 2 сутак у камэры. 22.04 у судзе мне прысудзілі 15 базавых паводле артыкулу 23.34. 2 маіх мабільных тэлефоны арыштавалі да выплаты штрафу", – напісаў у фэйсбуку актывіст.

Паведаміў, што ў камэру да яго наведваўся начальнік упраўленьня аховы правапарадку і прафіляктыкі УУС Віцебскага аблвыканкаму падпалкоўнік Вячаслаў Пяткун. А начальнік Полацкага РАУС Леў Казаран папрасіў "не баламуціць ваду" ў яго "на раёне".

23 красавіка Алесь паведаміў, што яму тэлефанавалі судовыя выканаўцы з Полацкага райсуду і папярэдзілі, што ў яго ёсьць нібыта запазычанасьці перад Полацкім унівэрсытэтам, бо не адпрацаваў патрэбны тэрмін настаўнікам у школе. Намякалі, што можа не атрымаць візу.

**15.05.2019** Паўтары хвіліны спатрэбілася судзьдзі Віцебскага абласнога суду Сьвятлане Івановай, каб разгледзець скаргі **журналіста-фрылянсэра Зьмітра Лупача** на рашэньні Глыбоцкага і Шаркоўшчынскага судоў. Судзьдзя пастанавіла пакінуць скаргі без задавальненьня.

На судовае паседжаньне глыбоцкі журналіст прыехаць ня змог, таму скаргі разглядаліся безь яго і ў хуткасным рэжыме. Судзьдзя толькі зачытала артыкулы, паводле якіх глыбачанін быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці, і агучыла свае рашэньні. Пры гэтым нават не палічыла неабходным назваць сваё імя і прозьвішча.

"Сёньня Віцебскі абласны суд разгледзеў дзьве мае касацыйныя скаргі і пакінуў рашэньні судоў бязь зьменаў. На іншае я і не спадзяваўся, бо гэты судовы канвэер працуе ў дачыненьні да мяне ня першы год. У раённых судах я зьвяртаў увагу судзьдзяў на парушэньні з боку міліцыянтаў пры складаньні пратаколаў. Судзьдзі адказвалі, што зробяць ім пісьмовыя заўвагі, тым не менш мяне асудзілі", – пракамэнтаваў рашэньне абласнога суду Зьміцер Лупач.

Распавёў, што даводзіў судам, што ён зарэгістраваны прадпрымальнікам і можа здымаць на відэа ўсё, што не забаронена законам (від дзейнасьці – здымкі відэа), за гэта плаціць падаткі.

"Акрамя таго, суды парушаюць маё канстытуцыйнае права на збор і распаўсюд




інфармацыі", – дадаў журналіст.

**15.05.2019** Судзьдзя Наваполацкага суду Зінаіда Балаболава аштрафавала 15 траўня віцяблян **Алену Шабуню** і **Вячаслава Лазарава** на 637 рублёў кожнага за незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ (ч.2 арт. 22.9 КаАП). Паводле міліцэйскага пратаколу, у лютым 2019 году яны бралі інтэрвію ў жыхароў Наваполацку, якое потым зьявілася ў ток-шоў "Кожны з нас" на тэлеканале "Белсат".

Суд доўжыўся больш за тры гадзіны. Абвінавачаныя, якія даведаліся пра суд толькі напярэдадні, хадайнічалі аб азнаямленьні з матэрыяламі справы. Хадайніцтва задаволілі, але аказалася, што справы былі не прашытыя, і хвілін 20 пайшло на тое, каб іх, у прамым сэнсе, шылі ў кабінэце судзьдзі.

Журналісты-фрылянсэры Алена Шабуня і Вячаслаў Лазараў сваёй віны не прызналі. Падчас паседжаньня кожны зь іх заявіў некалькі адводаў судзьдзі і па 7 хадайніцтваў, частку якіх судзьдзя Балаболава проста вымушаная была задаволіць. Напрыклад, аб тым, каб было дазволена прысутнічаць у залі пазаштатнаму карэспандэнту тэлеканалу "Белсат". Але весьці відэазапіс падчас працэсу судзьдзя ўсё ж забараніла.

Сюжэт, які стаў часткай ток-шоў і спрычыніўся да ўзбуджэньня адміністрацыйнай справы, тычыўся пажару на заводзе "Палімір" у 2016 годзе. Таму сьведкамі па справе праходзілі працаўнікі заводу. У тым ліку – адзін з герояў тых падзей Андрэя Швілпо. Паводле іх тлумачэньняў, людзі, якім яны расказвалі пра пажар, не называлі сябе журналістамі "Белсату" і нават ня мелі відэакамэры – толькі фотаапарат.

У сваю чаргу, сьведка з боку абвінавачаньня інспэктар аховы правапарадку Наваполацкага ГАУС Аляксандар Шыкін прызнаўся ў судзе, што відэасачэньне за віцяблянамі было ўстаноўленае пасьля ананімнага тэлефанаваньня.

Нягледзячы на тое, што сьведка-міліцыянт блытаў факты, казаў пра мікрафон, які не фігуруе ў апэратыўных здымках, і няправільна апісваў вопратку Алены Шабуні, судзьдзя Зінаіда Балаболава палічыла віну журналістаў-фрылянсэраў даказанай і наклала на кожнага зь іх адміністрацыйныя штрафы ў памеры 25 базавых велічынь (па 637,50 рублёў).

**12.06.2019 Журналісты Алена Шабуня** і **Вячаслаў Лазараў** абскардзілі ў Віцебскім аблсудзе пастановы Наваполацкага суду, які аштрафаваў іх на 25 базавых велічынь кожнага за незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ (ч.2 арт. 22.9 КаАП). Судзьдзя Сьвятлана Іванова скаргі журналістаў не задаволіла і пакінула




прысуды ў сіле.

У скаргах Алена Шабуня і Вячаслаў Лазараў падкрэсьлівалі, што ажыцьцяўлялі сваё права на свабоду выказваньня ўласнага меркаваньня, гарантаванага міжнароднымі стандартамі і абавязкамі рэспублікі Беларусь, а таксама Канстытуцыяй. Доказаў таго, што ўзятае імі 21 лютага інтэрвію хоць якім-небудзь чынам замахвалася на інтарэсы дзяржаўнай ці грамадзкай бясьпекі, грамадзкага парадку, аховы здароўя, маралі ці на правы і свабоды іншых асобаў, у Наваполацкага суду не было.

"Прыцягненьне да адміністрацыйнай адказнасьці не за зьмест, а за факт зьяўленьня ў замежных СМІ ёсьць неабгрунтаваным абмежаваньнем свабоды меркаваньняў і права на атрыманьне і распаўсюд інфармацыі", – сьцьвярджалася ў скаргах.

Журналісты зьвярнулі ўвагу судзьдзі, што тэрмін прыцягненьня іх да адміністрацыйнай адказнасьці скончыўся яшчэ 21 красавіка (суд у Наваполацку адбыўся 15 траўня). Запэўнівалі, што фізычна не маглі займацца распаўсюдам інфармацыі з тэрыторыі сумежнай з Беларусьсю краіны, бо на той час знаходзіліся на радзіме.

Выслухаўшы аргумэнты скаржнікаў, судзьдзя Сьвятлана Іванова пастанавіла пакінуць прысуд Наваполацкага суду бязь зьменаў, а скаргі журналістаў без задавальненьня.

## Дзеяньні праваабаронцаў па адстойваньні грамадзкіх інтарэсаў



Андрэй Палуда

**28.09.2018** Віцебскі праваабаронца падаў заяўку на пікет. Згодна з заявай аб правядзеньні пікетаваньня, пададзенай **Леанідам Сьвецікам** у адміністрацыю Чыгуначнага раёну Віцебску, імпрэза мусіць адбыцца 12 кастрычніка на пляцоўцы, адмыслова вызначанай гарвыканкамам пад масавыя мерапрыемствы. Асноўная мэта пікету – публічна адзначыць у горадзе Сусьветны дзень супраць сьмяротнай кары.

Дзень супраць сьмяротнай кары прыпадае на 10 лістапада. Традыцыйна праваабаронцы Беларусі – адзінай краіны ў Эўропе, дзе дагэтуль выносяцца і выконваюцца сьмяротныя прысуды – не абмяжоўваюцца адным днём, а ладзяць розныя імпрэзы супраць пакараньня сьмерцю цягам тыдня.

"Сьмяротная кара, як сродак крымінальнага пакараньня, парушае неад'емнае права чалавека на жыцьцё, якое абвешчанае ва Ўсеагульнай дэклярацыі правоў чалавека, – адзначыў Леанід Сьвецік у заяўцы на пікет. – Даказана, што сьмяротнае пакараньне вядзе да дэгуманізацыі грамадзтва і ня толькі не памяншае колькасьць асабліва цяжкіх злачынстваў, але і часьцяком выклікае іх рост. Акрамя таго, ніводная судовая сыстэма не застрахаваная ад памылак. Гэта азначае, што пры наяўнасьці сьмяротнага пакараньня ў дзяржаве час ад часу непазьбежна будуць пакараныя невінаватыя".

**05.10.2018** У віцебскім "Бітлз-клюбе" 5 кастрычніка адбыўся фэст "Рок за жыцьцё". Імпрэза распачала Тыдзень супраць сьмяротнага пакараньня, які ад 5 да 10 кастрычніка праходзіць у Беларусі. Ідэю ўвядзеньня мараторыя на сьмяротную кару падтрымалі сваімі выступамі і песьнямі ў Віцебску вядомыя беларускія гурты Teleport, Re1ikt. РСП ("Разьбітае сэрца пацана") і NIZKIZ.

Фэст у Віцебску наведала больш за 200 чалавек. Большасьць зь іх (усе, хто хацеў) атрымалі ў падарунак майкі зь вялікім белым "НЕ" ("Скажы НЕ сьмяротнаму пакараньню") ад праваабарончага цэнтру "Вясна".

На фэсьце прысутнічалі **каардынатар кампаніі "Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня" Андрэй Палуда** і вядомы беларускі **праваабаронца Валянцін Стэфановіч** (ПЦ "Вясна"). Імпрэзу таксама наведалі віцебскія **праваабаронцы Павал Левінаў**, **Леанід Сьвецік** ды іншыя.

**08.10.2018** У звароце да судзьдзяў судовай калегіі па крымінальных справах Віцебскага аблсуду **праваабаронца Павал Левінаў** папрасіў прыпыніць вынясеньне сьмяротных прысудаў і замяніць такое пакараньне іншымі відамі. Разам са зваротам праваабаронца даслаў у калегію 16 асобнікаў спэцвыпуску газэты "Народная

Воля" – "Скажам НЕ сьмяротнаму пакараньню!".

Павал Левінаў нагадаў судзьдзям, што ад 5 да 10 кастрычніка ў Беларусі праходзіць Тыдзень супраць сьмяротнага пакараньня. Разам з тым выказаў шкадаваньне, што нікога зь іх не пабачыў на фэсьце "Рок за жыцьцё", які праходзіў у Віцебску ў межах гэтай акцыі. Больш таго, 6 кастрычніка ўстіупіў у сілу сьмяротны вырак, які 22 верасьня 2017 году вынесьлі судзьдзі Віцебскага абласнога суду.

"Гэты вырак суду ўзаконьвае інстытут легальных забойцаў, якія зьдзяйсьняюць наўмыснае забойства", – напісаў Левінаў.

У сваім лісьце прадстаўнік Беларускага Хэльсынскага камітэту ў Віцебскай вобласьці прыгадаў асноўныя моманты ў гісторыі сусьветнай юстыцыі, якія вялі да адмовы ад сьмяротнага пакараньня.

Павал Левінаў папрасіў разгледзець ягоны зварот на сумесным паседжаньні судовай калегіі, а таксама азнаёміць кожнага судзьдзю з інфармацыяй, зьмешчанай у спэцвыпуску газэты "Народная Воля" ад 5 кастрычніка 2018 году.

**11.11.2018** Пад слоганам "Розныя – роўныя" з 9 па 16 лістапада ў многіх гарадох Беларусі праходзіць тыдзень мерапрыемстваў супраць расізму і антысэмітызму. У Віцебску ў межах гэтай кампаніі прайшла Жывая бібліятэка.

Ініцыятарамі і арганізатарамі асьветніцкага тыдня выступілі праваабарончая арганізацыя "Human Constanta", цэнтар разьвіцьця эфэктыўнай камунікацыі "Жывая бібліятэка Беларусь", а таксама валянтэрская служба ПЦ "Вясна", МГА "Гендэрныя пэрспэктывы", праваабарончая ініцыятыва "Журналісты за талерантнасьць", Задзіночаньне беларускіх студэнтаў (Belarusian Students' Association), РПГА "Прававая ініцыятыва", асьветніцка-адукацыйная ініцыятыва "Праўныя дарэктары", Цэнтар беларускай мовы ў Гомелі, Кінаклюб 451F, ініцыятыва "Legalize Belarus", праект пра гендар і сэксуальнасьць "Makeout", сетка моладзевых ініцыятываў "Y-PEER Belarus".

Асноўная мэта мерапрыемстваў тыдня – паказаць людзям, што дыскрымінацыя зьяўляецца часткай нашага паўсядзённага жыцьця, і зь ёй можа сутыкнуцца кожны з нас незалежна ад полу, сацыяльнага статусу ці нацыянальнасьці, бо кожная з гэтых прыкмет можа стаць прычынай уціску, зьнявагі, кпінаў і зьдзекаў.

Фармат Жывой бібліятэкі: сустрэча "кнігаў" – людзей, што маюць тую ці іншую ідэнтычнасьць або погляды на жыцьцё, і "чытачоў" – удзельнікаў імпрэзы.

Пачуць жыцьцёвыя гісторыі 11 герояў-кнігаў на віцебскую сустрэчу прыйшло каля 50-ці маладзёнаў, у асноўным старшаклясьнікі. Яны змаглі даведацца, зь якімі праблемамі сутыкаюцца людзі з розных сацыяльных груп.

Расказаныя гісторыі павінны паспрыяць павышэньню папулярнасьці ў краіне ідэяў цярпімасьці, талерантнасьці і роўнасьці.

**25.11.2018** Заяўку на правядзеньне пікету падаў у адміністрацыю Чыгуначнага раёну Віцебску **праваабаронца Леанід Сьвецік**. Імпрэза, у якой паводле заяўкі возьмуць удзел дзесяць чалавек, мусіць адбыцца 10 сьнежня – менавіта ў гэты дзень 70 гадоў таму Генэральная Асамблея ААН зацьвердзіла Ўсеагульную дэклярацыю




правоў чалавека.

Мэта пікету, як яе абазначылі яго арганізатары: інфармаваньне грамадзян пра тое, што 10 сьнежня 1948 году ААН была прынятая Ўсеагульная дэклярацыя правоў чалавека; публічнае адзначэньне гэтай даты; прапаганда неабходнасьці выкананьня правоў чалавека; стварэньне дзяржавай умоваў, якія забясьпечваюць кожнай асобе рэалізацыю правоў і свабодаў, а таксама эфэктыўныя сродкі прававой абароны.

**04.12.2018** У Полацку адбылася сустрэча з **праваабаронцам Алесем Бяляцкім**. Імпрэза прайшла ў межах ініцыятывы "Жывая Мова" пры падтрымцы інфармацыйна-культурніцкага цэнтру "ІніцыАрт".

Падчас мерапрыемства вядомы праваабаронца прэзэнтаваў сваю кнігу "Халоднае крыло Радзімы", якая складаецца з занатовак, эсэ, інтэрвію. Гэта пятая кніга аўтара і своеасаблівы працяг кніг "Асьвечаныя беларушчынай" ды "Іртутнае срэбра жыцьця". Яны былі падрыхтаваныя падчас зьняволеньня Алеся Бяляцкага.

**06.12.2018** Віцебскія праваабаронцы павіншавалі адзінага ў краіне **палітвязьня**, свайго калегу і земляка **Міхаіла Жамчужнага** з Сусьветным днём правоў чалавека.

У сваіх віншаваньнях віцебскія актывісты праваабарончага руху высока ацанілі ўнёсак Жамчужнага ў справу абароны і пашырэньня фундамэнтальных правоў чалавека.

Знаходзячыся за кратамі, праваабаронца актыўна змагаецца за свае правы і правы іншых вязьняў. Кіраўніцтва папраўчай калёніі №9 неаднаразова карала яго за актыўную праваабарончую працу зьмяшчэньнем у штрафны ізалятар ці суровым турэмным рэжымам. Міхаіл Ігаравіч, як чалавек ужо немалады, зь цяжкасьцю зносіць усе гэтыя выпрабаваньні.

**08.12.2018** Некалькі палачан з ініцыятывы Полацкага праваабарончага таварыства накіравалі пры канцы лістапада ў мясцовы райвыканкам пісьмовую прапанову. Грамадзяне папрасілі надрукаваць у дзяржаўнай газэце "Полацкі веснік" Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека да 70-годзьдзя яе прыняцьця. Падобная прапанова была накіраваная і ў рэдакцыю газэты.

Адказу на прапанову ад мясцовых уладаў палачане не атрымалі. Затое прыйшоў адказ ад галоўнай рэдактаркі "Полацкага весніка" Сьвятланы Чаркоўскай: "Тэкст дэкляарацыі не адаптаваны для публікацыі ў раённай газэце", – патлумачыла яна. Зрэшты, паабяцала, што тэма Міжнароднага дня правоў чалавека ўсё-ткі знойдзе адлюстраваньне на старонках выданьня – "у зацемцы пазаштат-

нага аўтара "Гісторыя і традыцыі"".

У сваім звароце ў Полацкі райвыканкам грамадзяне адзначылі, што мясцовымі ўладамі прыняты дакумэнт пад назвай "Пашпарт тэрытарыяльна-арыентаванага разьвіцьця Полацкага раёну". У гэтым дакумэнце ўлады згадваюць свае забавязаньні ў галіне правоў чалавека: "Захаваньне правоў чалавека зьяўляецца асновай любога дэмакратычнага грамадзтва і прававой дзяржавы... У сваёй дзейнасьці Мясцовая ініцыятыўная група, таксама як і яе партнэры, будуць арыентавацца ў тым ліку і на міжнародныя нормы, стандарты і прынцыпы правоў чалавека", – сказана ў пашпарце тэрытарыяльна-арыентаванага разьвіцьця.

Дзеля рэалізацыі прынятых плянаў разьвіцьця рэгіёну ўлады запытваюць фінансавыя сродкі ад Эўрапейскага зьвязу. Аднак, як адзначаюць аўтары звароту ў выканкам, правы чалавека ў рэгіёне не выконваюцца. Сьведчаньне гэтаму – забарона з боку ўладаў на правядзеньне грамадзянскімі актывістамі пікетаў і мітынгаў і прыцягненьне іх арганізатараў да адміністрацыйнай адказнасьці. Запытваць рэсурсы на разьвіцьцё рэгіёну і пры гэтым парушаць правы грамадзян на выказваньне думкі і правядзеньне сходаў ёсьць махлярствам, – мяркуюць жыхары Полацку.

Апроч прапановы апублікаваць к 10 сьнежня Ўсеагульную дэклярацыю правоў чалавека ў раённай газэце, палачане таксама папрасілі чыноўнікаў райвыканкаму забясьпечыць жыхарам гораду Полацку выкананьне пералічаных у дэклярацыі правоў. Ці прыслухаюцца службоўцы райвыканкаму да гэтай просьбы, пакажа найбліжэйшая будучыня. Тым часам, што тычыцца газэты "Полацкі веснік", у апошнім яе нумары пра дэклярацыю правоў чалавека няма ані слова.

**10.12.2018** 10 сьнежня ў сьвеце адзначаецца Міжнародны дзень правоў чалавека. Такая дата выбраная невыпадкова: у гэты дзень у 1948 годзе Генэральная асамблея ААН прыняла першы ўнівэрсальны міжнародны акт па правах чалавека – Усеагульную дэклярацыю правоў чалавека. Каб публічна адзначыць 70-гадовы юбілей дэклярацыі, праваабаронцы Віцебску хацелі зладзіць пікет. Аднак мясцовыя ўлады на іх заяўку далі адмоўны адказ.

Імпрэза, у якой меркаваўся ўдзел дзесяці чалавек, мусіла адбыцца на адной з трох пляцовак у горадзе, якія адмыслова адведзеныя Віцебскім гарвыканкамам пад масавыя мерапрыемствы. Прычынай забароны пікету намесьніца кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёну Алена Шарай назвала адсутнасьць у яго арганізатараў дамоваў, прадугледжаных рашэньнем гарвыканкаму № 881 ад 10 ліпеня 2009 году "Аб масавых мерапрыемствах у горадзе Віцебску".

Кажа заяўнік забароненага мерапрыемства **праваабаронца Леанід Сьвецік**: "Забарона правядзеньня праваабарончай акцыі сьведчыць пра тое, што для віцебскіх уладаў правы чалавека не зьяўляюцца каштоўнасьцю. Нават круглая дата не пасунула іх даць дазвол на пікет. Тым ня менш забароны і перашкоды толькі натхняюць праваабаронцаў на працу ў справе прасоўваньня і прапаганду правоў чалавека ў беларускім грамадзтве".

**28.12.2018** Віцебскі праваабаронца і сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў зьвярнуўся ў гарвыканкам з прапановай, каб на арганізаваныя ўладамі прэс-кан-




фэрэнцыі пускалі ўсіх ахвотных прадстаўнікоў СМІ, а ня толькі з "праверaных выданьняў".

Праваабаронца мяркуе, што абмежаваньні допуску журналістаў на прэсавыя канфэрэнцыі парушаюць права на свабоду атрыманьня інфармацыі. Сьведкам менавіта такога прэцэдэнту **Павал Левінаў** стаў 5 лістапада, калі ў Віцебскім гарвыканкаме праходзіла прэс-канфэрэнцыя наконт вельмі важнай для жыцьця гораду праблемы: закрыцьця на рамонт Полацкага шляхаправоду.

"На прэс-канфэрэнцыю намесьніка старшыні гарвыканкаму Сяргея Саглаева дапусьцілі толькі абмежаваную колькасьць прадстаўнікоў СМІ. "Мы запрашаем толькі правераныя СМІ", – сказалі на ўваходзе тым журналістам, якіх у залю не прапусьцілі. Вядома, так быць не павінна, асабліва калі вядзецца пра найважнейшыя пытаньні гарадзкога жыцьця", – кажа Павал Левінаў.

Доступ на прэс-канфэрэнцыі не мусіць рэгуляваецца прыватнымі сымпатыямі ці антыпатыямі старшыні гарвыканкаму ці яго намесьнікаў, лічыць Павал Левінаў.

Ён напісаў ў гарвыканкам пералік прапановаў датычна арганізацыі мерапрыемстваў для журналістаў. Галоўных умоў, на ягоную думку, мусіць быць дзьве. Каб пра прэс-канфэрэнцыі, а таксама паседжаньні гарвыканкаму і іншыя мерапрыемствы, цікавыя гараджанам, паведамлялася загадзя, а не пастфактум. І каб прадстаўнікоў СМІ на іх дапускалі без дадатковага ўзгадненьня, а па ўласным жаданьні журналіста або рэдакцыі.

Адказ за подпісам намесьніка старшыні Віцебскага гарвыканкаму Віктара Глушына быў кароткі: "Прапановы прынятыя да ведама".

**02.01.2019 Праваабаронца Павал Левінаў** патрапіў 2 студзеня 2019 году на прыём да старшыні Віцебскага абласнога савету дэпутатаў Уладзімера Цярэнцьева. Перад тым як зайсьці ў кабінэт да чыноўніка, Левінаў пераапрануўся ў Дзеда Мароза. Цярэнцьеў быў уражаны…

Павал Левінаў перадаў Цярэнцьеву зварот з прапановай заснаваць пастаянную камісію Віцебскага абласнога Савету дэпутатаў па пытаньнях абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян, гарантаваных міжнароднымі абавязкамі Рэспублікі Беларусь.

Зараз у аблсавеце дзейнічае пяць пастаянных камісій, але ўсе яны працуюць у іншых накірунках.

"Менавіта ў аблсавеце я бачу тую структуру, дзе прадстаўнікі праваабаронцаў і грамадзянскай супольнасьцяў змаглі б знайсьці пляцоўку для сумесных дзеяньняў

па кантролі за выкананьнем правоў чалавека і хуткім рэагаваньні", – выказаў сваё бачаньне Павал Левінаў.

Паводле праваабаронцы, Рэспубліка Беларусь зьяўляецца зараз адным зь лідэраў па колькасьці індывідуальных паведамленьняў у КПЧ ААН аб парушэньні правоў і свабод грамадзян, а Віцебская вобласьць "першынствуе" сярод іншых рэгіёнаў краіны.

На думку Паўла Левінава, стварэньне прапанаванай камісіі ў абласным Савеце паспрыяе абароне правоў і свабод грамадзян, а тым самым – паменшыць плынь зваротаў у Камітэт ААН па правах чалавека.

Праваабаронца Беларускага Хэльсынскага камітэту мяркуе, што паседжаньні такой камісіі варта было б праводзіць не радзей аднаго разу на квартал. А на паседжаньні запрашаць прадстаўнікоў праваабарончых арганізацый, грамадзянскай супольнасьці, сродкаў масавай інфармацыі і блогасфэры.

Прапанаваў таксама, каб разам з праваабаронцамі і грамадзкімі актывістамі ў аблсавеце было распрацаванае Палажэньне "Аб грамадзкім камітэце па правах чалавека Віцебскай вобласьці".

Падчас размовы праваабаронца агучыў таксама жыльлёвыя праблемы некаторых шматдзетных маці ў Віцебску, праблемы зямельнага падатку ды іншыя пытаньні.

**14.01.2019** Падсумоўваючы вынікі мінулага году, рэдакцыя самага ўплывовага праваабарончага інтэрнэт-рэсурсу Віцебскай вобласьці адзначыла заслугі як асобных актывістаў, гэтак і арганізацыяў ды грамадзянскіх ініцыятываў у прасоўваньні і абароне правоў чалавека ў рэгіёне.

У сьпісе прэтэндэнтаў на званьне "Абаронца правоў чалавека году" значылася з два тузіны кандыдатаў. Зь іх журналісты і праваабаронцы, што супрацоўнічаюць з ВВ, выбралі пераможцаў у дзесяці намінацыях.

Варта згадаць, што большасьць з тых, хто сталі пераможцамі, ня ёсьць так званымі прафэсійнымі праваабаронцамі або сябрамі праваабарончых арганізацыяў. Сярод Абаронцаў правоў чалавеку году паводле Віцебскай вясны – грамадзкія актывісты, журналісты, палітыкі і нават былыя вязьні, якія ў сваёй дзейнасьці выявілі неабыякавасьць да патрэбаў тых, хто побач, ды прасоўвалі каштоўнасьці правоў чалавека і ў рэгіёне, і ва ўсёй Беларусі.

Вось поўны сьпіс Абаронцаў правоў чалавека – 2018:

– **Міхаіл Жамчужны**, Віцебск. Намінацыя "За мужнасьць, выяўленую ў абароне правоў чалавека".

– **Васіль Берасьнеў**, Ворша. Намінацыя "За ўнёсак у абарону правоў чалавека і разьвіцьцё праваабарончага руху".

– Арт-прастора **VZAP**, Віцебск. Намінацыя "За разьвіцьцё традыцыяў абароны правоў чалавека сярод моладзі і ўнёсак у праваабарончую адукацыю".

– **Павал Левінаў**, Віцебск. Намінацыя "За экспэртную дзейнасьць у галіне правоў чалавека".



Леанід Сьвецік

– **Мікола Шарах**, Полацак. Намінацыя "За адстойваньне правоў чалавека ў судзе".

– **Алан Сьміт**, Лёндан, Вялікая Брытанія. Намінацыя "За абарону вязьняў".

– **Зьміцер Лупач**, **Тацяна Смоткіна**, Глыбокае. Намінацыя "За журналісцкую дзейнасьць у прасоўваньні каштоўнасьцяў правоў чалавека".

– **Актывісткі аргкамітэту партыі "Беларуская хрысьціянская дэмакратыя" Ірына Захарава**, **Тацяна Севярынец**, **Алена Шабуня**, **Алена Янушкоўская**, Віцебск. Намінацыя "За дзейнасьць у абароне сацыяльных правоў і інтарэсаў мясцовых супольнасьцяў".

– **Бітлз-клюб "Паддашак"**, Віцебск. Намінацыя "За абарону правоў чалавека сродкамі культуры і мастацтва".

– Рэсурс **CatholicNews.by**, Глыбокае. Намінацыя "За прасоўваньне ідэі талерантнасьці".

**17.01.2019** Віцебскі **праваабаронца Леанід Сьвецік** зьвярнуўся ў Канстытуцыйны Суд з прапановай даць заключэньне наконт адпаведнасьці законаў ды іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць працу пэнітэнцыярных установаў пры наяўнасьці там грамадзян іншых краін.

Згодна з ч.1 арт.158 Закону "Аб канстытуцыйным судаводзтве" падставай для ўзбуджэньня справы аб ліквідацыі ў нарматыўных прававых актах прабелаў, выключэньні калізій і прававой недакладнасьці могуць быць звароты дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, а таксама грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў.

Менавіта гэтай законнай магчымасьцю скарыстаўся праваабаронца: паведаміў у сваім звароце ў Канстытуцыйны Суд аб наяўнасьці прагалаў у беларускім заканадаўстве. Напісаў, што гэтыя прагалы спараджаюць шмат прававых праблем у замежных грамадзян, якія адбываюць крымінальныя пакараньні ў выглядзе пазбаўленьня волі ў беларускіх пэнітэнцыярных установах.

Беларусь зараз праводзіць палітыку максымальнай адкрытасьці сьвету. Як вынік, у краіну з турыстычнымі ды іншымі мэтамі прыяжджаюць тысячы грамадзян з-за мяжы. Але такая адкрытасьць мае і нэгатыўны бок, бо некаторыя чужаземцы зьдзяйсьняюць у Беларусі супрацьпраўныя дзеяньні, атрымліваючы потым у беларускіх судах розныя тэрміны пазбаўленьня волі.

Пры адбываньні пакараньняў цяжэй за ўсё бывае тым зьняволеным замежнікам, хто ня можа атрымаць консульскую дапамогу – праз адсутнасьць дыпмісіі іх краі-

ны ў Беларусі.

Выхаваныя ў іншых культурных і прававых традыцыях, замежныя грамадзяне зь цяжкасьцю пераносяць знаходжаньне ў пэнітэнцыярных установах нашай краіны. Бо чужаземцы ня ведаюць ані рускай, ані беларускай мовы – ім патрэбны перакладчык альбо паскораныя курсы вывучэньня моваў.

Іх становішча абцяжарваецца і тым, што самі супрацоўнікі папраўчых калёнiй у Беларусі замежнымі мовамі (хаця б – ангельскай) не валодаюць. А яшчэ тым, што дзяржаўныя ўстановы не прымаюць прапаноў, заяў і скаргаў на замежных мовах.

Больш таго, нашае заканадаўства прадугледжвае абмежаваньні на магчымасьць перадач для замежных грамадзян у папраўчыя ўстановы. Перадачы прымаюцца толькі ад грамадзян Беларусі. Роўна як і грашовыя пераказы.

У замежнікаў адсутнічае таксама магчымасьць адпраўляць у папраўчай установе рэлігійныя культы, рытуалы і абрады.

Няякасна праведзеныя сьледчыя дзеяньні і пастаноўлены прысуд выклікаюць у грамадзян недавер да законнасьці іх затрыманьня і арышту, вялікія сумненьні ў адэкватнасьці прысуду і законнасьці пакараньня.

Адсутнасьць элемэнтарных бытавых умоваў, празьмерныя абмежаваньні ў задаволеньні натуральных людзкіх патрэбаў замежнікі ўспрымаюць не інакш як жорсткае, бесчалавечнае абыходжаньне, што зьневажае іх чалавечую годнасьць.

Пацьверджаньняў таму – шмат. Гэтак, **зьняволены папраўчай калёніі №3 ("Віцьба") грамадзянін Калюмбіі Хіральда Кальдэрон** просіць хоць як дапамагчы яму скантактавацца з амбасадай Калюмбіі ў любой краіне сьвету. У Беларусі амбасады альбо консульства гэтай краіны няма, а пасольства ў Расеі на ягоныя лісты не адказвае.

"Умовы майго ўтрыманьня ў гэтым месцы вельмі цяжкія, а знайсьці дапамогу – амаль немагчыма. Усе баяцца…" – піша ён.

Паведамленьні пра невыносна цяжкія ўмовы адбываньня пакараньня ў ПК-3 дасылалі раней і **грамадзянін Вялікабрытаніі Алан Сьміт**, і **грамадзянін Японіі Даічы Ёшыда**.

"Абагульняючы наяўную інфармацыю, маю сьцьвярджаць, што замежнікі, якія адбываюць пакараньні за крымінальныя злачынствы ў пэнітэнцыярных установах нашай краіны, падпадаюць пад незаконныя абмежаваньні правоў і ўшчамленьне іх законных інтарэсаў", – кажа праваабаронца Леанід Сьвецік.

Ён канстатуе, што правапрымяняльная практыка, якая склалася ў сыстэме ДВП МУС РБ, не адпавядае міжнародным стандартам правоў чалавека. У ёй не выконваюцца мінімальныя міжнародныя стандартныя правілы абыходжаньня са зьняволенымі, а таксама патрабаваньні (ня менш за сем) Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адносна зьняволеных замежных грамадзян.

"Нявырашанасьць гэтых пытаньняў ставіць пад сумненьне прывабнасьць нашай краіны для замежных турыстаў, стварае адмоўны імідж дзяржавы, зьніжае турыстычны патэнцыял Беларусі", – перакананы Леанід Сьвецік.




Нягледзячы на тое, што закон дае магчымасьць зьвярнуцца з гэтай нагоды ў Канстытуцыйны суд любому грамадзяніну, начальнік сакратарыяту Селядзеўскі адмовіў праваабаронцу ў разглядзе ягонага звароту па сутнасьці.

Ён паведаміў заяўніку, што пытаньні аб канстытуцыйнасьці нарматыўных прававых актаў Канстытуцыйны суд разглядае на падставе адпаведных прапаноў упаўнаважаных органаў: Прэзыдэнта РБ, Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, Савету Рэспублікі, Вярхоўнага суду, Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь.

"У Рэспубліцы Беларусь для грамадзян і арганізацый устаноўлены ўскосны доступ да канстытуцыйнага правасудзьдзя. У адпаведнасьці з ч.4 арт.22 "Кодэксу аб судаводзтве і статусе судзьдзяў", грамадзяне, якія мяркуюць, што іхныя правы, свабоды і законныя інтарэсы парушаюцца прымененым у канкрэтным рашэньні дзяржаўнага органа альбо пастанове суду агульнай юрысдыкцыі нарматыўным прававым актам, маюць права зьвярнуцца зь ініцыятывай аб праверцы канстытуцыйнасьці гэтага нарматыўнага прававога акту да Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, вышэйзгаданым органам, якія надзеленыя правам уносіць у Канстытуцыйны суд такія прапановы", – піша чыноўнік праваабаронцу.

Камэнтуючы адмову разглядаць ягоны зварот, Леанід Сьвецік выказвае шкадаваньне, што Канстытуцыйны суд не праявіў належнай увагі да пытаньня прававога становішча замежных грамадзян у папраўчых установах Беларусі, не праявіў належнага чалавекалюбства і гуманізму, якімі прасякнуты Асноўны Закон нашай краіны.

**18.01.2019 Віцебскі праваабаронца** інвалід 2-й групы **Валер Міськікаў** паспрабаваў атрымаць дапамогу ад Чырвонага Крыжа. Не адразу, але атрымалася. "Чырвоны Крыж можа дапамагчы нават з харчамі, але толькі тым, хто ведае пра такую магчымасьць, хто валодае інфармацыяй…" – кажа Міськікаў.

Увесну 2018-га Валер Міськікаў натрапіў на інтэрвію кіраўнікоў Швайцарскага Чырвонага Крыжа, якія паведамлялі, што на праекты ў Беларусі ў 2017 годзе было выдаткавана каля 300 тыс. швайцарскіх франкаў – "у знак салідарнасьці ад народу Швэйцарыі народу Беларусі". Казалі і пра праблемы, на вырашэньне якіх пойдзе плянаваная на будучыню дапамога: "праблемы пажылых людзей, здаровае старэньне і г.д.".

"І тады я падумаў: а ці змагу я, як самотны пэнсіянэр і інвалід 2-й групы, атрымаць такую дапамогу для "здаровага старэньня" і ці можа гэта зрабіць любы беларускі пэнсіянэр, які знаходзіцца ў цяжкім эканамічным становішчы?.." – расказвае Міськікаў.

Валер Місьнікаў зьвярнуўся спачатку ў Віцебскую абласную арганізацыю Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Запытаўся, ці атрымлівала абласная арганізацыя ў 2017-18 гадах гуманітарную дапамогу ад Швайцарскага Чырвонага Крыжа на праекты для інвалідаў. Старшыня абласной арганізацыі Галіна Жаланава адказала, што гуманітарнай дапамогі не атрымлівалі і што праекты, зьвязаныя з аказаньнем дапамогі інвалідам 2-й групы з паслабленай апорна-рухальнай сыстэмай, у рэгіёне не ажыцьцяўляюцца.

Тады віцяблянін напісаў зварот на імя выконваючага кампэтэнцыі старшыні Прэзыдыюму БТЧК Дзьмітрыю Піневічу. Задаў тыя ж пытаньні. У якасьці аргумэнту паведаміў, што на плянавую рэабілітацыю ён штомесяц аддае са сваёй пэнсіі 150 рублёў за лекі, а рэальнай матэрыяльнай падтрымкі ад дзяржавы не атрымлівае.

"Магчыма пра мяне забыўся народ Швайцарыі альбо Беларусі", – з горкай іроніяй пісаў Місьнікаў.

З рэспубліканскага офісу ЧК Місьнікаву паведамілі, што ягоны зварот быў накіраваны ў абласную арганізацыю, і запэўнілі, што адказ ён абавязкова атрымае. Сапраўды, 9 студзеня пэнсіянэр атрымаў зь Віцебскай абласной арганізацыі Чырвонага Крыжа адказ, які, па сутнасьці, дубляваў папярэдні (што падобныя праекты не рэалізуюцца), але меў важны дадатак.

"Разам з тым Віцебская абласная арганізацыя Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа мае магчымасьць аказаць Вам харчовую дапамогу, для гэтага патрэбна падаць у арганізацыю наступныя дакумэнты: пашпарт, пасьведчаньне пэнсіянэра, даведку аб памеры пэнсіі за 3 месяцы, пасьведчаньне інваліда", – паведамілі з арганізацыі.

У выніку Валер Місьнікаў атрымаў у якасьці харчовай дапамогі пляшку алею, муку, цукар, чатыры бляшанкі розных кансэрваў. "Чым не падтрымка чалавеку, які ўвогуле аказаўся бязь ежы. Таму вялікі дзякуй!" – кажа.

Валер Місьнікаў дадае, што ён быў не адзін такі, хто прыходзіў у Чырвоны Крыж па харчовую дапамогу, але наколькі шырокі круг такіх людзей – ня ведае. Мяркуе, што такіх людзей магло б быць нашмат больш, бо пэнсіянэраў, якія зараз жывуць на мяжы жабрацтва – вельмі шмат.

"Але інфармацыі пра магчымую дапамогу няма, і ніхто пэнсіянэрам пра гэта ня кажа. Я б і сам ня ведаў, калі б не прачытаў той артыкул пра швэйцарцаў", – запэўнівае Місьнікаў.

**07.02.2019 Праваабаронца Павал Левінаў** атрымаў адказ на свой зварот, у якім прапаноўваў заснаваць у Віцебскім абласным Савеце дэпутатаў пастаянную камісію па пытаньнях абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян. Старшыня аблсавету Ўладзімер Цярэнцьеў паабяцаў, што пытаньне стварэньня такой камісіі будзе разгледжанае ўжо на чарговай сэсіі.

"Пытаньне аб стварэньні пастаяннай камісіі па пытаньнях абароны правоў чалавека будзе ўнесенае на разгляд дэпутатаў Віцебскага абласнога Савету дэпутатаў на чарговай сэсіі Віцебскага абласнога Савету дэпутатаў", – гаворыцца ў адказе на зварот праваабаронцы.

"Аб выніках разгляду Вы будзеце паінфармаваныя дадаткова", – паведамляецца ў лісьце.

Такі адказ ня цалкам задаволіў Паўла Левінава. 31 сьнежня праваабаронца накіраваў у абласны савет яшчэ адзін зварот – з просьбай правесьці паседжаньне сэсіі, на якой будзе разглядацца гэтае пытаньне, "адкрыта і публічна, загадзя паінфармаваўшы аб месцы, даце і часе сэсіі".

Левінаў нагадаў старшыню аблсавету, што згодна з Законам "Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні" "сэсіі Савету праводзяцца адкрыта і публічна, грамадзяне маюць права ўносіць у Савет матываваныя прапановы аб неабходнасьці прыняцьця рашэньняў Савету, пры гэтым разгляд такіх прапаноў мусіць адбывацца з удзелам прадстаўнікоў грамадзян".

Праваабаронца прапануе таксама, каб Віцебскі абласны Савет дэпутатаў разам з прадстаўнікамі праваабарончых арганізацый і грамадзянскай супольнасьці распрацавалі Палажэньне "Аб грамадзкім камітэце па правах чалавека Віцебскай вобласьці".

Зараз у Віцебскім абласным Савеце дзейнічае пяць пастаянных камісій – па пытаньнях агракомплексу і экалёгіі, эканамічнага разьвіцьця, мясцовага самакіраваньня, прамысловасьці і ЖКГ, а таксама па пытаньнях сацыяльнай сфэры. Ніводная зь іх не не закранае наўпрост пытаньні абароны правоў чалавека.

На думку Паўла Левінава, стварэньне камісіі па правах чалавека ў абласным Савеце паспрыяе абароне правоў і свабод грамадзян, а гэтым самым – паменшыць колькасьць індывідуальных зваротаў у Камітэт ААН па правах чалавека ад жыхароў Віцебшчыны.

Па колькасьці такіх зваротаў у КПЧ ААН Віцебская вобласьць займае зараз першае месца сярод рэгіёнаў Беларусі.

**12.02.2019** У Віцебску зьмяніўся парадак правядзеньня масавых мерапрыемстваў. Гэта вынікае з адказу, які атрымаў на свой зварот да гарадзкіх уладаў **праваабаронца Леанід Сьвецік**.

У звароце праваабаронца прапанаваў унесьці зьмены ў мясцовы нарматыўны прававы акт, які рэгуляваў падрыхтоўку і правядзеньне масавых мерапрыемстваў у межах Віцебску. У прыватнасьці, выказаў прапанову павялічыць колькасьць дазволеных і прыдатных для правядзеньня масавых мерапрыемстваў месцаў, дадаўшы да трох існых новыя пляцоўкі.

Таксама прапанаваў скасаваць патрабаваньне, згодна зь якім заяўнікі, яшчэ да прыняцьця мясцовымі ўладамі рашэньня наконт правядзеньня мерапрыемства, былі абавязаныя заключаць дамовы на ахову грамадзкага парадку, прыбіраньне тэрыторыі і аказаньне мэдычнай дапамогі.

Улады паведамілі грамадзкаму актывісту, што 18 студзеня 2019 году Віцебскі гарвыканкам прыняў рашэньне № 56 "Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у рашэньне Віцебскага гарадзкога выканаўчага камітэту ад 10 ліпеня 2009 г. №881".

Гэтым рашэньнем пункт аб неабходнасьці дамоваў на абслугоўваньне масавага

мерапрыемства быў скасаваны.

Сапраўды, згодна з унесенымі зьменамі, з рашэньня гарвыканкаму №881 ад 10 ліпеня 2009 году быў выключаны пункт тры. Якраз у ім раней вызначалася, што ў выпадках, калі мерапрыемства адбывалася без удзелу органаў дзяржаўнай улады, арганізатары мерапрыемства павінны былі пракласьці да заявы аб правядзеньні мерапрыемства дамовы з УУС аблвыканкаму (альбо з аддзелам УС адміністрацыі раёну, на тэрыторыі якога меркавалася праводзіць мерапрыемства), з упраўленьнем аховы здароўя аблвыканкаму і прадпрыемствам "Віцебская ЖКГ".

Другая зьмена закранула п.4 вышэйзгаданага рашэньня. Гэты пункт дапоўнілі ўсяго адным словам – "паведамленьні". Цяпер гучыць так: "Устанавіць, што Віцебскі гарадзкі выканаўчы камітэт разглядае заявы (паведамленьні) аб правядзеньні масавых мерапрыемстваў, калі масавае мерапрыемства мяркуецца праводзіць на тэрыторыі некалькіх раёнаў гораду Віцебску. Адміністрацыі раёнаў гораду Віцебску разглядаюць заявы аб правядзеньні масавых мерапрыемстваў, калі масавае мерапрыемства мяркуецца праводзіць на тэрыторыі адпаведнага раёну гораду Віцебску".

Прапанова правабаронцы павялічыць колькасьць дазволеных месцаў для правядзеньня масавых мерапрыемстваў падтрымкі не атрымала.

"Пунктам 2 рашэньня гарвыканкаму ад 10 ліпеня 2009 году №881 "Аб масавых мерапрыемствах у горадзе Віцебску" ў кожным раёне г Віцебску вызначанае пастаяннае месца правядзеньня масавых мерапрыемстваў у горадзе. Неабходнасьць зьменаў у частцы вызначэньня іншых месцаў для правядзеньня масавых мерапрыемстваў адсутнічае", – абазначыў пазыцыю ўладаў намесьнік старшыні Віцебскага гарвыканкаму Віктар Глушын.

"Зьмены рашэньня мясцовых уладаў адносна арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў, якіх чакалі і дамагаліся віцебскія праваабаронцы і грамадзкія актывісты, адбыліся. Гэта абнадзейвае і надае пэўнага аптымізму тым грамадзянам, якія зацікаўленыя ў ажыцьцяўленьні права на публічнае выказваньне сваіх палітычных поглядаў і грамадзянскай пазыцыі.

Як будуць працаваць гэтыя, на першы погляд, лібэральныя папраўкі ў рэчаіснасьці – пабачым ужо неўзабаве", – камэнтуе зьмены мясцовага прававога акту праваабаронца Леанід Сьвецік.

**28.02.2019 Юрыст праваабарончага цэнтру "Вясна" Павал Сапелка** прэзэнтаваў у Віцебску новы мультымэдыйны праект "Бяз права на расправу", які скіраваны на выяўленьне выпадкаў жорсткага, нялюдзкага абыходжаньня і катаваньняў з боку праваахоўных органаў.

Як патлумачыў выступоўца, ПЦ "Вясна" цягам 20 гадоў займаецца праблемамі катаваньняў ды жорсткага абыходжаньня, якое зьневажае чалавечую годнасьць. Але пачынаючы з кастрычніка 2018 году на адмысловым сайце праекту разьмяшчаюцца канкрэтныя гісторыі людзей, якія самі траплялі ў падобныя сытуацыі. Свае гісторыі распавядалі ня толькі жыхары Менску, але ўсіх рэгіёнаў Беларусі.

На сайце #БезПраваНаРасправу разьмешчаныя таксама парады для тых, хто стаў




ахвярай жорсткага абыходжаньня, узоры зваротаў і скаргаў.

Людзі часта не разумеюць, што такое жорсткае абыходжаньне, не ўяўляюць маштабу праблемы. Найчасьцей жорсткасьць успрымаецца гэтак: пабілі чалавека ў міліцыі, той выцер кроў ды пайшоў да праваабаронцаў. Але ёсьць маса іншых выпадкаў, якія носяць схаваны характар, і людзі не заўсёды гатовыя гаварыць пра гэта.

Ці можна, напрыклад, лічыць правамернымі такія дзеяньні, калі затрыманага па адміністрацыйнай справе вядуць у суд у кайданках? І калі кайданкі могуць быць дарэчы пры затрыманьні крымінальніка, то яны цалкам непатрэбныя пры адміністрацыйным затрыманьні. У гэтым выпадку яны ёсьць нічым іншым, як сродкам прыніжэньня.

Ці яшчэ адзін прыклад. Хто б мог падумаць, што, атрымаўшы 8 гадоў турмы ў 2003 годзе, можна заставацца за кратамі і ў 2019-м? Неверагодна, але толькі "за злоснае непадпарадкаваньне адміністрацыі калёніі і перашкоды ў зьдзяйсненьні яе функцыяў" асуджаны атрымаў ужо 8 пакараньняў і можа, у лепшым выпадку, выйсьці на волю толькі яшчэ праз 2,5 гады. Гаворка пра сумна вядомы артыкул 411.

Вялікая праблема і ў тым, што Беларусь пакуль не выконвае патрабаваньняў міжнародных органаў аб стварэньні мэханізму барацьбы з катаваньнямі і папярэджаньнем жорсткага абыходжаньня. У Беларусі дасюль не існуе органу, які займаўся б выяўленьнем і доказам фактаў жорсткага, бесчалавечнага абыходжаньня і катаваньняў.

У дзяржаве мусіць быць створаны нацыянальны прэвэнтыўны мэханізм, лічыць Сапелка. А адказныя амбудсмэны павінныя мець права прыйсьці ў любы час і ў любое месца пазбаўленьня волі без папярэджаньня і выканаць сваю справу па назіраньні (так гэта працуе, напрыклад, у Малдове).

"Сёе-тое робіцца і ў Беларусі, але гэтага недастаткова. Зараз можна скардзіцца на жорсткасьць, праяўленую супрацоўнікамі ўнутраных справаў, ня толькі ў сьледчы камітэт, але і ў пракуратуру", – распавядае Павал Сапелка.

"Так склалася, але праваабаронцы ня могуць наўпрост кантактаваць з нашым урадам і дзяржавай. Рэальнага дыялёгу з уладамі, на жаль, наладзіць не атрымліваецца. Адзінае, што можам, – гэта ўплываць на тыя ці іншыя пытаньні праз розныя міжнародныя інстытуты. І калі гэта нейкім чынам працуе, мы працягваем рабіць гэта", – падкрэсьлівае праваабаронца.

Павал Сапелка расказаў, што летась некалькі праваабарончых арганізацыяў вы-

ступілі з альтэрнатыўным дакладам у Камітэце ААН супраць катаваньняў. Рабіла сваю справаздачу і дзяржава.

"Але калі задача дзяржавы – паказаць, як у пытаньні барацьбы з катаваньнямі ўсё цудоўна, то задача праваабаронцаў заключалася ў выяўленьні рэальных праблемаў, зьвязаных з гэтай тэматыкай", – заўважыў Сапелка.

Ён кажа, што Беларусь дагэтуль ня мае артыкулу, які б прадугледжваў крымінальную адказнасьць за акты катаваньняў і жорсткага абыходжаньня. Таму многія выпадкі супрацьпраўных дзеяньняў праваахоўнікаў папросту ня ўлічваюцца і застаюцца па-за ўвагай праваабаронцаў і грамадзтва.

Пасьля выступу ўдзельнікі сустрэчы задавалі юрысту пытаньні аб законнасьці затрыманьня па адміністрацыйным правапарушэньні на 72 гадзіны, невыкананьні дзяржавай рашэньняў Камітэту пра правах чалавека ААН ды іншыя. Найбольш вострыя і балючыя пытаньні задалі бацькі асуджаных па арт. 328 КК РБ.

**07.03.2019** Прадстаўнік Беларускага Хэльсінскага камітэту на Віцебшчыне **праваабаронца Павал Левінаў** папрасіў Лукашэнку распаўсюдзіць меркаваную амністыю на асуджаных паводле арт. 328 КК (Незаконны абарот наркатычных рэчываў). У прыватнасьці – вызваліць тых, хто зьдзейсьніў злачынства ў няпоўнагадовым узросьце, і ўдвая скараціць тэрмін тым, хто ўчыніў яго ва ўзросьце да 25 гадоў.

Прапанову ў выглядзе электроннага звароту Павал Левінаў даслаў у адміністрацыю прэзыдэнта.

"У Беларусі вядзецца зацятая вайна з наркотыкамі, у выніку якой замест буйных дастаўцаў за краты адпраўляюць маладых людзей ва ўзросьце ад 16 да 30 гадоў за распаўсюд рэчываў. Амаль палова зь іх адбываюць пакараньне ад 8 да 15 гадоў", – гаворыцца ў звароце.

Праваабаронца піша пра тое, што суды, якія выносяць такія прысуды, не тлумачаць, якімі прынцыпамі кіруюцца, якія мэты перасьледуюць і што мусіць здарыцца з маладымі людзьмі за такі працяглы тэрмін. Між тым, пакараньне, на думку Паўла Левінава, ня мусіць мець намер зьняважыць чалавека, задушыць яго як асобу і разбурыць ягонае будучае і будучае яго сям'і.

Павал Левінаў сьцьвярджае, што падчас сьледзтва па справах сьледчыя заплюшчваюць вочы на шматлікія парушэньні закону і самі робяць памылкі.

Як стала вядома, зварот Паўла Левінава ў Адміністрацыю прэзыдэнта быў адтуль перанакіраваны ў Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі. Пра гэта Левінаву паведамілі з Адміністрацыі.

**18.03.2019** Рашэньне аб немэтазгоднасьці стварэньня пастаяннай камісіі па правох чалавека было прынятае на сумесным паседжаньні дзьвюх пастаянных камісіяў (па пытаньнях мясцовага самакіраваньня і сацабароны) Віцебскага абласнога Савету дэпутатаў. Удзел у паседжаньні ўзяў віцебскі **праваабаронца Леанід Сьвецік**.

Паводле праваабаронцы, дэпутаты адзінагалосна прагаласавалі за тое, што ў стварэньні такой камісіі няма патрэбы.

Зь ініцыятывай заснаваць у Віцебскім абласным Савеце дэпутатаў пастаянную




камісію па пытаньнях абароны правоў, свабодаў і законных інтарэсаў грамадзян выступіў на пачатку 2019 году прадстаўнік Беларускага Хэльсынскага камітэту ў Віцебскай вобласьці Павал Левінаў. Старшыня аблсавету Ўладзімер Цярэнцьеў паабяцаў, што пытаньне будзе разгледжанае. Але праваабаронца таксама дамогся, каб на паседжаньне былі запрошаныя прадстаўнікі грамадзкасьці.

"18 сакавіка 2019 году было праведзенае сумеснае паседжаньне пастаянных камісіяў Віцебскага абласнога Савету дэпутатаў: па пытаньнях мясцовага самакіраваньня і рэглямэнту, па пытаньнях сацыяльнай сфэры, сацыяльнай абароны грамадзян і справах моладзі з удзелам праваабаронцы Л. В. Сьвецiка. Па выніках абмеркаваньня пытаньня аб пастаяннай камісіі Віцебскага абласнога Савету дэпутатаў 28-га скліканьня было прынятае рашэньне аб немэтазгоднасьці стварэньня камісіі па пытаньнях правоў чалавека і нацыянальных адносінаў", – гаворыцца ў афіцыйным адказе з аблсавету, які атрымаў Павал Левінаў.

"Мой удзел у паседжаньні дзьвюх пастаянных камісіяў Віцебскага аблсавету можна лічыць пачаткам нейкага дыялёгу паміж праваабарончай супольнасьцю і прадстаўнічым органам мясцовай улады. На жаль, пакуль што ў бакоў ёсьць рознагалосьсе наконт зьместу і формы гэтага дыялёгу", – пракамэнтаваў свой удзел у паседжаньні аблсавету віцебскі праваабаронца Леанід Сьвецік.

**28.03.2019** У Віцебску прайшоў трэнінг "Не абмяжоўвайце сваё мэдыя. Як стварыць цікавы матэрыял пра людзей зь інваліднасьцю", удзел у якім бралі журналісты незалежных і дзяржаўных СМІ рэгіёну.

Імпрэза ладзілася грамадзкай арганізацыяй "Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам" сумесна з "Прэс-клюбам Беларусь" пры фінансавай падтрымцы Агенцтва ЗША па міжнародным разьвіцьці (USAID).

Арганізатары мелі на мэце даць мясцовым журналістам, якія пішуць і здымаюць пра людзей з інваліднасьцю, кантакты дасьведчаных адмыслоўцаў, азнаёміць з распаўсюджанымі памылкамі, разбурыць некаторыя стэрэатыпы, якія склаліся ў грамадзтве.

Як распавяла на пачатку сустрэчы **PR-мэнэджар "Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам" Натальля Губар**, падобныя імпрэзы прайшлі ўжо ў Горадні, Берасьці, Воршы, Горках і Маладэчне.

"Мы працуем зь невялікай аўдыторыяй – ад 3 да 10 удзельнікаў. Але, акрамя журналістаў, на сустрэчы прыходзяць і рэклямшчыкі, і сацыяльныя работнікі. Гэты трэнінг разьлічаны найперш на тых людзях, каму важна зьмена оптыкі на праб-

лему людзей зь інваліднасьцю. Таму што насамрэч існуе шмат стэрэатыпаў, і мы да іх прывыклі, мы ў іх жывем" – сказала арганізатарка.

**03.04.2019** Віцебскі **праваабаронца Павал Левінаў** папрасіў старшыню Вярхоўнага суду Валянціна Сукалу разьвязаць даволі далікатную сытуацыю зь віцебскімі судзьдзямі-сужэнцамі Аленай Протас і Яўгенам Буруновым. Вярхоўны суд паабяцаў разабрацца…

Павал Левінаў зьвярнуў увагу на тое, што судзьдзя Яўген Буруноў уваходзіць у склад судовай калегіі па крымінальных справах Віцебскага абласнога суду. Калегія пераглядае ў апэляцыйным парадку прысуды па крымінальных справах і пастановы па адміністрацыйных справах, вынесеныя ў тым ліку судзьдзёй суду Першамайскага раёну Віцебску Аленай Протас. Між тым, Яўген Буруноў і Алена Протас ёсьць мужам і жонкай.

"Мяркую, што такая сытуацыя патрабуе разьвязаньня шляхам зьмены спэцыялізацыі аднаго з сужэнцаў Протас-Бурунових альбо іншым чынам", – напісаў у сваім звароце ў Вярхоўны суд Павал Левінаў.

На зварот праваабаронцы адказаў намесьнік старшыні Вярхоўнага суду Руслан Аніскевіч. Ён пацьвердзіў інфармацыю аб тым, што Буруноў і Протас, якая спэцыялізуецца на разглядзе крымінальных і адміністрацыйных справаў у Першамайскім судзе Віцебску, знаходзяцца ў зарэгістраваным шлюбе.

"Паводле інфармацыі Віцебскага абласнога суду праз тое, што названыя судзьдзі зьяўляюцца сужэнцамі, судзьдзі Бурунову не даручаецца ўдзел у разглядзе крымінальных справаў і матэрыялаў, а таксама справаў аб адміністрацыйных правапарушэньнях, рашэньні па якім пастаноўленыя судом Першамайскага раёну Віцебску, у тым ліку непасрэдна судзьдзёй Протас", – тлумачыць у адказе Руслан Аніскевіч.

Але ніжэй дадае: "Разам з тым, старшыням Віцебскага абласнога суду і суду Першамайскага раёну г. Віцебску даручана разгледзець пытаньне аб зьмене судзьдзі Протас А.С. спэцыялізацыі на разгляд грамадзянскіх справаў".

**12.04.2019 Праваабаронца Павал Левінаў** прасіў Вярхоўны суд разгледзець пытаньне аб прафэсійнай прыдатнасьці віцебскага судзьдзі Ільлі Белавуса (суд Кастрычніцкага раёну), які нарабіў шмат памылак і хібаў у адной з пастановаў па адміністрацыйнай справе. Віцебскі аблсуд паабяцаў, што парушэньні судзьдзі адаб'юцца ня ягонай прэміі.

Павал Левінаў паведаміў у Вярхоўны суд, што судзьдзя Ільля Белавус у пастанове ад 14 сакавіка 2019 году сказіў прозьвішчы пацярпелых ("Круглікаў" замест "Круглік" і г.д.), а адной зь іх нават "зьмяніў" пол. Праваабаронца прасіў разгледзець пытаньне ад прафэсійнай прыдатнасьці судзьдзі Кастрычніцкага суду Віцебску Ільлі Белавуса.

На зварот у Вярхоўны суд адказалі зь Віцебскага абласнога суду. Першы намесьнік старшыні аблсуду Анатоль Фаменка прызнаў, што "пры вырабе пастановы судзьдзём Белавусам. І.У. былі зробленыя тэхнічныя апіскі ў прозьвішчах пацярпелай і сьведкаў".

"Парушэньне, зробленае судзьдзём Белавусам І.У., будзе ўлічанае пры яго што-

месячным прэміяваньні", – гаворыцца ў адказе з абласнога суду.

Судзьдзя Ільля Белавус 11 красавіка пакараў штрафам віцябляніна **Ўладзімера Кійко** за фатаграфаваньне зь бел-чырвона-белым сьцягам. У лютым 2018 году менавіта гэты судзьдзя разглядаў справу, распачатую ў дачыненьні віцебскіх **журналістаў-фрылянсэраў Віталя Скрыля** і **Ўладзімера Лунёва**. Белавус аштрафаваў іх агулам на 1200 рублёў – за нібыта незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ. На погляд праваабаронцаў, гэтыя справы мелі палітычны характар.

**17.04.2019** Віцебскі **праваабаронца Леанід Сьвецік** зьвярнуўся да дэпутатаў ПП НС з прапановай унесьці ў закон аб амністыі асобаў, асуджаных па артыкулах 375, 376 і 431 КК РБ, паводле якіх адбывае зараз пакараньне палітвязень Міхаіл Жамчужны. У адказе з Палаты – ні слова пра згаданыя артыкулы і Жамчужнага. Дэпутаты напісалі аб магчымасьці ўжываньня "акту гуманізму" да асуджаных па арт. 328 КК.

У сваім звароце ў Палату прадстаўнікоў Леанід Сьвецік прапанаваў дэпутатам скарыстацца сваім правам на канчатковую рэдакцыю тэкстаў заканадаўчых актаў і ўключыць у закон аб амністыі асобаў, асуджаных на падставе артыкулаў 376 (ч. 1, ч. 2), 375 (ч. 1) і 431 (ч. 1, ч. 2) Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь. На сёньня пакараньне ў месцах пазбаўленьня волі па гэтых артыкулах адбывае толькі адзін чалавек – палітвязень Міхаіл Жамчужны.

"Амністыя гэтага чалавека будзе актам гуманізму з боку дзяржавы, прадэманструе імкненьне беларускіх уладаў да выкананьня міжнародных стандартаў у сфэры правоў чалавека", – зазначыў у звароце праваабаронца.

Адказ з парлямэнту быў нечаканы. Старшыня Пастаяннай камісіі ПП НС па нацыянальнай бясьпецы Валянцін Міхневіч запэўнівае Сьвеціка, што ягоны зварот "па пытаньні прымяненьня амністыі ў дачыненьні да асобаў, асуджаных па артыкуле 328 КК РБ", разгледжаны. Распавядае пра прынцып калегіяльнасьці пры распрацоўцы амністыі і пералічвае назвы органаў, што вызначалі пералік артыкулаў, на якія распаўсюджвалася папярэдняя амністыя.

"13 сакавіка 2019 году Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бясьпецы разгледзела пытаньне аб магчымасьці ўжываньня гэтага акту гуманізму з боку дзяржавы да асобаў, асуджаных па артыкуле 328 КК, і накіравала ліст у МУС РБ з просьбай улічыць нашыя прапановы пры падрыхтоўцы названага законапраекту", – напісаў Міхневіч.

Праваабаронца Леанід Сьвецік сьцьвярджае, што ні ў цяперашнім звароце ў ПП НС, ні раней не ўздымаў тэму амністыі асуджаных па 328-му артыкулу.

"Тэма гэтая вельмі важная. Напэўна, сябры камісіі атрымалі вельмі шмат зваротаў аб неабходнасьці амністыі асуджаных па "наркатычнаму" артыкулу, таму не выключаю, што адбылася блытаніна. Але ж я так і не атрымаў адказу на сваю прапанову – амніставаць **палітвязьня Міхаіла Жамчужнага**. Гэта прыкра..." – кажа Леанід Сьвецік.

Між тым, 17 красавіка меркаваны сьпіс артыкулаў, асуджаныя па якіх могуць падпасьці пад амністыю ў 2019 годзе, апублікаваў партал TUT.BY. Паводле закона-




праекту, які трапіў да журналістаў, амністыя закране і пакараных паводле "наркатычнага" артыкулу. Але толькі часткова. У прыватнасьці, на два гады могуць скараціць тэрміны зьняволеньня непаўналетнім і на 1 год – асуджаным паводле частак 1,2,3 арт. 328.

**21.04.2019** У адной з віцебскіх арт-прастораў адбыўся бясплатны кінапаказ фільму Pride ("Гонар") і дыскусія на тэму ЛГБТ. Гэта была першая сустрэча з шэрагу імпрэзаў, якія мае ладзіць у Віцебску новая моладзевая ініцыятыва CLOSET FREE.

Сацыяльная ініцыятыва з квір-тэматыкай Closet Free паўстала ў Віцебску зусім нядаўна – літаральна месяц таму. Яе стварылі некалькі маладых дзяўчат-актывістак, якія захапіліся тэмай правоў чалавека і гендэрнай ідэнтычнасьці. "Closet Free – ініцыятыва, накіраваная на культурнае і адукацыйнае разьвіцьцё гораду Віцебску. Наша галоўная мэта – стварыць камфортную прастору для камунікацыі, у якой кожны зможа быць самім сабой і знайсьці аднадумцаў", – заяўляюць актывісткі.

Паглядзець мастацкую стужку Pride (2014, рэжысэр Мэцью Ўорчас) і падыскутаваць аб правах геяў і лесьбіянак прыйшло некалькі дзясяткаў маладых віцяблян. У пераважнай большасьці – дзяўчат, студэнтак віцебскіх унівэрсытэтаў.

На дыскусію пасьля прагляду засталася палова гледачоў. Маладыя людзі дзяліліся сваімі меркаваньнямі аб убачаным, наогул выказваліся на тэму ЛГБТ. Сышліся на думцы, што сучаснае беларускае грамадзтва, нягледзячы на жорсткі сацыяльна-палітычны лад, зьяўляецца зараз нашмат больш талерантным і памяркоўным, чым за Савецкім Саюзам. Хоць і ў нашыя дні агрэсія да прадузятасьць нікуды ня зьніклі, і да эўрапейскіх стандартаў нам яшчэ далёка.

Арганізатары імпрэзаў робяць акцэнт на тым, каб усе ўдзельнікі паважліва ставіліся адзін да аднаго, не праяўлялі агрэсіі і нянавісьці, зь цярпеньнем ставіліся да чужога меркаваньня. Менавіта з гэтага і складаецца падмурак разьвітай і справядлівай супольнасьці.

**11.05.2019** Судзьдзя Кастрычніцкага суду Віцебску Ільля Белавус у пастанове, якую склаў на **актывіста Ўладзімера Кійко**, памылкова пазначыў, што той меў раней адміністрацыйныя спагнаньні. Як палічыў **праваабаронца Павал Левінаў** гэтым самым Белавус замахнуўся на гонар і годнасьць грамадзяніна і папрасіў Вярхоўны суд разгледзець пытаньне аб прафпрыдатнасьці судзьдзі.

У звароце на імя старшыні Вярхоўнага суду Валянціна Сукалы праваабаронца падкрэсьліў, што ў адпаведнасьці з палажэньнем арт. 2.8 КаАП РБ той, хто цягам

году не зьдзяйсьняе новых адміністрацыйных правапарушэньняў, лічыцца асобай, якая не была пад адміністрацыйным спагнаньнем. Левінаў цытуе таксама арт. 2.5 ПВКаАП РБ, паводле якога пры вядзеньні адміністрацыйнага працэсу забараняюцца дзеяньні і рашэньні, якія б прыніжалі гонар і прымяншалі годнасьць асобы ўдзельнікаў працэсу.

"Такім чынам, судзьдзя суду Кастрычніцкага раёну Віцебску Белавус І.У. ня толькі парушыў права грамадзяніна Кійко на прэзумпцыю невінаватасьці, гарантаванае Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах і Канстытуцыяй РБ, але і замахнуўся на яго гонар і годнасьць", – сьцьвярджаў у звароце Павал Левінаў.

Праваабаронца прасіў даць дзеяньням судзьдзі прававую ацэнку, а таксама разгледзець пытаньне аб прафэсійнай прыдатнасьці судзьдзі Белавуса.

Левінаву адказаў першы намесьнік старшыні Вярхоўнага суду Анатоль Фаменка. Напісаў пра тое, што судзьдзя Белавус сапраўды зрабіў памылку ва ўступнай частцы пастановы, і нагадаў, што пастановай Віцебскага абласнога суду ад 2 траўня пастанова райсуду была зьмененая. Цяпер яна ўтрымлівае ўказаньне, што "Кійко. У.У. раней ня быў пад адміністрацыйным спагнаньнем".

"Пры вырашэньні пытаньня аб штомесячным прэміяваньні зьмены, якія адбыліся ў судовай пастанове, будуць улічаныя. Падставаў для дадатковых мераў рэагаваньня, з улікам сутнасьці ўчыненага парушэньня, ня маецца", – гаворыцца ў адказе Вярхоўнага суду.

Прадстаўнік БХК у Віцебску і Віцебскай вобласьці Павал Левінаў ня першы раз зьвяртае ўвагу Вярхоўнага суду на непрафэсійнасьць судзьдзі суду Кастрычніцкага раёну Віцебску Ільлі Белавуса. Таксама не ўпершыню Вярхоўны суд абяцае ўлічыць памылкі судзьдзі пры яго прэміяваньні. Але далей ня ідзе.

**12.05.2019** У Віцебску прайшоў трэнінг "Пол і гендэр". Некалькі дзясяткаў маладых віцяблян разважалі на тэму гендэрнага гвалту і гендэрных стэрэатыпаў. Вучыліся гэтыя стэрэатыпы разбураць…

Трэнінг праводзіла менская экспэртка Хрысьціна зь ініцыятывы "ProGender" пры арганізацыйнай падтрымцы віцебскага праекту "CLOSET FREE".

"Збольшага мы працуем з тэмай гендэрнага гвалту. Я стараюся на кожным сэмінары казаць пра гэта, бо гэтая праблема ў Беларусі вельмі вострая", – расказвае Хрысьціна.

Мэта простая – навучыць праз гульню. Рабіць так, каб гуляючы, малюючы, абмяркоўваючы нешта, удзельнікі сваім розумам даходзілі да простых паняцьцяў гендэрнай тэматыкі.

"Даць нейкія простыя паняткі і прымусіць людзей думаць і дыскутаваць на тэму гендэра, гендэрнай роўнасьці і гендэрнага гвалту", – акрэсьліла мэты імпрэзы экспэртка.

Як удакладніла Хрысьціна, праект "ProGender" узьнік у сьнежні 2018 году ў Менску пры падтрымцы моладзевага адукацыйнага цэнтру "Фіяльта". Сама дзяўчына ўжо даўно цікавілася тэмамі правоў чалавека, дыскрымінацыі, пытаньнямі

гендэра. Але галоўным штуршком, каб дзейнічаць, паслужыла прамова прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі.

**29.05.2019 Праваабаронца Павал Левінаў** зьвярнуўся да ўсіх судзьдзяў судовай калегіі па крымінальных справах Віцебскага абласнога суду з просьбай не караць сьмерцю падазраванага ў забойстве дзьвюх жанчын у вёсцы Прысушына Віцебскага раёну. Зварот да судзьдзяў Левінаў напісаў пасьля таго, як даведаўся што справа меркаванага забойцы ўжо паступіла на разгляд у аблсуд.

50-гадовага Віктара Паўлава абвінавачваюць у забойстве з асаблівай лютасьцю (ч.2 арт.139 КК) і разбоі з прычыненьнем цяжкіх цялесных пашкоджаньняў (ч.3 арт.207 КК).

У звароце да судзьдзяў судовай калегіі па крымінальных справах Віцебскага абласнога суду Павал Левінаў сьцьвярджае, што колькасьць прыхільнікаў адмены сьмяротнага пакараньня ў Беларусі пастаянна павялічваецца, хоць "большасьць пакуль хоча захаваць гэты від пакараньня". Але запэўнівае, што выкананьне правоў чалавека не павінна залежыць ад настрояў у грамадстве.

"Выступаю за справядлівае і абгрунтаванае пакараньне для злачынцы, якое служыць мэтам правасудзьдзя і вартае грамадзтва, дзе права на жыцьцё ёсьць абсалютнай каштоўнасьцю. Сьмяротнае пакараньне расцэньваю як парушэньне права на жыцьцё, гарантаванае Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і міжнароднымі дамовамі ў галіне правоў чалавека. Цьвёрда перакананы, што нішто ня можа апраўдаць наўмыснае і бязьлітаснае пазбаўленьне чалавека жыцьця ад імя дзяржавы", – выказвае сваю пазыцыю Левінаў.

Піша, што да нядаўняга часу меркаваў, што судзьдзі судовай калегіі па крымінальных справах цьвёрда датрымліваюцца права на жыцьцё. Але, напрыклад, 6 кастрычніка 2017 году ўжо набыў сілу сьмяротны прысуд Віцебскага абласнога суду.

"У цяперашні час у Віцебскі абласны суд паступіла на разгляд крымінальная справы ў дачыненьні да грамадзяніна Рэспублікі Беларусь Віктара Паўлава, па выніках разгляду якой можа быць вынесены сьмяротны прысуд", – піша праваабаронца і просіць калегію адмовіцца ад яго вынясеньня.

У дадатак да звароту праваабаронца перадаў судзьдзям 48-старонкавую брашуру "Несьмяротная кара. Таму што мы людзі".

**10.06.2019** Віцебскія праваабаронцы і журналісты далучыліся да акцыі салідарнасьці са **спэцкарэспандэнтам** "Медузы" **Іванам Галуновым** – аўтарам гучных расьсьледаваньняў аб карупцыі, які знаходзіцца зараз пад хатнім арыштам.

Журналіст быў затрыманы ў Маскве 6 чэрвеня і абвінавачаны ў незаконным абароце наркотыкаў. Ён сьцьвярджае, што наркотыкі яму падкінулі. Пры затрыманьні і ў паліцэйскім пастарунку Галунова жорстка зьбівалі. Нікулінскі раённы суд Масквы адмовіўся зьмяшчаць журналіста ў СІЗА, як таго прасіла сьледзтва, і накіраваў яго пад хатні арышт.

"Фундамэнтальным правам любога грамадзтва ёсьць права на свабоду слова. Калі ўлады адбіраюць гэтае права і пачынаюць рэпрэсаваць журналістаў – носьбітаў




яго і гарантаў, – грамадзтва мусіць рэагаваць на гэта хутка і салідарна. І няважна, дзе чыніцца беззаконьне, у тваёй краіне ці ў суседняй. Таму сёньня мы кажам "Стоп перасьледу журналіста Івана Галунова" і "Я – Іван Галуноў!" – тлумачыць пазыцыю ўдзельнікаў акцыі праваабаронца Леанід Сьвецік.

**25.06.2019** Бацькі асуджаных на падставе "антынаркатычнага" артыкулу 328 КК дамагаліся зладзіць круглы стол з гарадзкімі ўладамі пачынаючы ад сакавіка 2018 году. Нарэшце – адбылося. Арганізацыю круглага стала па ўдасканаленьні прафіляктыкі сярод моладзі ўзяло на сябе галоўнае ўпраўленьне па адукацыі Віцебскага аблвыканкаму.

Круглы стол "Удасканаленьне прафіляктычнай працы, накіраванай на супрацьдзеяньне незаконнаму абароту і спажываньню наркатычных рэчываў сярод дзяцей і моладзі" адбыўся ў Віцебскім абласным інстытуце разьвіцьця адукацыі.

На сустрэчу дапусьцілі толькі тых, хто быў у сьпісе арганізатараў. Уваход на мерапрыемства незалежным журналістам забаранілі. Дзяржаўных СМІ не было.

Актывісты руху "Маці 328" прыйшлі на сустрэчу з канкрэтнымі прапановамі, якія тычыліся найперш прафіляктычнай працы з бацькамі дзяцей і падлеткаў. Прапануюць больш шырока распаўсюджваць інфармацыю аб небясьпецы супрацоўніцтва непаўналетніх зь інтэрнэт-крамамі па продажы забароненых рэчываў. Задзейнічаць для гэтага сацыяльныя сеткі, жыроўкі, дамовіцца аб рассылцы СМС-паведамленьняў з мабільнымі апэратарамі і г.д.

"Так, дзяржава праводзіць нейкую працу, кажа, што наркотыкі – гэта зло. Але гэтага недастаткова. Трэба казаць бацькам пра тое, што іх дзіця можа на 10-15 гадоў трапіць за краты, нават не дакрануўшыся да наркотыка, а проста ўладкаваўшыся на працу ў адну з інтэрнэт-крамаў. Трэба казаць пра канкрэтныя рэчы, у тым ліку на бацькоўскіх сходах ва ўстановах адукацыі", – лічыць **Натальля Шарыпа**.

Ужо пасьля круглага стала Натальля паведаміла па тэлефоне, што "для першага разу – усё прайшло нармальна". Паводле яе, прысутныя на сустрэчы прадстаўнікі ўпраўленьняў адукацыі і аховы здароўя аблвыканкаму, міліцыі, пракуратуры і БРСМ уважліва выслухалі актывістаў і згадзіліся, што "ў гэтым напрамку трэба працаваць".

Згадзіліся на прапанову інфармаваць бацькоў праз "жыроўкі" і СМС-рассылкі (даручана УУС). Папярэдне дамовіліся таксама стварыць прафіляктычны відэаролік.

"Запісалі яны гэтыя ўказаньні, зробяць ці ня зробяць – ня ведаю, але гаворка пра ўсё гэта вялася. Ніхто супраць ня быў, усе згодныя, што трэба больш шчыльна працаваць з бацькамі, і ўсе пакуль ідуць насустрач. Але паглядзім, што будзе далей", – падзялілася ўражаньнямі ад сустрэчы Натальля Шарыпа.

Кіраўнік галоўнага ўпраўленьня па адукацыі Віцебскага аблвыканкаму Дзмітры Хома, які меўся выступіць на сустрэчы з прывітальным словам, на круглы стол так і не зьявіўся.

**15.07.2019** Віцебскі **праваабаронца Павал Левінаў** зьвярнуўся ў Вярхоўны суд з просьбай даць прававую ацэнку бязьдзейнасьці судзьдзі Сяргея Будрэвіча, які праігнараваў факт наўмыснай зьнявагі міліцыянтам гонару і годнасьці простага грамадзяніна падчас судовага паседжаньня. Адказ прыйшоў з аблсуду: Будрэвічу будзе прапанавана "падтрымліваць у судзе атмасфэру добразычлівасьці".

Эпізод тычыўся адміністрацыйнай справы, распачатай супраць віцебскага таксіста Алега Стральца, якога вінавацілі ў абразе ўчастковага міліцыянта Мечыслаўскага (арт 23.5 КаАП). Віцяблянін нібыта назваў па тэлефоне ўчастковага "петушарай", а потым сам прыехаў у апорны пункт паглядзець, зь кім жа размаўляў (і быў неадкладна прыкаваны кайданкамі да батарэі). Судзьдзя Будрэвіч аштрафаваў тады Стральца на 24 базавыя велічыні, хоць ніякіх доказаў абразы (запісу тэлефоннай размовы) ня меў.

Даючы тлумачэньні ў судзе, маёр міліцыі Мечыслаўскі казаў, што да гэтага ў ягонай практыцы былі два аналягічныя выпадкі, "але людзі праяўлялі больш разважлівасьці і не зьяўляліся самі ў міліцыю".

"Трэба быць прыдуркаватым. Грамадзянін Стралец, у адрозьненьне ад разумных людзей, зьявіўся ў міліцыі", – цытуе Левінаў выказваньне міліцыянта ў судзе.

"Судзьдзя суду Кастрычніцкага раёну г. Віцебску Сяргей Будрэвіч праігнараваў факт таго, як маёр міліцыі Мечыслаўскі публічна і наўмысна ў непрыстойнай форме зьняважыў гонар і годнасьць грамадзяніна Стральца", – тлумачыць праваабаронца і просіць даць прававую ацэнку бязьдзейнасьці судзьдзі ў гэтай сытуацыі.

Адказ на свой зварот Левінаў атрымаў ад старшыні Віцебскага абласнога суду Мікалая Хамічонка. Той паведамляе, што была праведзеная службовая праверка, але "дадзеных аб выкарыстаньні пацярпелым інспэктарам Мечыслаўскім фразаў і выразаў, якія б зьневажалі гонар і годнасьць Стральца, не ўстаноўлена".

"Падставаў для прыняцьця мераў рэагаваньня да судзьдзі Будрэвіча ня маецца. Між тым, судзьдзі прапанавана сваімі дзеяньнямі ў судовым паседжаньні падтрымліваць атмасфэру добразычлівасьці, настройваць удзельнікаў працэсу на паважлівы тон пры выкладаньні тлумачэньняў альбо паказаньняў", – гаворыцца ў адказе з абласнога суду.

**25.07.2019** "Пакуль касьмічныя караблі барозьняць прасторы сусьветнага акіяну, у горадзе Віцебску спраўляць свае натуральныя патрэбы даводзіцца ў прыбіральнях кшталту "сарцір", якіх у горадзе процьма", – паскардзіўся ў электронным звароце ў Віцебскі гарвыканкам **праваабаронца Павал Левінаў**. І папрасіў чыноў-




нікаў "павярнуцца тварам да туалетаў". Да просьбы прыслухаліся…

У звароце Павал Левінаў нагадаў чыноўнікам гарвыканкаму, што ўжо ўздымаў пытаньне аб стане грамадзкіх прыбіральняў у "культурнай сталіцы" ў 2013-м і 2014-м гадох.

Гэтым разам у якасьці ілюстрацыі даслаў гарадзкім уладам фотаздымак прыбіральні, якая знаходзіцца каля Грышана-Залатагорскіх могілак у Віцебску. А каб вырашыць праблему – прапанаваў зладзіць суботнік.

Улады адрэагавалі на зварот хутка. Левінаву адказаў намесьнік старшыні Віцебскага гарвыканкаму Віктар Глушын.

Ён паведаміў, што дзяржпрадпрыемства Віцебскі спэцыялізаваны камбінат грамадзкага абслугоўваньня (ВСКГА) ужо зрабіў санітарную ачыстку выграбной ямы і выканаў працы па замене грамадзкай прыбіральні на Грышана-Залатагорскіх могілках.

"Кіраўніцтву ВСКГА паказана на неабходнасьць узмацненьня кантролю за падтрыманьнем належнага стану тэрыторыяў могілак", – напісаў у адказе чыноўнік.

**27.08.2019** Віцебскі **праваабаронца Леанід Сьвецік** атрымаў адмову ад адміністрацыі папраўчай калёніі №9 у Горках на сваю просьбу аб кароткачасовым спатканьні з **палітвязьнем Міхаілам Жамчужным**. Спатканьне не даюць, бо Жамчужны "ня мае ніякіх выключных абставінаў для яго атрыманьня".

Сваё жаданьне сустрэцца з палітвязьнем Леанід Сьвецік аргумэнтаваў тым, што знаходзіцца з Жамчужным у сяброўскіх і прафэсійных стасунках, ужо больш за тры гады вядзе зь ім пастаянную перапіску. Апроч таго, зазначыў, што магчымасьць кароткачасовага спатканьня з тымі, хто адбывае пакараньне ў папраўчай калёніі, прадугледжаная заканадаўствам (ч.3, арт.83 Крымінальна-выканаўчага кодэксу Рэспублікі Беларусь).

Аднак на просьбу аб спатканьні адміністрацыя горацкай калёніі адказала адмоўна. Начальнік ПК-9 Петраковіч тлумачыць у лісьце, што Жамчужны "...адбывае меру дысцыплінарнага спагнаньня ў выглядзе пераводу ў памяшканьне камэрнага тыпу і ня мае ніякіх выключных абставінаў для спатканьня".

З такім рашэньнем праваабаронца Леанід Сьвецік ня згодны. Ён лічыць, што пры вырашэньні пытаньня аб дазволе на кароткачасовае спатканьне, неабходна найперш кіравацца прынцыпамі гуманнасьці і недыскрымінацыі.

Міхаіл Жамчужны – пэнсіянэр, ён ня мае блізкіх людзей, зь якімі мог бы пэрыядычна сустракацца. Тым больш, што ў апошні час ён больш за 400 сутак правёў у

ШЫЗА і ПКТ – то бок ва ўмовах жорсткай ізаляцыі, і практычна разарваў сацыяльныя сувязі зь сябрамі, сваякамі і з праваабарончай супольнасьцю краіны. Гэта ёсьць сур'ёзным аргумэнтам для дазволу на першае кароткае спатканьне за больш чым 4 гады знаходжаньня Міхаіла Жамчужнага ў месцах адбыцьця пакараньня.

"Для абароны правоў і законных інтарэсаў палітвязьня Жамчужнага я зьвярнуўся са скаргай ва ўпраўленьне Дэпартамэнту выкананьня пакараньняў па Магілёўскай вобласьці. У скарзе прашу адмяніць рашэньне начальніка ПК-9 Петраковіча і дазволіць мне кароткачасовае спатканьне са зьняволеным Жамчужным у любы прадугледжаны законам пэрыяд часу", – паведаміў Леанід Сьвецік.

Ён расказаў, што палітвязень Міхаіл Жамчужны працягвае знаходзіцца ў ізаляцыі. "Прычым ізаляцыя гэтая мае тэндэнцыі да ўзмацненьня жорсткасьці", – паведаміў праваабаронца.

У апошнім лісьце палітвязень паведаміў, што пачынаючы ад 26 ліпеня адправіў праваабаронцу чатыры лісты, два зь якіх былі зьнішчаныя адміністрацыяй калёніі "за шкоду ахоўваных законам правам дзяржорганаў, грамадзкіх аб’яднаньняў і асобных грамадзянаў".

## Звароты грамадзян у Камітэт па правох чалавека ААН




**15.09.2018** Камітэт па правах чалавека разгледзеў скаргу віцебскай **актывісткі Тацяны Севярынец** і прыйшоў да высновы, што беларуская дзяржава парушыла яе правы на свабоду слова і мірныя сходы.

Цяпер цягам шасьці месяцаў улады абавязаныя паведаміць Камітэту аб прынятых мерах па аднаўленьні правоў Тацяны Севярынец. Апроч таго – інфармаваць праз СМІ грамадзян краіны аб тым, якім чынам з боку дзяржавы былі парушаныя яе правы.

Скаргу ў Камітэт па правах чалавека Тацяна Севярынец накіравала яшчэ 7 гадоў таму, пасьля падзеяў, якія адбываліся ў 2011 годзе. Улетку таго году актывістка БХД ладзіла на Ўсьпенскай горцы ў Віцебску малітоўныя сустрэчы, падчас якіх гараджане маліліся за палітвязьняў.

Трэцяга ліпеня 2011 году Тацяна Севярынец сустрэла на плошчы Перамогі, дзе ў той час праходзілі афіцыйныя сьвяткаваньні Дня Рэспублікі, сябраў арганізацыйнага камітэту па стварэньні партыі "Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя" (БХД) і разам з супольнікамі накіравалася на Усьпенскую горку, каб памаліцца за беларускіх палітвязьняў ля крыжа Эўфрасіньні Полацкай. Па дарозе да іх далучыліся іншыя грамадзяне. І вось гэтае перамяшчэньне па гарадзкіх ходніках супрацоўнікі органаў унутраных спраў палічылі "несанкцыянаваным групавым публічным выяўленьнем грамадзка-палітычных поглядаў", а Тацяну Севярынец – арганізатарам шэсьця.

Пры гэтым ніхто з тых, хто ішоў памаліцца, не выходзіў на праезную частку, не трымаў у руках сьцягоў, плякатаў, транспарантаў альбо іншых агітацыйных матэрыялаў, якія б прыцягвалі ўвагу. Гэта, між іншым, пацьвярджалася апэратыўнымі відэаматэрыяламі, якія ў якасьці доказаў віны актывісткі фігуравалі ў судзе.

Тым ня менш, улады ўспрынялі гэта як незаконнае шэсьце, а супрацоўнікі міліцыі склалі на Севярынец пратакол аб парушэньні ёй правіл арганізацыі і правядзеньня масавага мерапрыемства.

Згодна з пратаколам, віцяблянку абвінавацілі ў парушэньні ўстаноўленага парадку арганізацыі вулічнага шэсьця з выяўленьнем грамадзка-палітычных поглядаў і парушэньні Закону "Аб масавых мерапрыемствах". Судзьдзя Яўген Буруноў згадзіўся з довадамі міліцыі і аштрафаваў Севярынец на 700 тыс. рублёў (недэнамінаваных).

Актывістка не згадзілася з рашэньнем суду і абскардзіла яго ў вышэйшых судовых інстанцыях. Аднак ні Віцебскі абласны, ні Вярхоўны суды рашэньне суду пер-

шай інстанцыі не адмянілі, а пакараньне ў выглядзе штрафу пакінулі ранейшым.

Пасьля таго, як Таццяна не змагла законным чынам абараніць свае правы ўнутры краіны, яна зьвярнулася ў міжнародны праваабарончы орган.

У звароце, адрасаваным у Камітэт па правах чалавека, Таццяна Севярынец заявіла, што для яе, як грамадзянкі, вельмі важна спыніць практыку парушэньняў грамадзянскіх і палітычных правоў у Беларусі, а таксама – прымусіць Рэспубліку Беларусь паважаць і забясьпечваць правы, прапісаныя ў Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Скаргу Таццяны Севярынец Камітэт змог разгледзець толькі праз 7 гадоў. Сябры Камітэту аднадушна прыйшлі да высновы, што ў справе Таццяны Севярынец Рэспубліка Беларусь парушыла яе правы, занатаваныя ў артыкулах 19 (2) (Свабода слова) і 21 (Права на мірныя сходы) Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.

**25.09.2018** "Камітэт ізноў заяўляе, што дзяржаве-удзельніку трэба перагледзець сваё заканадаўства,... у прыватнасьці рашэньне № 881 Віцебскага гарадзкога раённага камітэту,... з мэтай спрыяньня поўнаму ажыцьцяўленьню ў дзяржаве-удзельніку правоў, замацаваных у артыкулах 19 і 21 Пакту", – гаворыцца ў апублікаваных чарговых меркаваньнях Камітэту ААН па правох чалавека (КПЧ), прынятых ім датычна скаргаў **праваабаронцы Паўла Левінава**.

Апроч згаданага рашэньня гарвыканкаму № 881 ад 10 ліпеня 2009 году, якім рэгулюецца, як грамадзяне могуць рэалізаваць сваё права на мірныя сходы ў горадзе Віцебску, КПЧ патрабуе ад беларускіх уладаў зьмяніць і Закон "Аб масавых мерапрыемствах", на якім грунтуецца рашэньне № 881.

Нагодай зьвярнуцца ў КПЧ для Паўла Левінава стаў шэраг забаронаў адзіночных пікетаў, заяўкі на якія ён падаваў у 2012 годзе. Усяго такіх пікетаў мусіла адбыцца пяць, і на ніводзін зь іх мясцовыя ўлады не далі дазволу, спасылаючыся на рашэньне № 881. Маўляў, заяўнік хацеў правесьці пікеты ня ў тых месцах, што адмыслова прызначаныя гарадзкім выканкамам пад масавыя мерапрыемствы, – а гэта тры бязьлюдныя пляцоўкі ў парках гораду.

Згодна зь беларускім заканадаўствам пад паняцьце "масавыя мерапрыемствы" падпадаюць і пікеты, удзельнікам якіх выступае толькі адна асоба.

Пяць забароненых пікетаў праваабаронцы – тры падобныя адно да аднаго цяперашнія рашэньні КПЧ (у адной са скаргаў Левінаў згадаў адразу тры эпізоды, яны былі аб'яднаныя ў адну справу). Ва ўсіх рашэньнях Беларусь прызнаная парушальніцай пункту 2 артыкулу 19 Пакту ("Кожны чалавек мае права на свабоднае выказваньне свайго меркаваньня...").

Рашэньне № 881 Віцебскага гарвыканкаму накладае на арганізатараў мерапрыемстваў ня толькі абмежаваньне на месцы іх правядзеньня, але і ўводзіць яшчэ адну перашкоду: ахвочыя правесьці мірны сход мусяць папярэдне заключыць дамовы аб яго абслугоўваньні зь міліцыяй, ЖКГ і мэдыкамі. Пералічаныя ў рашэньні службы, як правіла, адмаўляюцца заключаць такія дамовы, праз што легальнае правядзеньне мерапрыемства робіцца немагчымым.

Адзіны выпадак, калі цягам амаль 10-ці гадоў дзеяньня рашэньня № 881 актывістам ўдалося дамагчыся ад мясцовых уладаў дазволу на мірны сход, стаў Дзень Волі – 2018. Сябрам партыі БНФ адміністрацыя Чыгуначнага раёну Віцебску дазволіла мітынг 25 сакавіка ў Парку культуры і адпачынку чыгуначнікаў, але заяўнікі самі адмовіліся яго праводзіць, спаслаўшыся на занадта вялікі рахунак, які выставілі ім міліцыянты за паслугі па абслугоўваньні імпрэзы.

**10.12.2018** Камітэт па правох чалавека ААН прыняў да разгляду паведамленьні аб парушэньні дзяржавай правоў на свабоднае выказваньне свайго меркаваньня ў дачыненьні **фрылянсэраў Зьмітра Лупача** і **Тацяны Смоткінай**. Пра гэта паведаміў аўтар зваротаў у КПЧ ААН віцебскі **праваабаронца Павал Левінаў**. Ліст з Камітэту ён атрымаў у Дзень правоў чалавека.

"Камітэт паведаміў, што абодва паведамленьні ў інтарэсах журналістаў-фрылянсэраў былі зарэгістраваныя і накіраваныя дзяржаве для дачы камэнтароў", – патлумачыў Павал Левінаў.

Індывідуальнае паведамленьне ў КПЧ пра парушэньне правоў Зьмітра Лупача было накіраванае Левінавым 7 лістапада 2018 году – пасьля таго як суд Браслаўскага раёну аштрафаваў Лупача на 882 рублі, прызнаўшы вінаватым у незаконным вырабе і распаўсюдзе прадукцыі СМІ (ч.2 арт. 22.9 КаАП РБ). Справа тычылася матэрыялу "Настаўніцу садзяць за кветку, а карупцыянэры Лукашэнкі – на свабодзе", апублікаванага на сайце beIsat.eu.

"У інфармацыйным матэрыяле, апублікаваным на сайце belsat.eu, не зьмяшчалася інфармацыі, забароненай да распаўсюду законамі Рэспублікі Белрусь, ён ніякім чынам не замахваўся на нацыянальную бясьпеку, грамадзкі парадак, маральнасьць насельніцтва, правы і свабоды іншых асобаў", – сьцьвярджалася ў паведамленьні.

Праваабаронца прыйшоў да высновы, што "прыцягненьне да адміністрацыйнай адказнасьці не за зьмест матэрыялаў, а за факт іх зьяўленьня ў замежных СМІ зьяўляецца неабгрунтаваным абмежаваньнем свабоды выказваньня меркаваньня і права на атрыманьне і распаўсюд інфармацыі, гарантаванае арт. 19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах".

"Вычарпаўшы ўсе эфэктыўныя сродкі абароны ўнутры Рэспублікі Беларусь, Зьміцер Лупач ня змог абараніць парушанае права на нацыянальным узроўні", – падкрэсьлівалася ў звароце ў КПЧ ААН.

Падобнае па зьмесьце паведамленьне, датычнае парушэньняў правоў фрылянсэркі Тацяны Смоткінай, Павал Левінаў накіраваў у Камітэт 29 жніўня. Глыбачанка Тацяна Смоткіна 31 траўня была пакараная штрафам у памеры 735 рублёў Докшыцкім райсудом паводле таго ж самага артыкула 22.9 КаАП (за матэрыял "Выклік сьмецьця – паслуга абавязковая", апублікаваным на сайце "Беларускага Радыё Рацыя").

**19.03.2019 Актывістка** з Дуброўна **Натальля Стрэльчанка** накіравала ў Камітэт ААН па правох чалавека індывідуальную скаргу, у якой абвінаваціла Беларусь ў парушэньні адразу сямі артыкулаў Міжнароднага Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.




Натальля Стрэльчанка абвінавачвае дзяржаву ў тым, што 25 і 26 сакавіка 2018 году супрацоўнікі Дубровенскага РАУС і раённага суду ўчынілі ў дачыненьні да яе дзеяньні, якімі парушылі яе правы, гарантаваныя Міжнародным Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правох.

Гэтак, яе беспадстаўнае затрыманьне 25 сакавіка 2018 году супрацоўнікамі РАУС па дарозе ў Менск, дзе яна мела намер удзельнічаць у сьвяткаваньні Дня Волі, Натальля лічыць парушэньнем артыкулу 9 Пакту. Паводле яго, ніхто ня можа быць адвольна арыштаваным альбо ўтрымлівацца пад вартай.

Тое, што яе неабгрунтавана затрымалі тады, калі яна накіроўвалася на масавае мерапрыемства, Натальля расцэньвае як парушэньне Рэспублікай Беларусь артыкулу 21 Пакту, якім гарантуецца права на мірныя сходы.

Апроч таго, забарона зьдзяйсьняць аўдыё– і фотаздымкі працэсу яе затрыманьня ў фае РАУС і прыцягненьне да адміністрацыйнай адказнасьці за непадпарадкаваньне патрабаваньням спыніць здымкі, парушаюць, на погляд Натальлі Стрэльчанкі, артыкул 19 Пакту, які гарантуе права на свабоду атрыманьня інфармацыі. Натальля падкрэсьлівае ў скарзе, што ў Беларусі няма закону, які б забараняў відэаздымкі ў такім агульнадаступным месцы, як фае аддзяленьня міліцыі.

Натальля паведамляе КПЧ, што судзьдзя райсуду Татаеў адхіліў яе хадайніцтва аб праглядзе відэа зь яе тэлефону, адабранага ў РАУС пры затрыманьні. Між тым, гэтае відэа было адзіным магчымым доказам яе невінаватасьці. Паводле скаржніцы, гэта парушыла яе права на справядлівы судовы разгляд, якое гарантуецца артыкулам 14 Пакту.

Тое, што 25 сакавіка 2018 году яе ўтрымлівалі ў памяшканьні Дубровенскага райаддзелу міліцыі ад самага ранку да 18 гадзін вечара бязь ежы, абшуквалі з поўным разьдзяваньнем перад камэрай відэаназіраньня перад тым, як зьмясьціць ў ІЧУ, трымалі пад вартай больш за 28 гадзінаў, ведаючы, што яна мае дваіх няпоўнагадовых дзяцей, ёсьць, паводле заяўніцы, парушэньнем артыкулу 10 Пакту. Паводле гэтага артыкулу, усе асобы, пазбаўленыя свабоды, маюць права на гуманнае абыходжаньне і павагу да чалавечай годнасьці.

Быў парушаны таксама артыкул 7, у якім гаворыцца, што ніхто ня можа падвяргацца катаваньням альбо жорсткаму, нялюдзкаму абыходжаньню, якое зьневажае чалавечую годнасьць.

І таму як усе гэтыя парушэньні мелі пад сабой палітычныя падставы (Натальля Стрэльчанка – сябар АГП), гэты факт яна лічыць дыскрымінацыяй, зьвязанай зь

яе палітычнымі перакананьнямі. Што парушае артыкул 2 Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Натальля Стрэльчанка просіць устанавіць факт парушэньня Рэспублікай Беларусь сямі пералічаных артыкулаў Пакту і рэкамэндаваць уладам Беларусі кампэнсаваць прычыненую дзяржавай шкоду.

Выдадзена праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
У выданьні выкарстоўваюцца матэрыялы, апублікаваныя сайтам vitebskspring.org і іншымі інтэрнэт-рэсурсамі.

*Для вольнага распаўсюду*